WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

8 ВЕРАСНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 168
(26526)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ ГАТОВА ЦЕСНА СУПРАЦОЎНІЧАЦЬ З БІЗНЭСМЕНАМІ СЛАВАКІІ ВА ЎСІХ СФЕРАХ

Беларусь гатова цесна супрацоўнічаць з бізнэсменамі Славакіі ва ўсіх сферах: ад банкаўскага сектара да прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт краіны Аляксандр Лукашэнка 7 верасня на сустрэчы з міністрам замежных спраў Славакіі Мірaславам Лайчакам.

«Нам важна мець з вамі цеснае супрацоўніцтва. Пры гэтым мы не ставім ніякіх умоў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Галоўнае, каб вы ў канкурэнтнай барацьбе знайшлі сваё месца, а ніш для супрацоўніцтва ў нас дастаткова».

Як лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы, у Беларусі ёсць добрая перавага: «Важна, што мы стварылі добрую канкурэнцыю ў сферы інвестыцый. Я не буду казаць пра прывабнасць, заклікаць вас да чаго-небудзь. Бізнэсмены добра ведаюць клімат». А з 1 студзеня 2010 года, калі «будзе створаны магутны эканамічны трыумвірат у выглядзе Мытнага саюза», працаваць з Беларуссю будзе яшчэ больш выгадна, адзначыў Прэзідэнт.

Адной з пераваг нашай краіны Аляксандр Лукашэнка назваў таксама прыстойныя адносіны да інвестараў і ў цэлым бізнэсменаў, выкананне ўсіх узятых на сябе абавязацельстваў. «Калі мы дамовіліся, то мы свята выконваем дамоўленасці. У нас у гэтым плане ідэальны парадак — тое, што ў некаторых дзяржавах называюць дыктатурай. Бізнэсмены вітаюць, што тут ёсць парадак: сказана — будзе зроблена. Яны не любяць рознага роду псеўдадэмакратыю», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Сёння ў Беларусі актыўна працуюць прадстаўнікі дзелавых колаў многіх краін. «Ёсць фактары, якія сведчаць, што тут працаваць можна», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Міністр замежных спраў Славакіі ў сваю чаргу адзначыў, што адна з мэтаў яго візіту — абмеркаванне адносінаў паміж ЕС і Беларуссю. Паводле яго слоў, Славакія стараецца актыўна ўплываць на фарміраванне пазіцыі ЕС адносна Беларусі. Міраслаў Лайчак таксама з задавальненнем адзначыў той факт, што Беларусь стала паўнапраўным членам «Усходняга партнёрства», якое адкрывае добрыя магчымасці для двухбаковай інтэграцыі. Сёння важна напаўняць гэту праграму канкрэтным зместам, дадаў ён.

Міраслаў Лайчак адзначыў, што з ім прыбыла вялікая дэлегацыя дзелавых колаў. «Спадзяюся, што ў выніку нашага візіту будуць дасягнуты канкрэтныя дамоўленасці», — сказаў ён.

У апошнія гады двухбаковы дыялог паміж Беларуссю і Славакіяй развіваецца паслядоўна і канструктыўна. Славакія ў рамках агульнай палітыкі ЕС адносна Беларусі, а таксама з улікам сваіх нацыянальных інтарэсаў імкнецца падтрымліваць прагматычны характар двухбаковых адносінаў. Славакія падтрымала ўключэнне Беларусі ў праграму ЕС «Усходняе партнёрства», выступае за больш актыўны ўдзел нашай краіны ў рэалізацыі праектаў па лініі Еўрасаюза. Гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва дзвюх краін у апошнія гады развіваецца таксама даволі дынамічна. На 1 студзеня 2009 года ў Беларусі налічвалася 14 прадпрыемстваў з удзелам славацкага капіталу, у тым ліку 6 сумесных і 8 замежных.

КДК БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ—ЖНІЎНІ НА ТРЭЦЬ СКАРАЦІЎ КОЛЬКАСЦЬ ПРАВЕРАК

Агульная колькасць праводзімых Камітэтам дзяржкантролю Беларусі праверак за 8 месяцаў гэтага года (4404) у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года зменшылася на 36 працэнтаў. Аб гэтым Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку 7 верасня праінфармаваў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Зянон Ломаць.

Прэзідэнту даложана, што яго даручэнне аб удасканаленні кантрольнай дзейнасці і змяншэнні колькасці праверак выконваецца ў поўным аб'ёме, аб чым сведчаць вынікі работы камітэта за студзень—жнівень.

Зянон Ломаць адзначыў, што пры гэтым забяспечана стопрацэнтная рэзультатыўнасць праверак, якія праводзяцца кропкава, не перашкаджаючы працаваць прадпрыемствам і арганізацыям. Паводле яго слоў, праверкі праводзяцца толькі пры наяўнасці дакладных даных аб правапарушэннях.

Па выніках кантрольна-аналітычных мерапрыемстваў ураду накіравана 122 дакументы з прапановамі па прадухіленні негатыўных з'яў у эканоміцы.

Фінансавая міліцыя Камітэта дзяржкантролю правяла 2754 праверкі, узбуджана 990 крымінальных спраў, накіравана ў суд 367 матэрыялаў. Па выніках паведамленняў, атрыманых ад фінансавай разведкі Камітэта дзяржкантролю, праваахоўнымі і канталюючымі органамі краіны прыменена адміністрацыйных штрафаў на суму Br28,4 млрд, узбуджана 430 крымінальных спраў.

Асаблівую ўвагу КДК удзяляе папераджальнаму кантролю. Цяпер больш за 2 тыс. даручэнняў кіраўніка дзяржавы знаходзіцца на кантролі і выкананні ў КДК. Зянон Ломаць праінфармаваў аб фактах неналежнага выканання некаторых з іх.

Акрамя таго, Камітэт праводзіць маніторынг найбольш актуальных пытанняў у сферы эканомікі, у прыватнасці, дзеянняў кіраўнікоў рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання і мясцовых органаў улады, накіраваных на паляпшэнне эканамічнай сітуацыі ў краіне. Так, асаблівая ўвага ўдзяляецца наяўнасці тавараў айчыннай вытворчасці ў гандлёвай сетцы, імпартазамяшчэнню, пасрэдніцкай дзейнасці, дынаміцы змянення ўзроўню запасаў гатовай прадукцыі на складах.

Кіраўніку дзяржавы таксама даложана аб выніках праверкі прадпрыемстваў Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Камітэт дзяржаўнага кантролю вывучыў сітуацыю з пасрэдніцкай дзейнасцю і меры, прынятыя ўрадам па выключэнні неабгрунтаванага і нядобрасумленнага пасрэдніцтва і забеспячэнні прасоўвання айчынных тавараў. Праверкі паказваюць, што па-ранейшаму маюць месца факты ўдзелу нядобрасумленных пасрэднікаў у пастаўках матэрыялаў, прадукцыі і абсталявання, што выкарыстоўваюцца пры будаўніцтве аб'ектаў, якія фінансуюцца за кошт бюджэтных сродкаў.

Адзначана таксама, што, нягледзячы на стабільнасць унутранага рынку ў цэлым, мае месца неабгрунтаваны імпарт спажывецкіх тавараў, аналагі якіх у дастатковым аб'ёме выпускаюцца ў краіне. Часам на прылаўках магазінаў замест айчынных тавараў лягчэй знайсці імпартны аналаг.

Больш таго, КДК пастаянна выяўляе факты рэалізацыі імпартных тавараў, якія не адпавядаюць патрабаванням беларускага заканадаўства па маркіроўцы, камплектнасці і ўпакоўцы, па прадастаўленні спажыўцам поўнай і дакладнай інфармацыі аб тавары.

Зянон Ломаць паведаміў кіраўніку дзяржавы аб тым, што ў бліжэйшы час адбудзецца пасяджэнне калегіі Камітэта дзяржкантролю з запрашэннем прадстаўнікоў органаў дзяржкіравання, якія дапусцілі абарот на тэрыторыі краіны замежных тавараў, што не адпавядаюць патрабаванням нацыянальнага заканадаўства.

Кіраўніку дзяржавы даложана аб ходзе рэалізацыі праграм імпартазамяшчэння. У 2008 годзе калегія Камітэта дзяржкантролю падвяла вынікі работы па вывучэнні праграм імпартазамяшчэння, у гэтым годзе кантроль за іх рэалізацыяй прадаўжаўся. Аднак сітуацыя не мяняецца. Асобныя віды імпартазамяшчальнай прадукцыі застаюцца незапатрабаванымі на складах вытворцаў.

Камітэт дзяржкантролю вывучыў пытанне закупкі і выкарыстання кармавых канцэрнантаў. Даручэнне кіраўніка дзяржавы аб поўным імпартазамяшчэнні кармавых канцэрнантаў не выканана ні адным аблвыканкамам, у 2009 годзе ў краіне доля імпартных канцэрнантаў склала 79 працэнтаў ад агульнага аб'ёму закупленых.

Кіраўнік КДК таксама паведаміў, што ў асобных камерцыйных банках выяўлена схема атрымання наяўных грошай праз прадпрымальнікаў.

Прэзідэнту даложана аб выніках праверкі ААТ «Белаграпрамбанк», дзе выяўлены факты неэфектыўнага выкарыстання сродкаў. На развіццё аграэкатурызму банкам выдадзена льготных крэдытаў на суму Br9,5 млрд (пад 5 працэнтаў гадавых, да 7 гадоў). Пры гэтым банк належным чынам не выконваў установленыя ім жа парадак кантролю за мэтавым выкарыстаннем крэдытаў. У шэрагу выпадкаў за кошт ільготных крэдытаў фактычна стымулявуюся імпарт дарагіх тавараў (легкавыя аўтамабілі, халадзільнікі, тэлевізары, пральныя машыны). Усяго камітэт устанавіў нямэтавае выкарыстанне крэдытаў на Br260 млн. Аднак банк не ажыццяўляў спагнанняў з крэдытаатрымальнікаў за нямэтавае выкарыстанне крэдытаў.

Аналагічная сітуацыя з выдачай банкам пазык на будаўніцтва жылля сваім работнікам. Па выніках праверкі Камітэт дзяржкантролю прапанаваў ураду уніфікаваць нарматыўныя палажэнні па пытаннях выдачы дзяржаўнымі банкамі жыллёвых пазык сваім работнікам.

Прэзідэнт даў згоду на правядзенне праверачных мерапрыемстваў па выкарыстанні бюджэтных сродкаў у Міністэрстве замежных спраў, у Міністэрстве аховы здароўя — па закупках абсталявання, а таксама на правядзенне праверкі Міністэрства эканомікі, якая пачнецца ў чацвёртым квартале гэтага года і завершыцца ў першым квартале наступнага.

У ходзе даклада старшыні Камітэта дзяржкантролю разгледжаны шэраг іншых пытанняў.

Паводле паведамленняў прэс-службы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і БЕЛТА.

«НАША МОВА ВЕЧНАЯ...»

Бой званоў сімвалізаваў адкрыццё Дня беларускага пісьменства. Урачыстая цырымонія адбылася на галоўнай гарадской плошчы Смаргоні — сталіцы цяперашняга свята.

Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Патупчык зачытаў віншаванне Прэзідэнта Беларусі ўдзельнікам і гасцям XVI Дня беларускага пісьменства.

Шматлікіх гасцей свята віталі старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Саўчанка, старшыня Смаргонскага райвыканкама Мечыслаў Гой, прадстаўнікі духавенства. У сваю чаргу Уладзімір Патупчык сказаў, што Дзень беларускага пісьменства — гэта заўсёды даніна павагі тым, хто на працягу многіх стагоддзяў нёс у свет беларускую мову, хто заклаў падмурак для кнігавыдання, ствараючы на Беларусі асветніцкія цэнтры…

Смаргоншчына — цудоўны куток беларускай зямлі, які даў свету вядомых дзеячаў культуры, навукі, палітыкаў і пісьменнікаў, асветнікаў. Сярод іх сусветна вядомы дзеяч Міхал Клеафас Агінскі, этнограф-лінгвіст Ян Карлавіч, кампазітар-дырыжор Мечаслаў Карловіч, Віктар Роўда і, безумоўна, Францішак Багушэвіч, які адзін з першых пачаў выдаваць свае творы на беларускай мове, сказаў Уладзімір Патупчык.



Старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Уладзімір Саўчанка адзначыў, што ў вобласці захавана багатая спадчына, у тым ліку і ў справе кнігавыдання. Рукапісныя кнігі, Лаўрышаўскае і Жухавіцкае евангеллі былі створаны на гэтай зямлі яшчэ ў XIV стагоддзі. Першая друкаваная газета на тэрыторыі Беларусі з'явілася на Гродзеншчыне. Сёння тут выдаецца 52 газеты і часопісы. На гэтай гродзенскай зямлі расквітнеў талент Адама Міцкевіча, Максіма Багдановіча…

Беларуская культура вельмі багатая, ёсць шмат імёнаў людзей у гісторыі краіны, якія ўнеслі вялікі ўклад у яе развіццё. Аб гэтым заявіў міністр культуры Павел Латушка. Кіраўнік ведамства падкрэсліў: «Беларусы павінны ганарыцца тым, што створана. Абапіраючыся на гэта, мы будуем сённяшнюю Беларусь, будуем яе заўтра».

На думку Паўла Латушкі, прапагандаваць сваю родную мову трэба асабістым прыкладам. Цяпер на пасадзе міністра культуры ён у асноўным размаўляе па-беларуску. Нядаўна дачка Паўла Латушкі напісала вершы. «Я не прымушаў яе размаўляць па-беларуску. Толькі пастаянна нагадваў, што гэта вельмі важна, што неабходна памятаць, адкуль мы родам. І як вынік — верш на беларускай мове», — сказаў Павел Латушка. Сам міністр таксама піша вершы, але не плануе іх публікаваць.

А вечарам на галоўнай пляцоўцы свята адбылася цырымонія перадачы эстафеты сталіцы XVII Дня беларускага пісьменства — Хойнікам.

Па традыцыі на галоўнай сцэне свята ўшаноўваюцца лаўрэаты штогадовага рэспубліканскага конкурсу «Лепшы твор года». Конкурс праводзіцца Міністэрствамі адукацыі, інфармацыі і культуры, Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Мінгарвыканкамам. Нам вельмі прыемна, што ў намінацыі «Лепшы фотамастак года» перамог **звяздоўскі фотакарэспандэнт Анатоль КЛЯШЧУК** — ён быў узнагароджаны за працу над фотаальбомамі «Пад небам Беларусі», «Чарнобыль», «Магілёўская вобласць» і «Мінск і наваколлі». Узнагароду — статуэтку «Залаты фаліянт» — Анатолю Клешчуку ўручыў міністр культуры Павел Латушка. Шчыра віншуем!

«Звязда» віншуе таксама былога супрацоўніка газеты, а сёння — дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Літаратура і мастацтва» Алеся Карлюкевіча — ён перамог у намінацыі «Літаратурная крытыка і літаратуразнаўства» з кнігай «Сцежкамі Ігуменшчыны», што выйшла ў выдавецтве «Беларусь» .

Упершыню прысутнічаў сярод намінацый гістарычна-краязнаўчы жанр. Тут перамога дасталася Наталлі Голубевай за кнігу «Радимичи. Земля непокоренная» (выдавецтва «Мастацкая літаратура». Удалым быў год для нашых калег з БЕЛТА — узнагароду атрымаў фотаальбом «Разам з краінай. Беларускае тэлеграфнае агенцтва. 1918-2008». Статуэтку «Залаты фаліянт» генеральнаму дырэктару БЕЛТА Дзмітрыю Жуку ўручыў міністр інфармацыі Беларусі Уладзімір Русакевіч. «Залаты фаліянт» уручаны і дырэктару выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Таццяне Бяловай. Шчыра віншуем іх з перамогай! Як і ўсіх, хто намінаваўся, хто стаў лепшым. Дарэчы, на конкурс паступіла больш за 200 выданняў па 23 намінацыях.

* * *

...У адным з ранейшых рэпартажаў пра Дзень беларускага пісьменства наша газета пісала, што свята гэтае, мусіць, любіць Бог, бо заўсёды спрыяе — добрым надвор'ем.

На гэты раз ён хацеў, мабыць, здрадзіць, але перадумаў — ці не ў апошні момант. Таму ветрана над Смаргонню было, холадна таксама. Што, напэўна ж, зменшыла колькасць гасцей і людзей на плошчах, але свята не сапсавала: з самага ранку над горадам луналі песні, разгортваліся шматлікія дзеі — асвячэнне Сабора і Божая літургія, адкрыццё помніка славутаму Францішку, выступленні, узнагароджанні, канцэрты, разгортвалі свае палаткі кнігавыдаўцы і гандляры, народныя майстры…

Трэба сказаць, што многія смаргонцы і госці свята мэтанакіравана шукалі нашу газету, каб засведчыць сваю павагу, каб падзякаваць... Хто за што. Настаўніца Галіна Ульянаўна Свірская з вёскі Лылойці, напрыклад, некалькі гадоў таму выйграла звяздоўскі халадзільнік. Трэба ж было расказаць, што служыць ён добра (хоць і дачцэ)? А яшчэ пахваліцца, што яна, гэтая дачка, у хуткім часе выходзіць замуж, і жэніцца сын. Во, якія клопаты! А яшчэ хацелася падпісчыцы расказаць, што некалі ў любімай газеце прычытала рэпартаж з фестывалю народнага гумару і дужа ж спадабаліся ёй аўцюкоўскія дактары з іх лекамі, кшталту «каб мужык налева не хадзіў», «каб ветрам не надзьмула», ад аблысення, «ад удаўлення», для мужчынскай моцы, для прыварота, «на апетыт»... Вось яны ў сваім Доме культуры і «адчынілі» «Чароўную аптэку» — больш за 20 найменняў мікстур. Каму трэба, «дактары» прапісваюць і на месцы выдаюць. Дапамагае. Ды так, што іх на гэта свята запрасілі — «трэба ж людзей лекаваць».

Гумар — цудоўны сродак. Таму падчас Дня пісьменства «Звязда» кожны год прыдумвае нейкі конкурс. Пазалетась у Паставах, прынамсі, трэба было вершык скласці пра «Звязду» і лапці. У многіх гэта добра атрымалася. Найлепш — у спадара Крупенькі. Ён і выйграў майку з лагатыпам газеты. Адно — мы той прыз аддаць не маглі, бо ўсяго і ведалі пра чалавека, што прозвішча.

Цяпер ведаем больш. Спадар Крупенька з Гомеля, працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Заўсёды стараецца прыехаць на гэтае свята, бо ёсць што паглядзець, ёсць што расказаць і паказаць потым калегам і дзецям.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Прамая лінія

АЛЕРГІІ Ў ДЗЯЦЕЙ

Пра гэта можна распытаць **загадчыка кафедры поліклінічнай педыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, прафесара, доктара медыцынскіх навук Уладзіміра Фёдаравіча ЖАРНАСЕКА.** «Прамая лінія» з яго ўдзелам адбудзецца ў **чацвер, 10 верасня з 14.00 да 15.30** па нумарах **8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.** Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах **8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).**

«НАЧНЫЯ МАТЫЛЬКІ» ТРАПІЛІ НА ЎЛІК

У жніўні падчас рэйдаў на вуліцах Мінска былі затрыманы 143 жанчыны сэкс-бізнэсу.

Як паведаміў начальнік прэс-службы ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр Ластоўскі, на працягу месяца сталічная міліцыя правярала месцы «палявання» прастытутак на праспектах Пераможцаў, Незалежнасці, Пушкіна, прыпынку грамадскага транспарту «9-ы кіламетр», а таксама ў гасцініцах і лазнях. На кантролі былі нават аб'явы сумнеўнага зместу ў інтэрнэце.

Вынікі рэйдаў супрацоўнікаў упраўлення па наркагандлі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі ГУУС Мінгарвыканкама сумесна з ППС паказалі, што найчасцей сэкс-бізнэсам займаюцца жанчыны ва ўзросце 20—30 гадоў без рэгістрацыі і пастаяннай крыніцы даходаў. Каля паловы разведзеных і выхоўваюць непаўналетніх дзяцей. Усе трапілі на ўлік органаў унутраных спраў.

Святлана БАРЫСЕНКА.

ПЕНСІЙНЫ ТАРЫФ — У НОВАЙ ПРАПОРЦЫІ?

Не выключана, што працэнт адлічэнняў для работнікаў узрасце, а для работадаўцаў — зменшыцца

Як вядома, ужо сёння пенсіянерам з'яўляецца кожны чацвёрты грамадзянін Беларусі. Што ж да перспектывы, то прагноз дэмаграфаў гучыць даволі адназначна: з цягам часу доля пенсіянераў будзе толькі ўзрастаць, а доля працаўнікоў — плацельшчыкаў пенсійных узносаў — змяншацца. А гэта, у сваю чаргу, — пагроза стабільнасці айчыннай пенсійнай сістэмы. Прычым шляхі выйсця тут могуць быць рознымі — ад павышэння пенсійнага ўзросту і ўвядзення дадатковых абмежаванняў для працоўных пенсіянераў да павелічэння пенсійнага тарыфу. Між тым, наколькі мэтазгодны апошні варыянт, якімі будуць яго наступствы і ці з'яўляецца аптымальнай цяперашняя «схема» пенсійнага фінансавання? Аб гэтым — гутарка карэспандэнта «Звязды» з начальнікам аддзела развіцця пенсійнай сістэмы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццянай Аляксандраўнай ПАГОНЫШАВАЙ.

— Не сакрэт, што падчас абмеркавання шляхоў рэформы перш-наперш гаворка ідзе аб тым жа ўзросце выхаду на пенсію ці аб новых абмежаваннях для працоўных пенсіянераў. У той жа час не сакрэт: ва ўмовах ускладнення дэмаграфічнай сітуацыі палепшыць трываласць пенсійнай сістэмы чыста тэарэтычна магло б павелічэнне тарыфу страхавых адлічэнняў. Чаму гэта тэма застаецца нібыта «за кадрам»?

— Магчыма, часцяком у грамадскай свядомасці павышэнне тарыфу ўяўляецца самым простым сродкам вырашэння пытання з узроўнем пенсій. У той жа час многія разумеюць, што падобныя крокі — звышнерацыянальныя. А на думку спецыялістаў, такая мера для нас проста непрымальная. Бо заўсёды ёсць пэўная «крытычная мяжа», выхад за якую цягне за сабой значныя праблемы.

Варта нагадаць, што пенсійны тарыф звязаны з фондам зарплаты і адносіцца на сабекошт тавараў і паслуг. Таму рост стаўкі ўзносаў прывядзе да вельмі негатыўных наступстваў. Іх «ланцужок» прадбачыць няцяжка: павышаецца тарыф — айчынная прадукцыя становіцца менш канкурэнтаздольнай, ускладняюцца праблемы з яе збытам, падаюць заробкі і, адпаведна, зніжаецца аб'ём паступленняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва.

Іншымі словамі, ёсць рызыка, што пенсійных грошай стане менш. І, як відаць, павысіць пенсіі такім чынам наўрад ці атрымаецца. І гэта — прагноз, блізкі да рэальнасці. Ужо сёння пенсійны тарыф у Беларусі вышэйшы, чым у многіх краінах блізкага замежжа. Так, у нас ён складае 29 працэнтаў, у тым ліку 28 працэнтаў ад фонду заробкаў пералічвае большасць работадаўцаў і 1 працэнт — работнікі. Тады, як напрыклад, летась «сукупная» стаўка ў Літве складала 26,2, Кыргызстане — 25, Латвіі — 22,86, Эстоніі — па 20, у Казахстане — 17 працэнтаў. Словам, там суб'екты гаспадарання маюць больш выгадныя ўмовы. А гэта важна як у плане пераадолення наступстваў сусветнага фінансавага крызісу, так і з пункту гледжання магчымасці прыцягнення замежных інвестыцый.

У выніку павелічэння тарыфу ўзнікне рызыка, што пенсійных сродкаў стане менш.

— Атрымліваецца, плацяжы неабходна... зніжаць?

— Пэўнае зніжэнне ўжо адбылося, нагадаю, зусім нядаўна айчынныя работадаўцы пералічвалі на фінансаванне пенсій па 29 працэнтаў ад фонду зарплаты. Аднак рабіць крокі ў гэтым напрамку надалей без змянення ў пенсійнай сістэме складана — у Беларусі вельмі вялікая доля пенсіянераў, а ім неабходна забяспечваць прымальныя па памерах і своечасовыя выплаты.

Таму больш правільным падаецца іншае рашэнне — перагляд размеркавання ставак тарыфу паміж работадаўцам і работнікам. Дарэчы, адна з рэкамендацый 102 Канвенцыі Міжнароднай арганізацыі працы вызначае: работадаўца і работнік павінны несці страхавую адказнасць па парытэту. Прычым менавіта такія падыходы існуюць і ў краінах з лепшымі пенсійнымі мадэлямі — напрыклад, у Германіі.

— Перагляд размеркавання тарыфу адбудзецца і ў Беларусі?

— Прынамсі, магчымасць рэалізацыі такіх змяненняў разглядаецца. Было б правільна, каб работнік выплачваў на пенсійнае страхаванне больш істотныя ўзносы, а нагрузка на работадаўцу стала ніжэйшай.

— Гаворка аб тым, што будзе прапанавана падзяліць цяперашнія «сукупныя» 29 працэнтаў зноў-такі паміж імі?

— Калі б мы пачыналі, як кажуць, з чыстага аркуша, так бы і было. Але гаворка ідзе аб змяненні наяўных правілаў, а гэта складаней. Таму пра тое, які варыянт урэшце рэшт будзе найбольш прымальным — казаць пакуль рана.

— Але ў любым выпадку мяркуецца, што работнікі будуць плаціць больш за цяперашні 1 працэнт. А адсюль цалкам лагічнае пытанне: ці не прывядзе меркаванае пераразмеркаванне да змяншэння памеру даходаў, якія атрымліваюцца «на рукі»?

— Адзначу, што мы кажам аб пераразмеркаванні страхавой нагрузкі. Іншымі словамі, дадатковая сума ўзносу павінна быць цалкам кампенсаваная работніку павелічэннем налічанага заробку. А для гэтага ў работадаўцы будуць сродкі, паколькі страхавая нагрузка на яго адэкватна зменшыцца. У ідэале трэба дамагчыся таго, каб і даходы работніка, і сукупныя даходы работадаўцы на аплату працы, а таксама аб'ём паступленняў у Фонд і падатковых паступленняў не змяніліся. А змяніліся б правілы іх фарміравання.

— І ўсё ж наколькі «балючымі» могуць стацца новаўвядзенні?

— Пры правядзенні падобных змяненняў Беларусь — не першапраходзец. Пераразмеркаванне пенсійнага тарыфу апошнім часам правялі такія краіны, як Польшча і Балгарыя. Шляхі там выбіраліся розныя, аднак паўсюль задача была вырашана больш-менш паспяхова. Прынамсі, не пацярпелі ні работнікі, ні работадаўцы, ні пенсіянеры, а парадку ў пенсійнай сістэме стала больш. Да таго ж больш паўнавартасны ўдзел у пенсійным страхаванні «Работнікаў ад ўласнага імя», як правіла, павышае іх зацікаўленасць у сваёй пенсійнай будучыні.

Дадатковая сума ўзносу павінна быць цалкам кампенсаваная работніку павелічэннем налічанага заробку. А для гэтага ў работадаўцы будуць сродкі, паколькі страхавая нагрузка на яго адэкватна зменшыцца.

— Аднак, наконт зацікаўленасці. Вядома, што многія лічаць «адметнасцю» цяперашняй пенсійнай сістэмы якраз залішнюю «ўраўнілаўку». І аргумент на карысць такой думкі — тое, як «працуюць» высокія індывідуальныя каэфіцыенты заробку...

— З цягам часу пытанне каэфіцыентаў страціць сваю вастрыню па той прычыне, што ў перспектыве плануецца перайсці на вызначэнне памеражу пенсій зыходзячы не са стажу і заробкаў, а з аб'ёму выплачаных узносаў.

Схематычна гэта выглядае так. Чалавек працуе і робіць пенсійныя адлічэнні. Інфармацыя аб гэтых адлічэннях разам з іншымі персанальнымі звесткамі назапашваецца на яго асабістым рахунку і своеасаблівым чынам «асучасніваецца» — індэксуецца, як правіла, зыходзячы з росту зарплаты. Потым пенсія разлічваецца шляхам дзялення агульнага аб'ёму пералічаных і асучасненых узносаў на чаканы перыяд атрымання пенсіі. Гэты перыяд вызначаецца паводле сярэдне-статыстычнага паказчыка. Скажам, сёння сярэдні перыяд атрымання пенсіі ў Беларусі пры выхадзе на яе ў 60-гадовым узросце складае 17,7 года. Вось чаму ўзносы работніка павінны быць больш істотнымі. Пагадзіцеся, што нават пры адносна высокім заробку 1 працэнта адлічэнняў для прымальнай пенсіі відавочна недастаткова.

— Не цяжка заўважыць, што пры такой раскладцы сапраўды важны аб'ём адлічэнняў, а не час, за які яны будуць зробленыя. Такім чынам, сам па сабе стаж стане неактуальным?

— Не зусім. Бо, па-першае, стаж па-ранейшаму будзе «пропускам» у сістэму страхавых пенсій. Варта нагадаць, што сёння права на такія пенсіі ў нас маюць толькі грамадзяне, якія адпрацавалі з выплатай пенсійных узносаў не менш за 5 гадоў. Прычым умова пэўнага мінімальнага стажу застанецца і ў будучыні.

А па-другое, зразумела: чым больш чалавек працуе, тым большы аб'ём узносаў ён пералічвае.

— Ці значыць гэта, што работніку будзе выгадна выходзіць на пенсію ў больш познім узросце?

— Па сутнасці, гэта сапраўды так. Бо больш працяглая працоўная дзейнасць з аднаго боку павялічвае аб'ём выплачаных страхавых узносаў, а з іншага — змяншае перыяд атрымання пенсіі. А ў выніку — атрымліваецца больш высокая пенсія. Як зазначаюць спецыялісты, прыняцце рашэння аб больш познім звароце па пенсію — доля аптымістаў. А ў такой сістэме гэта дае і значны фінансавы эфект.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.09.2009 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 830,00
▲ 1 еўра	4 061,05
1 латвійскі лат	5 781,41
1 літоўскі літ	1 175,54
1 чэшская крона	159,19
1 польскі злоты	985,65
▲ 1 расійскі рубель	90,04
1 украінская грыўня	321,59

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РБ

USD	31,4298
UAH	35,7157
1000 BYR	11,1020
EUR	45,0672

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Парламенцкі дзённік

БЕЛАРУСЫ Ў ПОЛЬСКАЙ КРЫНІЦЫ

XIX Эканамічны форум пройдзе з удзелам нашай краіны

Міжнародная сустрэча палітыка-эканамічных эліт зарэкамендавала сябе як эфектыўная пляцоўка для наладжвання і развіцця дзелавых кантактаў. «Усходнееўрапейскі Давос» — так неафіцыйна называюць аўтарытэтны форум, штогод збірае ў польскім курортным горадзе Крыніца да 2000 палітыкаў, дыпламатаў, навукоўцаў, вядучых прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў з 65 краін свету.

Праграма сёлетняга мерапрыемства на 9—12 верасня прадугледжвае правядзенне пленарных сесій і больш як 130 семінараў па розных тэматычных блоках: макраэканоміка, міжнародная палітыка і бяспека, міжрэгіянальнае супрацоўніцтва, наладжванне кантактаў паміж Еўрасаюзам і суседнімі дзяржавамі, паліўна-энергетычная сфера, узаемадзеянне ў гуманітарнай сферы, а таксама роля грамадзянскай супольнасці ў сучасных эканамічных умовах.

Ад Палаты прадстаўнікоў у форуме возьме ўдзел Сяргей Маскевіч, старшыня пастаяннай камісіі па міжнародных справах і сувязях з СНД. Тэма яго выступлення — «Адказ грамадзянскай супольнасці на эканамічны крызіс: сацыяльныя грамадзянскія інстытуты і грамадзянскі кантроль». Запланаваны не толькі яго ўдзел у семінарах у рамках форуму, але і сустрэчы парламентарыя з польскімі калегамі, якія ўваходзяць у камісіі па этнічных і нацыянальных меншасцях, па бюджэце і публічных фінансах, па адукацыі, навуцы і справах моладзі, па ўнутраных справах і адміністрацыі. Чакаецца таксама, што палітык сустрэнецца з кіраўніцтвам вышэйшых навучальных устаноў і прадстаўнікамі беларускай дыяспары ў Польшчы.

Ала МАЧАЛАВА.

Калядны абрад вёскі Рок Мінскай вобласці прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі

Абрад «Шчодрык» вёскі Рок Салігорскага раёна Мінскай вобласці прызнаны гісторыка-культурнай каштоўнасцю і ўключаны ў спіс нематэрыяльнай спадчыны Беларусі. Адпаведная пастанова прынята Саветам Міністраў 19 жніўня гэтага года. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінаблвыканкама Святлана БАРАНОК.

У вёсцы Рок захаваліся ўнікальныя традыцыі, звязаныя з навагоднімі святочнымі абходамі, — музычны калектыў вёскі, адной з удзельніц якога споўнілася 89 гадоў, сабраў шматлікія песенныя віншаванні для гаспадара і яго сям'і з Калядамі, прыкметныя ў этнамузычным плане.

Гісторыка-культурнай каштоўнасцю ў Беларусі прызнаны яшчэ некалькі абрадаў, якія існуюць на тэрыторыі сталічнага рэгіёну, — гэта калядны абрад «Цары» вёскі Семежава Капыльскага раёна і мясцовы песенны стыль выканання традыцыйных абрадавых і неабрадавых твораў аўтэнтычнымі фальклорнымі калектывамі з вёсак Обчын, Закальное і Ямінск Любанскага раёна. Калядны абрад «Цары» зарадзіўся яшчэ ў XVIII стагоддзі. У той час салдаты і афіцэры рускай арміі хадзілі па вясковых хатах і віншавалі гаспадароў са святам, паказвалі прадстаўленні і прасілі дары. Потым традыцыі перанялі вясковыя хлопцы — яны сталі апранацца ў карнавальныя касцюмы, якія нагадваюць ваенную форму (гэтыя персанажы атрымалі мянушку «цары»). У калядных паходах прымалі ўдзел і мясцовыя героі — дзед і баба. «Гэты ўнікальны абрад быў абноўлены ў 1997 годзе і праводзіцца на сённяшні дзень. Ён з'яўляецца нематэрыяльнай праявай творчасці, ладу жыцця толькі жыхароў вёскі Семежава», — сказала Святлана Баранок.

Аўтэнтычныя любанскія фальклорныя калектывы «Глыбокія крыніцы», «Журавушка», «Павалякі» таксама захавалі беларускія народныя традыцыі, абрады, песні, танцы, прыказкі і знаёмяць з імі слухачоў на розных канцэртах і фестывалях.

Надзея РАДЗІВОН, БЕЛТА.

Пастаянна дзеючую выставу-кірмаш айчынных тавараў плануецца адкрыць у Мінску

У Мінску плануецца адкрыць пастаянна дзеючую выставу-кірмаш айчынных тавараў. Аб гэтым паведаміў намеснік старшыні камітэта эканомікі — начальнік управлення прадпрымальніцтва Мінгарвыканкама Аляксандр Каліноўскі на аператыўнай нарадзе ў мэрыі, паведамляе БЕЛТА. Цяпер вывучаецца магчымасць арганізацыі такой выставы-кірмашу на базе КУП «Мінскі аптовы рынак». Тут, паводле слоў Аляксандра Каліноўскага, ёсць усе неабходная інфраструктура — свабодныя плошчы (1,5 тыс. кв.м), мытны тэрмінал, аддзяленне банка, ветслужба і іншыя аб'екты абслугоўвання.

Прадугледжваецца, што на выставе-кірмашы будзе прадстаўлены максімальна поўны асартымент прадукцыі прадпрыемстваў канцэрнаў «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам», «Беллеспаперапрам» і іншых.

ПЕНСІЙНЫ ТАРЫФ — У НОВАЙ ПРАПОРЦЫІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Што будзе, калі чалавек пражыве больш за чаканы перыяд атрымання пенсіі і тым самым фактычна «вычарпае» агульную суму сваіх пералічаных узносаў?

— У такой сістэме, у адрозненне ад накапляльнай, «пражыць» пенсійныя сродкі немагчыма. Аб'ём узносаў прымаецца ў разлік толькі пры вызначэнні памеру пенсіі. Надалей жа пенсіі індэксуюцца паводле агульных правілаў і выплачваюцца пажыццёва. Іншымі словамі, прынцып «вычэрпвання» рахунку не адсочваецца.

— Дзе будзе назапашвацца інфармацыя аб узносах, што пералічвае работнік?

— Такая інфармацыя ўжо назапашваецца ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва — нагадаю, што з 1 студзеня 2003 года ў Беларусі ўведзены персаніфікаваны ўлік у сістэме сацыяльнага страхавання. Прычым варта заўважыць: і сёння, і ў будучыні работнікі могуць кантраляваць стан свайго індывідуальнага рахунку. І чым больш пільна адсочваюцца звесткі на такіх рахунках, тым менш узнікае пытанняў пры прызначэнні пенсіі.

З цягам часу плануецца перайсці на вызначэнне памераў пенсій выходзячы не са стажу і заробкаў, а з аб'ёму выплачаных узносаў.

— Паколькі інфармацыя ўжо збіраецца — змены «на старце»?

— У выпадках, калі гаворка ідзе аб змяненні заканадаўства, тэрміны залежаць ад заканадаўцаў. Можна толькі зазначыць, што спецыялісты перакананыя — неабходнасць змен наспела даўно.

— У выпадку прыняцця рашэння аб пераходзе на новы прынцып разліку натуральна ўзнікне сітуацыя, калі на пенсію вельмі працяглы час будуць выходзіць людзі, якія працавалі да ўвядзення персаніфікаванага ўліку страхавых узносаў. Як тады ацаніць пенсійныя правы, зароблены да 1 студзеня 2003 года?

— Спрабаваць нейкім чынам «асучасніць» зароблены раней пенсійны правы — справа вельмі нявдзячная. Вопыт іншых краін, і перш-наперш Польшчы, паказаў, што такі шлях надзвычай працаёмкі, бо па сутнасці гаворка ідзе аб прызначэнні пенсіі за сцісла час усім работнікам краіны. А гэта непазбежна цягне за сабой блытаніну і памылкі. Таму найбольш прымальны варыянт — прызначэнне страхавой пенсіі з выкарыстаннем двух складнікаў. Так, частка пенсіі за працу да 1 студзеня 2003 года можа разлічвацца аналагічна сённяшнім правілам. А за перыяды працы пасля ўвядзення персаніфікаванага ўліку — зыходзячы з аб'ёму ўзносаў, што выплацілі работнікі на пенсійнае страхаванне.

Сяргей ГРЫБ.

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Алена ДЗЕВОЙНА

СТАЖ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

Адкажыце, калі ласка, на такое пытанне. Я працавала ва ўпраўленні па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва, а цяпер працую ў галіне адукацыі. Ці залічваецца стаж у якасці дзяржслужачага ў працоўны педагагічны стаж пры налічэнні заробку? Чула, што ёсць нейкія льготы дзяржаўным служачым.

Н.В., *г. Мінск*

Пытанні вылічэння стажу для гэтых мэтаў рэгулююцца Палажэннем аб парадку вылічэння стажу працы па спецыяльнасці (у галіне) і павышэння тарыфных ставак (акладаў) работнікам арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту і карыстаюцца дзяржаўнымі датацыямі, за стаж працы па спецыяльнасці (у галіне), зацверджаным пастановай Міністэрства працы Рэспублікі Беларусь ад 12.01.2000 г. № 4 (са змяненнямі і дапаўненнямі па стане на 16.01.2009 г.) (далей — Палажэнне).

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтым Палажэннем распрацавала і зацвердзіла пастановай ад 31.10.2002 г. № 45 (у рэдакцыі пастановы ад 18.09.2008 г. № 82) Інструкцыю аб асаблівасцях вылічэння стажу працы па спецыяльнасці (у галіне) работнікаў арганізацый сістэмы адукацыі, фінансуемых з бюджэту (далей — Інструкцыя).

У адпаведнасці з пунктам 3 Палажэння, дыферэнцыяванае павышэнне тарыфных ставак (акладаў) за стаж працы па спецыяльнасці робіцца спецыялістамі, якія займаюць пасады, прадугледжаныя пералікам спецыялістаў бюджэтных арганізацый аховы здароўя, сацыяльнай абароны, адукацыі, навукі, фізічнай культуры і спорту, культуры і мастацтва, радыё і тэлебачання, архіваў і архіўных устаноў, рэдакцый газет і часопісаў згодна з дадаткам да гэтага Палажэння (далей — Пералік спецыялістаў).

У стаж працы па спецыяльнасці для павышэння тарыфных ставак (акладаў) уключаецца час працы (службы) спецыялістаў у бюджэтных арганізацыях, на пасадах, прадугледжаных у Пераліку спецыялістаў, незалежна ад галіновай прыналежнасці бюджэтнай арганізацыі.

Пунктам 4 Інструкцыі прадугледжваецца, што ў стаж працы па спецыяльнасці кіраўнікам і спецыялістам арганізацый адукацыі залічваюцца перыяды, прадугледжаныя Палажэннем, а таксама перыяды працы ў арганізацыях сацыяльнай абароны, фінансуемых з бюджэту, на пасадах, прадугледжаных Пералікам спецыялістаў.

У сваім лісце вы не называеце пасаду, якую займалі на ранейшым месцы працы, а таксама цяперашнія месца працы і пасаду. Па гэтай прычыне даць вычарпальны адказ немагчыма. Вы можаце самастойна пазнаёміцца з Пералікам спецыялістаў, які з'яўляецца дадаткам да Палажэння, і параўнаць пасады арганізацый сацыяльнай абароны (пункт 2 Пераліку) з тымі пасадамі, што займалі вы, калі працавалі там. Калі яны супадаюць і калі пасада, што вы займаеце цяпер, прадугледжана пунктам 3 Пераліку спецыялістаў адукацыі, то папярэдні стаж ва ўпраўленні па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва таксама неабходна залічваць.

Перыяды працы, якія падлягаюць заліку ў стаж працы па спецыяльнасці (у галіне), падсумоўваюцца незалежна ад перапынкаў у рабоце.

Ільготы работнікам, якія на папярэднім месцы працы з'яўляліся дзяржаўнымі служачымі, па заліку гэтага стажу ў стаж працы па спецыяльнасці па новым месцы працы не прадугледжаны. Папярэдні стаж залічваецца на ўмовах, вызначаных у названых Палажэнні і Інструкцыі. Пры гэтым папярэдняе месца працы можа як адносіцца да дзяржаўнай службы, так і не.

Калі ж па цяперашнім месцы працы ваша пасада таксама адносіцца да дзяржаўнай службы (напрыклад, калі вы працуеце ў Міністэрстве адукацыі або ў раённым упраўленні адукацыі), то дзяржаўным служачым заработная плата (у тым ліку надбаўка за клас і за выслугу гадоў) налічваецца на ўмовах, прадугледжаных артыкулам 48 Закона Рэспублікі Беларусь ад 14.06.2003 г. «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь».

ПРЫГАЖОСЦЬ ВЫРАТУЕ СВЕТ!.. А ЯШЧЭ БАЛЕРЫН І СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ

Чым абяцае здзівіць фінал «Міс Мінск-2009»?

Незвычайны сацыяльны праект, пачынаючы ад распрацоўкі спецыяльнай лініі мыла і заканчваючы адкрыццём крамы для балерын, можа быць рэалізаваны пераможцай конкурса «Міс Мінск-2009». Пра гэта карэспандэнту «Звязды» расказалі ў прэс-службе тэлеканала СТБ. Так, адна з канкурсантак Дар'я Саладуха, якая вучыцца ў Краснадарскім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, лічыць, што ў Беларусі бракуе якасных пуантаў. Яе прапанова — гэта спецыялізаваная крама для балерын і вучняў харэаграфічных вучылішчаў.

— Ідэю ўключыць у конкурс прыгажосці сацыяльны праект мы прыдумалі спецыяльна, — гаворыць **прэс-сакратар тэлеканала СТБ Анастасія САВІЦКАЯ.** — У гэтым годзе мы вырашылі паказаць не толькі прыгажосць фіналістак, але і іх розум: адметнасць не толькі знешнюю, але і ўнутраную. Будучая міс павінна клапаціцца таксама і пра тое, як палепшыць жыццё ў сталіцы. У якасці галоўнага прыза пераможца атрымае магчымасць рэалізаваць свой сацыяльны праект.

Што ж разумеюць пад назвай «сацыяльны праект» сталічныя пражуні, фіналісткі конкурсу?

Выкладчыца іспанскай мовы **Марына АПІМАШКА** прапаноўвае распрацаваць спецыяльныя канструкцыі, з дапамогай якіх балконы гараджан «будуць патанаць» у кветках. Студэнтка БДЭУ **Юлія ЦУРЫКАВА** хоча абвясціць 2010 год годам якасных прадуктаў. А 18-гадовую **Ганну ГВАНОЎСКУЮ** непакоіць «ветлівасць» касіраў, дзяўчына ініцыюе ўсталяванне ля касавых апаратаў люстэркаў, каб прадаўцы пастаянна бачылі сябе звонку і часцей усміхаліся.

Дзякуючы **Алене ДЗЯМІДАВАЙ,** на складаных перакрыжаваннях горада могуць з'явіцца выпуклыя люстэркі, як на горных дарогах, «каб воку былі бачныя небяспечныя зоны». А будучы медык **Аляксандра ВІТОРСКАЯ** марыць адкрыць сайт, прысвечаны карыснай і здаровай ежы...

Нядрэнна працуе фантазія і ў **Ларысы КУЗЬМЯНКОВАЙ.** Студэнтка медыцынскага ўніверсітэта хоча распрацаваць спецыяльную лінію мыла і ручнікоў «са Спані Бобамі і Смяшарыкамі». 20-гадовая **Дар'я САЛАДУХА** адчыніла б у сталіцы спецыялізаваную краму для балерын, а праект **Таццяны ЗЯНЬКЕВІЧ** зрабіў бы рэвалюцыю ў сельскай гаспадарцы. Паводле падлікаў дзяўчыны, калі пры паліве раслін у ваду дадаваць аскарбінавую кіслату, то рост раслін разам з ураджайнасцю павялічыцца ў два разы...

«Чаркай і шкваркай» частавала б замежных турыстаў **Кацярына КАВАЛЁНАК,** студэнтка БДЭУ, якая хоча пабудаваць ля возера сядзібу і спяваць там беларускія песні для гасцей. А будучая журналістка **Лэйла ІСМАІЛАВА** дзеля рэалізацыі сваёй ідэі нават атрымала дазвалаўленне царквы. Лэйла плануе выступаць у школах перад падлеткамі, распавядаючы ім, што «інтымнае жыццё не павінна прыводзіць да абортаў і небяспечных захворванняў»...

Конкурс «Міс Мінск» да гэтага года праходзіў ужо двойчы. Сёлета ў яго ўпершыню былі ўнесеныя змены: узрост дзяўчат пры адборы паднялі да 30 гадоў, а рост канкурсантак мог пачынацца са 160 см... Галоўная ж навінка года — сацыяльны праект дзяўчат. Наколькі сацыяльныя прыдумкі сёлетніх прыгажунь спалучаюцца з іх унутранай і знешняй прывабнасцю, мінчане даведаюцца ўжо 10 верасня, калі падчас фіналу, які пройдзе ў «Мінск-Арэне», будзе агучана імя новай «Міс Мінск».

Ілья ЛАПАТО.

Абзац

◢ У Жодзіне (Мінская вобласць) у ізалятары часовага ўтрымання памёр затрыманы, перадае БЕЛТА. У затрыманага за дробнае хуліганства 47-гадовага жыхара горада рэзка пагоршыўся стан здароўя. Мужчына памёр у прысутнасці брыгады «хуткай дапамогі». Прычына смерці вызначаецца.

◢ **У Оршы міліцыя затрымала грамадзяніна Расіі, які расшукваецца за забойства ў Грозным. 24-гадовы расіянін быў затрыманы беларускай міліцыяй у цягніку Масква-Брэст. Жыхар Смаленка вышукваўся за наўмыснае забойства.**

◢ 14 кароў трапілі пад два цягнікі ў Полацкім раёне. Здарэнне адбылося ў ноч з 6 на 7 верасня паблізу вёскі Гараны з інтэрвалам у 45 хвілін. Грузавымі цягнікамі былі збітыя каровы, што належалі СВК «Гараны-Агра». Затрымка ў руху склала 30 хвілін. Цеплавозам прычыненыя тэхнічныя пашкоджанні. Тушы кароў перададзеныя прадстаўнікам СВК. Высвятляюцца прычыны, па якіх каровы трапілі на чыгуначнае палатно.

Поўны абзац

◢ **Французскі гросмайстар расійскага паходжання Уладзіслаў Ткачоў на турніры ў індыйскай Калкасе (былая Калькута) саступіў мясцоваму шахматысту Правіну Кумару пасля 11 хадоў у партыі. Ткачоў, які прыбыў на гульню ў нецвярозым стане, заснуў і праспаў свой чарговы ход. Гросмайстар быў настолькі п'яны, што з цяжкасцю мог сядзець у крэсле. Пасля некалькіх хадоў ён задрамаў, паклаўшы галаву на стол. Арганізатары турніру паспрабавалі разбудзіць майстра, аднак спробы былі безвыніковымі, і праз паўтары гадзіны пасля пачатку сустрэчы Ткачову было прысуджана тэхнічнае паражэнне. Ён атрымаў папярэджанне ад арганізатараў турніру, аднак не быў дыскваліфікаваны і працягне выступленні. Ён лічыцца адным з вядучых шахматыстаў Францыі.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

На слыху

ВЫПІЎ І... ДАЕЗДЗІЎСЯ

У Мінску ў дарожна-транспартнае здарэнне трапіў 30-гадовы кіроўца, у крыві якога было выяўлена 2,84 (!) праміле алкаголю.

Паводле звестак аддзела па агітацыі і прапагандзе ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама, нецвярозы кіроўца «Фальксвагена-Пасата» наляцеў на «перашкоду» на вуліцы Ляшчынскага каля васьмі гадзін вечара. Спрабуючы абагнаць аўтамабіль, які рухаўся ў спадарожным напрамку, ён выехаў на паласу сустрэчнага руху і ўехаў у прыпаркаваны «Мерседэс-Бэнц». Апошняе аўто, дарэчы, ад удару зрушылася і пашкодзіла мікрааўтобус «Мерседэс». У гэтым здарэнні пацярпеў 29-гадовы пасажыр «рызыкоўнага» кіроўцы, які змешчаны ў бальніцу.

Ігар ГРЫШЫН.

ЧАМУ НЕ ЗАХАЦЕЛА ЖЫЦЬ?

Трывожны званок паступіў у Віцебску па тэлефоне «101»: у рацэ Дзвіна — жанчына. Было гэта каля чатырох гадзін дня.

Калі выратавальнікі пад'ехалі па выкліку ў самы цэнтр горада, у раён парка імя Калініна, убачылі ў вадзе цела, якое плыло па цячэнні. Два выратавальнікі кінуліся ў ваду і пры дапамозе спецыяльнага абсталявання выцягнулі жанчыну. Спрабавалі ёй дапамагчы, але было ўжо позна. Знайшліся людзі, якія бачылі, што нейкая жанчына гадоў 50—60 на выгляд уваходзіла ў ваду ў месцы ўпадання ракі Віцьба ў Заходнюю Дзвіну. Што здарылася ў яе жыцці, чаму больш не захацела жыць?

КАРМЫ ЗАГАРЭЛІСЯ САМІ?

З ААТ «Рудакова» Віцебскага раёна а сёмай гадзіне раніцы паведамілі ў аварыйную службу пра тое, што гарыць сенасховішча ў вёсцы Ноўка.

Калі пажарныя прыбылі на месца здарэння, убачылі, што гарыць сена на плошчы 100 квадратных метраў унутры металічнага каркаснага сенасховішча. Плошча самога сховішча, пабудаванага летась, — 1500 квадратных метраў. У складзе было назапашана — 216 тон сена і 187 тон саломы.

Даволі хутка пажар ліквідавалі. У выніку агнём былі знішчаны толькі 10 тон сена. Мяркуецца, што прычына пажару — біялагічнае самаўзгаранне кармоў (захоўванне сена з павышанай вільготнасцю). Папярэднюю матэрыяльную страту ацанілі ў 870 тысяч рублёў.

ЗАТРЫМАЛІ «КЛАФЕЛІНШЧЫКА»

Клафелін у гарэлцы — гэтая атрута дапамагала расіяніну, які ўваходзіў у давер да пасажыраў цягнікоў, і пасля сумеснага застолля забіраў у іх грошы.

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік УУС на транспарце МУС Беларусі, генерал-маёр міліцыі Вячаслаў ЯЎСТАФ'ЕЎ,** гэты злодзей быў затрыманы пры ўездзе ў Літву, дзякуючы сумесным намаганням беларускіх і расійскіх міліцыянераў. Ён нейкім чынам адразу «вылічваў» сваіх будучых ахвяраў, у якіх пры сабе былі вялікія грошы. Знаёміўся ў цягніках, запрашаў разам выпіць гарэлку. Улічваючы, што яго крымінальныя дзеянні маглі пагражаць і жыццю людзей, пакаранне будзе жорсткім.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ХРАНІЧНАЯ «МІНЁРША»

Праз хвіліну пасля тэлефоннага званка на спецлінію «102» гомельскімі міліцыянерамі непасрэдна ля таксафона была затрымана 25-гадовая жанчына, якая па той бок ночы пагражала, што ў Гомелі і Магілёве замініраваны вакзалы.

Як паведамілі ў прэс-службе УУС Гомельскага аблвыканкама, выбуховая прылада не была знойдзена, тым не менш, на чыгуначным вакзале праводзілася эвакуацыя 70 чалавек, быў затрыманы рух цягніка «Кіеў—Мінск», выстаўлялася ачапленне. Падазроная ў несапраўднай трывозе раней была судзімая за такое ж злачынства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

З ПАЧАТКУ ГОДА Ў СТАЛІЦЫ ЗЛАДЗЕІ СКРАЛІ БОЛЬШ ЗА СОТНЮ ВЕЛАСІПЕДАЎ

Пры гэтым зламыснікаў цікавілі не толькі дарагія спартыўныя мадэлі, але і старэнькія «Буслы».

Адзін з іх скралі з тамбура агульнага балкона — у гаспадароў нават думкі не ўзнікала, што на танны веласіпед, які шмат пабачыў, можа нехта паквапіцца. Міліцыя нагадвае ўладальнікам веласіпедаў: выкарыстоўвайце замкі і не пакідайце сваю тэхніку надоўга без нагляду.

Алена КЛІМКОВІЧ, «Мінск—Навіны».

ХАРВАЦКІ ПАСЬЯНС: ХТО — У ПРЭТЭНДЭНТЫ, ХТО — У СТАТЫСТЫ

Футбол. ЧС-2010.
Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Харватыі

Матч нацыянальных зборных Харватыі і Беларусі ў Заграбе ў рамках адборачнага турніру да ЧС-2010 стаў прадвызначальным для абедзвюх зборных... З той толькі розніцай, што для падначаленых Славена Біліча ён без пяці хвілін стаў пропускам у плэй-оф цяперашняй кваліфікацыі, а для выхаванцаў Бернда Штанге развітальнай песняй і поўнай стратай надзей на паездку на фінал сусветнага першынства. Хоць будзем шчырымі: у адрозненне ад матчу трохтыднёвай даўніны ў Мінску, паядынак на 40-тысячніку «Максіміры» меў зусім іншы характар. Беларусы змагаліся без прызнаных аўтарытэтаў Аляксандра Глеба і Віталя Кутузава і ні ў чым не саступалі гаспадарам. А на фінішы гульні ўвогуле маглі пакласці харватаў на лапаткі. Праўда, у многім дзякуючы выдатнай гульні свайго галкіпера Вердана Рунье і фатальнаму нешанцаванню беларусаў у завяршэнні галявой сітуацыі госці не змаглі распячатаць вароты супернікаў і прайгралі 0:1.

На матч у сталіцу Харватыі каманда Бернда Штанге накіроўвалася не ў якасці хлопчыкаў для біцця. Пра гэта настаўнік беларусаў неаднаразова расказваў на сустрэчах з журналістамі, што прайшлі напярэдадні важнага матчу. Пры гэтым замежны коўч увесь час нагадваў, што для гульні з лідарамі сусветнага футбола — а харваты на сёння 9-я ў рэйтынгу ФІФА — майстэрства ў яго каманды будзе малавата, а вось гульнявой агрэсіўнасці і поўнай самааддачы не хапала. А вось цяпер, маўляў, прыбавім газу і запалім агеньчык у сэрцах беларускіх футбалістаў-зборнікаў.

Хтосьці, магчыма, палічыў, што Штанге заняў пазіцыю трэнера-авантурыста, робячы такія смелыя заявы. Праўда, ужо па прылёце ў Заграб мы мелі адчуванне, што нас харваты не збіраюцца закідваць шапкамі. У пацвярджэнне таму — поўная зала мясцовых рэпарцёраў з блакнотамі, дыктафонамі, фотаапаратамі і відэакамерамі. Сустракаюць — бы пераможцаў матчу. Значыць, замежная разведка данесла да штаба Біліча пагрозы нямецкага калегі.

Пацвярджэннем таго, што «шашачнікі» пабойваюцца «прошаных» гасцей з Беларусі, стала вячэрняя трэніроўка на стадыёне «Максімір». Спачатку зялёную паляну апрабавалі Штанге і К, дзе на майстар-клас беларусаў свабодна маглі назіраць мясцовыя журналісты. А вось ужо трэніроўку харватаў нашым прадстаўнікам СМІ ўбачыць не ўдалося — па просьбе галоўнага трэнера яе зрабілі закрытай. Магчыма, харваты верылі ў прыкметы: роўна год таму ў самым пачатку кваліфікацыйнага турніру на гэтым жа стадыёне яны прайгралі пакуль першы і апошні афіцыйны міжнародны матч. Тады, пасля вялікага наплыву на трэніровачны працэс каманды Славена Біліча англійскіх папарацы, харваты прайгралі англічанам 0:2.

Сказаць, што дэрбі Харватыя — Беларусь, выклікаў вялікую напружанасць на вуліцах Заграба з боку балельшчыкаў ці яго анансаванне заняло шмат месца на вуліцы ў афішах і ў тэлероліках на мясцовым тэлебачанні — не скажаш. Усё намнога прасцей — за суткі да пачатку матчу на гарадскіх вуліцах амаль ні слова. Толькі назаўтра, у другой палове дня, калі пасля рэдкішняга дажджу выглянула цёплае балканскае сонца, тэма футбола набыла сваю актуальнасць. Сотні балельшчыкаў у чырвона-белыя шашачкі запоўнілі вулічныя кавярні і рэстараны. Піва — ракой, песні — таксама. Перад ад'ездам на стадыён паліцэйскія Заграба нібы на ўсялякі выпадак папярэдзілі беларускі аўтобус з журналістамі і балельшчыкамі, каб сцягамі ў вокнах не размахвалі. Маўляў, мала што можа быць.

Гульня пачалася пад гучныя распевы харвацкіх балельшчыкаў. На кон фактычна выстаўлялася месца ў плэй-оф чэмпіянату свету. Трэба сказаць, што за гады сваёй самастойнасці, пачынаючы з кастрычніка 1990 года, харваты прывычылі сваіх фанаў да вялікага футбола і такіх вядомых імёнаў, як Званімір Бобан, Давар Шукер, Ален Боксыч. За гэты даволі непрацяглы па гістарычных мерках час «шашачнікі» тройчы прабіваліся ў фінальныя часткі чэмпіянатаў Еўропы і столькі ж разоў спрабавалі шчасце ў супераборніцтвах свету. І ўдача часам ім усміхалася. На чэмпіянаце свету 1998 года ў Францыі зборная Харватыі ў матчы за бронзавыя медалі змагла выграць 2:1 у галандцаў. У астатнім фартуна на топ-турнірах адварочвалася ад харвацкай зборнай. Хоць, чаго здзіўляцца, для беларускай каманды ўзровень выступленняў іх супернікаў быў бы велізарным поспехам.

Спорт, як і футбол у цэлым, не прымае ўмоўнага ладу, таму размовы нашкталт «вось калі б забілі» ці «а вось калі б не варатар» і г.д. — на карысць бедных. Матч у Заграбе паказаў, што ні сімпатыі аўстрыйскага арбітра да харватаў, ні вялікая падтрымка балельшчыкаў, ні ўмовы надвор'я не маглі стаць перашкодай для гульцоў нацыянальнай зборнай Беларусі ў тым, каб дабіцца поспеху. І шанцаў для ўзяцця варот было больш чым дастаткова. Асаблівы адрэзак гульні — апошнія хвілін дзесяць. У гэты час у прэс-цэнтры харвацкія журналісты маглі карыстацца валяр'янкай ці карвалолам, бо яны не верылі сваім вачам: што творыць беларусы! Здавалася, што яшчэ імгненне — і сетка за варотамі дзейнага галкіпера французскага «Ленса» і зборнай Харватыі Вердана Руне затрасецца ад гола. Аднак мяч упарта не ішоў у вароты.

Ужо пасля матчу паўабаронца самарскіх «Крылаў Саветаў» Цімафей Калачоў прызнаўся, што беларусы проста не верылі, што могуць так на выездзе «вазіць» масцітага суперніка, што не самым лепшым чынам адбівалася на завяршальнай фазе атакі.

Фінальны свісток прымусіў увесь харвацкі футбольны бамонд уздыхнуць з палёгкай. Настаўнік гаспадароў Славен Біліч, нягледзячы на 20-гадовую розніцу ва ўзросце, па-сяброўску абняў аксакала Штанге і доўга пра штосьці з ім размаўляў, не выпускаючы са сваіх абдымкаў. Пазней галоўны трэнер беларусаў прызнаецца, што вадаспад кампліментаў у адрас каманды — гэта добра. Праўда, пажадана, каб яны ліліся ракой пры станоўчым выніку.

Бернд Штанге сказаў гэтую прапісную ісціну з пазіцыі чалавека, які мае 40-гадовы стаж трэнерскай работы. Відавочна, што цяперашні прафесійны этап у жыцці нямецкага настаўніка не самы светлы. Тым не менш зменяная амаль на 100 працэнтаў беларуская каманда не ўнушае нейкага песімізму, не стварае ўражання, што беларускі футбол прыплыў да тупіка, адкуль не вынесе бурнае цячэнне. У Штанге, будзем рэалістамі, з самага пачатку было няшмат шанцаў, каб выйсці героем з «групы смерці». Зрэшты, у яго, як і ва ўсяго айчыннага футбола, яшчэ ёсць магчымасць паказытаць нервы нашым супернікам па адборачным цыкле. З улікам таго, што вымучаная харватамі хатняя перамога яшчэ не да канца адчыніла ім дзверы ў плэй-оф, заўтрашняя паспяховая дамашняя гульня беларусаў супраць украінцаў, якія напярэдадні дома перамаглі зборную Андоры 5:0, можа стаць фактычнай рэабілітацыяй Штанге перад беларускімі балельшчыкамі. Смог жа нямецкі трэнер у папярэднім адборачным цыкле да ЧЕ пасля сарамлівага паражэння ў Гомелі ад Люксембурга на фінішы турніру перайграць каманды Албаніі і Галандыі. Цяпер адлік барацьбы за захаванне рэпутацыі пачынаецца за тры матчы да завяршэння кваліфікацыйнага цыкла. А раптам удасца вельмі гучна грымнуць дзвярыма? Гэта ніяк не пашкодзіць для дасягнення наступных перамог.

Турнірнае становішча каманд у групе № 6.

Англія — 21 ачко (7 матчаў), Харватыя — 17 (8), Украіна — 14 (7), ***Беларусь — 9 (7)****, Казахстан — 3 (7), Андора — 0 (8).*

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.
Фота аўтара.

Мінск—Заграб—Мінск.

P.S. Рэдакцыя газеты «Звязда» выказвае вялікую ўдзячнасць асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» і асабіста яе старшыні Генадзю Мікалаевічу НЯВЫГЛАСУ за садзейнічанне журналісту ў падрыхтоўцы матэрыялаў з Харватыі.

Бернд Штанге прызнаў, што мэты не дасягнуў, але хоча рэабілітавацца ў матчы з Украінай

Паражэнне ад Харватыі пазбавіла беларусаў шанцаў выйсці ў фінал чэмпіянату свету-2010 па футболе, прызнаў на прэс-канферэнцыі настаўнік нацыянальнай зборнай Бернд Штанге. Напярэдадні сустрэчы з камандай Украіны 9 верасня ў Мінску, галоўны трэнер беларусаў заявіў, што яму ўдалося стварыць каманду, якая ў поўным складзе зможа ўдзельнічаць у наступным кваліфікацыйным адборы да Еўра-2012, дзе ў яе ёсць усе шанцы трапіць у фінал. Пасля апошняй гульні гэтага кваліфікацыйнага турніру Бернд Штанге будзе весці перамовы з кіраўніцтвам федэрацыі наконт свайго далейшага лёсу — нягледзячы на тое, што задача ў гэтым кваліфікацыйным адборы не выкананая, відаць, што ў трэнера ёсць жаданне працаваць з камандай далей, хоць ён сцвярджае, што пакуль пра гэта рана разважаць.

Бернд Штанге даў зразумець, што ён у курсе крытыкі і дыскусій у СМІ і інтэрнэце наконт уключэння ў склад лідараў беларускага футбола, у прыватнасці Аляксандра Глеба і Віталя Кутузава, маўляў, без гэтых гульцоў каманда гуляе лепей. І выказаў сваю пазіцыю: такія гульцы неабходныя нашай камандзе. «Наша задача — каб гэтыя футбалісты былі ў топ-форме — фізічнай і ментальнай, і ў такім стане выступалі за сваю краіну. Думкі пра тое, што трэба вывесці «зорак» са складу нацыянальнай каманды не прынясуць поспеху. Мне не ўдавалася атрымаць Глеба ці Кутузава ў аптымальнай форме. Гэтая занепакоенасць Кутузава, калі ён пераходзіў з каманды ў каманду, гэтая мітусня вакол Глеба... Цяпер Віталь стабільна гуляе ў серыі А, Глеб таксама ў выдатнай форме і выступае ў Лізе чэмпіёнаў. Такія гульцы вызначаюць наш узровень; хоць у гульні з Харватыяй нам удалося кампенсаваць іх адсутнасць, але мы не выйгралі», — падкрэсліў нямецкі спецыяліст. І дадаў: «Футбол — гэта не застолле, дзе п'юць каву з торцікамі. Гэта крытыка, тут непазбежныя канфлікты, яны здараюцца і ў нас, і мы іх вырашаем».

Перад матчам са зборнай Украіны Бернд Штанге ацаніў суперніка як каманду больш высокага класа. «Па якасці гульні апошніх гадоў узровень украінскага футбола нашмат вышэйшы за наш, у прыватнасці, прагрэсуе іх клубны футбол. Там мацнейшы ўнутраны чэмп

ЗДОЛЬНАЯ НА ВЫСОКУЮ АДДАЧУ

ЗЯМЛЯ ЛЮБАНСКАЯ

Матэрыялы нашага спецыяльнага выпуску з Любанскага раёна чытайце на 3-й і 6-й старонках.

12 верасня ў Любані пройдуць дажынкі хлебаробаў Мінскай вобласці. Любань невыпадкова выбрана месцам правядзення абласных дажынак. Сёлета ў Любанскім раёне ўпершыню сабралі ўраджай, агульны вал якога перавысіў 100 тысяч тон. Тут жа адзначым: акрамя Любанскага раёна, адзнаку ў 100 тысяч тон перасягнулі таксама Клецкі, Нясвіжскі, Мінскі, Слуцкі, Салігорскі і Валожынскі раёны.

У нашым сённяшнім спецыяльным выпуску, прысвечаным працаўнікам сельскай гаспадаркі Любанскага раёна, мы змяшчаем інтэрв'ю са старшынёй Акулічам, а таксама пандэнтаў пра тое, што ў дзвюх гаспадарках унітарным прадпрыемстве «Таль-агра» і вытворчым кааператыве «Рачэнь».

— Сабраны ўраджай — гэта наш важкі каравай у мінскую жытніцу.

Так сказаў падчас гутаркі пра вырашчаны ў раёне ўраджай старшыня Любанскага райвыканкама Васіль Акуліч.

— Васіль Іванавіч, мы ўжо ведаем, што такі добры ўраджай у вас упершыню. І гэта нягледзячы на як быццам бы неспрыяльны год...

— На надвор'е наракай, а сам не пазяхай. А ўвогуле, скардзіцца на надвор'е лягчэй за ўсё, хоць, можа, і сапраўды, гэты год для хлебароба быў не самы ўдалы. Вось і мы нямала на якія навацыі ішлі, каб убраць свой ураджай як мага лепш. А збажына і ў нас была і палеглая, і маладаступная. Зямля ж на Любаншчыне вядома якая, на многіх участках тарфяна-балоцістая. Словам, нярэдка даводзілася цягаць свае камбайны магутнымі трактарамі, пераабуваць камбайны ў шырокія колы...

І мы дабіліся жаданага выніку, выніку, які нас вельмі радуе, — намалацілі 105 тысяч тон. Упершыню перасягнулі 100-тысячную мяжу, да гэтага больш за ўсё бралі 95 000 тон. Праўда, тыя ж 104 000 тон былі ў нас і ў мінулым годзе, але гэта з зернем кукурузы, якога атрымалі летась 11 тысяч тон. І для параўнання яшчэ такая лічба: а напрыклад, у пазалеташнім годзе сабралі 60 тысяч тон збожжа. Словам, наперад рушылі вельмі істотна. І ўраджайнасць вельмі добрая — 35,6 цэнтнера з гектара. Для нашых земляў, бальнасць якіх складае 36,0, — гэта проста супер. Дарэчы, летась было 30,3 цэнтнера.

— Няйначай, на наступны год «заказалі» для сябе яшчэ большую вышыню?

— Ну вядома ж; заўсёды ж хочацца мець болей. Наша планка на наступны год — 115 тысяч тон.

— Гэты разлік, напэўна, не на голым месцы будуецца? Як не на голым месцы атрымалі і сёлетні ўраджай?

— Безумоўна. За апошнія гады нашы гаспадаркі вельмі добра аснасціліся ў тэхнічным плане. За 5—7, максімум за 10 дзён мы можам правесці сваёй тэхнікай усю сяўбу, яшчэ і іншым раёнам дапамагаем. Вельмі добра зрабілі, што купілі ў гэтым годзе, якраз да ўборачнай, 18 новых камбайнаў — нашых, гомсельмашаўскіх, найноўшай канструкцыі (камбайны серыі 1218). 12 з гэтых камбайнаў намалацілі збожжа больш за тысячу тон. Калі б не купілі іх, было б вельмі нялёгка правесці ўборку, нагрузка на камбайн у нас цяпер вельмі вялікая. Увогуле, за два гады 5 мільярдаў рублёў аддалі на тэхніку толькі з раённага бюджэту.

Далей. Вельмі вялікую ўвагу надаём тэхналогіі земляробства. Напрыклад, апошнім часам нацэльваем гаспадаркі на мінімальную апрацоўку глебы. Гэта прыносіць вельмі неблагія вынікі, што пацверджана і эксперыментальна — у нас жа, на нашых землях. У прыватнасці, там, дзе рабілі мінімальную апрацоўку глебы, усходы раслін былі і больш хуткімі, і лепшымі, і больш якаснымі. Для мінімальнай апрацоўкі глебы выкарыстоўваем так званыя дыскатары, якія мае кожная гаспадарка. Шырока прымяняем культываванне, чызеляванне глебы. Вялікую ўвагу надаём таму, каб у яе была ўнесена неабходная колькасць мінеральных угнаенняў, а яшчэ гяткая ж увага — апрацоўцы пасеваў ядахімікатамі. Прычым апошнія купляем толькі цэнтралізавана, пазбягаючы тым самым усякіх выпадковасцяў (каб не было так: хто з кім дамовіўся, і як мага танней).

І нарэшце, трэба вырошчваць тое, што лепей расце. У нас, у прыватнасці (і гэта ўжо дакладна вызначана) найлепшыя ўраджаі даюць трыцікале і пшаніца. Вось гэта і ёсць нашы асноўныя культуры. А яшчэ, вядома, кукуруза, якая вырошчваецца пераважна для кармавых мэтаў.

І яшчэ да ўсяго гэтага варта дадаць: і быў неаслабны пастаянны кантроль за гаспадаркамі. Прычым без прычыны не тузаем іх кіраўнікоў, а самі выязджаем на месцы. Па тое, як была арганізавана справа падчас уборачнай, пэўным чынам сведчыць такі факт: ужо ў 6 гадзін раніцы як раённае кіраўніцтва, так і кіраўніцтва гаспадарак былі на сваіх працоўных месцах. Ну, а доўжыцца працоўны дзень у сялян у гарачы летні час вядома дакуль: пакуль не сцямнее.

— Васіль Іванавіч, аднак мы ўсё неяк больш пра тэхналогію, няхай гэта і проста тэхналогія арганізацыі справы. Але ж, напэўна, і гэткая добрая ўпартасць палешука нямала значыла (і значыць). А любанскі край — гэта, вядома ж, Палессе...

— Так, наш край часам называюць краем балот і лясоў. І нездарма, хоць такое вызначэнне ўжо яўна і не адпавядае сённяшнім рэаліям, хутчэй, такім быў наш край раней. Дык вось, некалі менавіта ў нашым краі высаджваліся камунары, каб пераўтварыць яго, гэта значыць — меліяраваць. У Любані ёсць музей меліярацыі, у якім дэталёва пра ўсё гэта расказваецца. Там можна даведацца: на меліярацыі любанскага краю ставіліся не менш значныя рэкорды, чым тыя, якія ставіў данецкі шахцёр Стаханаў. У прыватнасці, чалавек мог за дзень выкапаць драўлянай рыдлёўкай да 250 кубаметраў зямлі, ці дакладней — тарфянога грунту. Словам, вось так тады пракладваліся каналы любанскай меліярацыйнай сістэмы.

І тая школа, тая загартоўка, якую мелі гэтыя людзі, засталася, няблага пачувае сябе і ў цяперашніх любанцах.

— Прабачце, перабіў вас вышэй... Ахарактарызуйце, калі ласка, і іншыя кірункі вытворчасці ў вашым раёне.

— Мяса-малочны кірунак — гэта, пры ўсёй важнасці вырошчвання збожжа, безумоўна, найбольш важны кірунак у нашых сельскіх працаўнікоў. Што мы тут на сёння маем? Пачну з таго, што сёння раён штодня плюсуе адзін кілаграм малака на карову. За год мы значна павялічылі пагалоўе буйной рагатай жывёлы — у прыватнасці, рост пагалоўя склаў 108 працэнтаў, гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў у вобласці. Наша задача — павялічыць рост прадукцыі жывёлагадоўлі яшчэ болей. Шлях да гэтага, па сутнасці, адзіны — у першую чаргу трэба і далей павялічваць пагалоўе. У раёне актыўна рэканструюцца старыя або закінутыя памяшканні, прызначаныя ў наступным для ўтрымання ў іх буйной рагатай жывёлы. За два гады прывялі такім чынам у парадак каля 50 памяшканняў. У СВК «Рачэнь» узводзіцца новая, сучасная малочнатаварная ферма на 600 галоў. У цэлым ставім задачу давесці ў раёне пагалоўе буйной рагатай жывёлы да 50 000 галоў (пры гэтым пагалоўе малочнага статку — да 16 000) і да 20 000 — свіней (дарэчы, для ўтрымання свіней мы не маем спецыялізаваных комплексаў). Гэту задачу можна і трэба выканаць. Наша асноўная мэта ў жывёлагадоўлі — мець 100 галоў буйной рагатай жывёлы на 100 гектараў сельгасугоддзяў. Гэта для нас (з улікам бальнасці нашых земляў) быў бы надзвычай выдатны паказчык. Застаецца да ўсяго гэтага дадаць: раён мае вельмі добрую кармавую базу. У нас той жа кукурузы, пра якую я ўжо ўзгадваў, пасеяна на плошчы 13 тысяч гектараў. А вымахала яна сёлета — было б заўсёды так, стаіць як лес.

ДЛЯ ДАВЕДКІ. Любань таксама мае няблага развітую прамысловасць: сыраробны завод, камбінат будаўнічых матэрыялаў, камбінат сілікатных блокаў, спіртзавод, крухмальны завод, швейную фабрыку. Сярод прамысловых прадпрыемстваў найбольш вызначаецца сыраробны завод, куды і накіроўваецца цяперашняе багатае любанскае малако. І не толькі з грамадскага сектара, але і з асабістых падворкаў, на належнае развіццё якіх у Любані звяртаюць самую пільную ўвагу. Па некаторых падліках, каля 20 працэнтаў малака, якое паступае на сыраробны завод, — гэта менавіта «прыватнае» малако.

— Васіль Іванавіч, такім чынам, у вас дажынкі. Ці гатовыя сустрэць гасцей як належыць?

— Рыхтаваліся вельмі сур'ёзна. Асабліва ў плане добраўпарадкавання: недзе паклалі плітку, новы асфальт, падрамантавалі тратуары, пасадзілі кветкі. Прычым ва ўсім гэтым удзельнічалі літаральна ўсе працоўныя калектывы. Любань проста не пазнаць, горад памаладзеў, стаў прыгажэйшым...

Думаю, што гасцям шмат што спадабаецца ў нас... У нас нямала калектываў мастацкай самадзейнасці — яны падрыхтавалі добрую канцэртную праграму. А ўвогуле ўсё, што падрыхтавана да гэтага добрага свята хлебаробаў, нават нельга і назваць — нейкія задумкі калектывы трымаюць у сакрэце: маўляў, убачыце на свяце.

Разлічваю, што раён як арганізатар абласных дажынак абавязкова патрапіць на рэспубліканскія.

— І апошняе пытанне: як адчуваюць сябе знакамітыя партызанскія зямлянкі на востраве Выслаў, у адной з якіх, дарэчы, выпускалася ў гады вайны і наша газета «Звязда» (для тых, хто не ведае, патлумачым: так званы востраў Выслаў знаходзіцца менавіта ў Любанскім раёне. У гады вайны ён быў акружаны непраходнымі балотамі — адсюль і назва «востраў» — і так і застаўся няскораным немцамі. Зразумела, востраў Выслаў стаў месцам размяшчэння партызанаў)?

— Сёлета, да Дня святкавання 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, мы, з фінансавай дапамогай вобласці, зрабілі рэканструкцыю зямлянак на гэтым востраве, абнавілі там літаральна ўсё. На ім жа правялі і само святкаванне, прычым да нас у раён прыязджалі госці з нашага расійскага горада-пабраціма Паўлаўскага Пасада, а таксама з іншых месцаў Маскоўскай вобласці. Мы ўсіх сваіх, хто хацеў, прывезлі на востраў. Вельмі цудоўнае свята атрымалася. Былі ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, былі «партызанскія» каша і хлеб, былі партызанскія песні.

— Вялікі дзякуй за гэты клопат, Васіль Іванавіч, і за гутарку. Выдатных поспехаў вашаму раёну і вам асабіста і надалей.

Своечасовую і якаснаю апрацоўку збожжа ў прыватным унітарным прадпрыемстве «Таль-агра» забяспечваюць з дапамогай высокапрадукцыйнага збожжасушыльнага комплексу. Галоўны аграном Галіна КАСЦЮКАВЕЦ і аператар збожжасушыльнага комплексу Васіль ПЯНЬКОЎСКІ — сярод тых, чыя добрасумленная праца памнажае поспехі калектыву.

«РОБІМ ЗВЫЧАЙНУЮ СЯЛЯНСКУЮ СПРАВУ»

Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Таль-агра»

Агульныя дасягненні раёна складваюцца з дасягненняў асобна ўзятых гаспадарак, гэтага тлумачыць не трэба... Гаспадарка «Таль-агра» — адна з тых, пра якую можна так сказаць: знаходзіцца на добрым уздыме, хоць, між іншым, кіраўнік гаспадаркі Іван Семянчук падчас сустрэчы так, даволі сціпла, гаварыў: «робім звычайную сялянскую справу». Сёлета тут сабралі небывалы для яе раней ураджай збожжавых — вал апошніх склаў 9100 тон пры ўраджайнасці 43 цэнтнеры з гектара (у мінулым годзе было 38 цэнтнераў).

Зусім нядаўна на збожжавых палетках гаспадаркі працавала ўборачная тэхніка. На сёлетнім жніве выдатна працавалі ўсе механізатары. Фотаздымкі знаёмяць нас з перадавым камбайнерам Віктарам МАРЦАВЫМ, яго памочнікам Іванам ЛАЗОЎСКІМ, вадзіцелем Андрэем КАШКО.

Дырэктар прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Таль-агра» Іван СЕМЯНЧУК.

— Гэта вельмі неблагія для нашых зямель паказчыкі, сярэдні бал урадлівасці якіх у нас складае 32, — кажа Іван Семянчук і са шкадаваннем дадае: — А маглі б мець у сярэднім і 50 цэнтнераў, але не вельмі паспрыяла гэтаму надвор'е, шмат якія ўчасткі добра падмачыла, нямала было палеглай збажыны. Тым не меней у цэлым задаволены вынікамі. Мяркуем яшчэ ад кукурузы атрымаць неблагую прыбаўку. Асноўная частка яе пасеваў, вядома, пойдзе на сілас для жывёлы, а разам з тым частка пойдзе і на зерне — апошняга, паводле разлікаў, павінны сабраць па 100 цэнтнераў з гектара...

Калі мы наведалі гаспадарку «Таль-агра», тут ужо закончылі ўборку збожжавых, і збожжаўборачная тэхніка перамясцілася на асабістыя падворкі, а таксама на палі іншых гаспадарак Любанскага раёна, на дапамогу. А ў «Таль-агра» даводзілі да належнай кандыцыі сёлетні багаты ўраджай, праганяючы яго праз сваю новую, зманціраваную ў гэтым жа годзе зернесушылку («Неблагая сушылка, прычым нашай жа, айчыннай, вытворчасці, лідская, — гаварыў кіраўнік, паказваючы сваю гаспадарку, — 40 тон у гадзіну сушыць; узялі ў лізінг»), уносілі ў глебу на адным са сваіх палёў даламітавую муку, рыхтаваліся да сяўбы азімых і ўборкі кукурузы, а таксама прыводзілі ў адпаведны парадак да асенне-зімовага стойлавага перыяду свае жывёлагадоўчыя фермы — тынкавалі, фарбавалі. Гаспадарка «Таль-агра» — мяса-малочнага кірунку з развітым раслінаводствам — так ахарактарызавалі яе асноўныя віды дзейнасці ў ёй самой. Асноўную масу прыбытку гаспадарцы прыносіць малако, рэнтабельнасць вытворчасці якога складае каля 20 працэнтаў. Адпаведна, вытворчасці малака — асноўная ўвага, што ўжо добра можна бачыць і па наступных лічбах: у мінулым годзе тут дадалі да сярэдніх надояў на карову 700 кілаграмаў і ўпэўнена выходзяць на 800-кілаграмовую прыбаўку сёлета. Як зазначаў кіраўнік гаспадаркі, павышэнню прадукцыйнасці малочнага статку (дарэчы, яго колькасць складае каля 1300 галоў) садзейнічаюць добра наладжаная селекцыйная і племянная работа, належная арганізацыя працы на фермах, наяўнасць выдатнай кармавой базы. Напрыклад, кармоў тут нямала засталося яшчэ з мінулага года, разам з тым добра папоўнілі гэту базу ўжо сёлета — сенажом са шматгадовых траў і канюшыны, сенам. Напарадзе, як зазначана вышэй, — уборка кукурузы, якая ўжо стала для нашых гаспадарак асноўнай кармавой культурай. Значную частку гэтай кармавой базы складаюць бабовыя, якія з'яўляюцца добрай крыніцай бялку. У гэтым жа годзе ў гаспадарцы купілі свой млын — з тым, каб рыхтаваць свае камбікармы. У сувязі з гэтым варта тут задаць пытанне: а чаму многія гаспадаркі гэтак актыўна наладжваюць вытворчасць уласных камбікармоў, калі ёсць у нас спецыялізаваныя прадпрыемствы? Адказ на гэта пытанне, па сутнасці, ляжыць на паверхні: як зазначалі ў «Таль-агра», а ці выгадна гэта — аддаць фуражнае збожжа на спецыялізаваны камбінат хлебапрадуктаў па 200 рублёў за кілаграм і атрымаць адтуль гэта ж збожжа, перапрацаванае на камбікорм, па цане 700 рублёў...

У «Таль-агра» дабіліся неблагой шчыльнасці буйной рагатай жывёлы з разліку на 100 гектараў сельскагаспадарчых угоддзяў (100 галоў). Усяго буйной рагатай жывёлы тут налічваецца 4700 галоў, пры гэтым за тры апошнія гады павялічылі яе колькасць на 1600. Тыя магчымасці, якія мае цяпер гаспадарка, яе кармавая база, дыктуюць ёй і далей ісці па шляху інтэнсіфікацыі жывёлагадоўлі. Так, цяпер у ёй прыводзяць у парадак свае старыя жывёлагадоўчыя памяшканні, якія па пэўных прычынах не былі задзейнічаныя раней, — з тым, каб павялічыць свой статак (у прыватнасці малочны) яшчэ на 400 галоў. Варта тут жа ўдакладніць: акрамя буйной рагатай жывёлы, у гаспадарцы вырошчваюць і свіней, праўда, гэты кірунак для яе не з'яўляецца вызначальным.

У «Таль-агра» апошнім часам істотна пераасэнсаваліся, абнавіўшы свой машынна-трактарны парк практычна на 50 працэнтаў. Тут з'явіліся новыя збожжаўборачныя камбайны, прычым як нашы, гомсельмашаўскія, так і нямецкія «Мега» і «Лексіён» (на розныя выпадкі ўраджайнасці і надвор'я), практычна ўвесь набор новай прычапной тэхнікі (пасяўной і іншай), новыя аўтасамазвалы МАЗ.

А яшчэ адным са складнікаў сваіх цяперашніх дасягненняў у «Таль-агра» называюць добрую, правільную расстаноўку кадраў. «І гэта, — падкрэсліваюць тут, — можа, самае галоўнае».

* * *

— А вы ведаеце, як часам называюць сябе па нацыянальнасці жыхары нашага галоўнага пасёлка — Талі? — спыталіся ў нас у гаспадарцы. — Так і называюць: «талюкі»...

На даўжыню каля 7 кіламетраў працягнулася гэта вёска, якая і стала цэнтрам гаспадаркі; толькі, напэўна, на Палессі і можна ў нас сустрэць такія вялікія вёскі; жыве ў ёй больш за тысячу жыхароў. Размясцілася яна амаль побач з Любанню, і амаль незаўважна для вока пачынаецца сам горад. У Талі свае крамы, свой Дом культуры, амбулаторыя... Вось толькі з лазняй пакуль што напружанне. Ці, хутчэй, такая сітуацыя: у механізатараў самой гаспадаркі лазня ёсць, а вось у астатніх... «Ужо праз месяц будзе лазня і для астатніх», — запэўніў кіраўнік гаспадаркі, паказваючы лазню «для ўсіх», у якой ішлі апрацоўчыя работы.

«Пасёлак Таль — гэта гонар нашай гаспадаркі», — яшчэ так зазначаюць тут. Ну, а самае прыцягальнае месца непасрэдна ў пасёлку — гэта, безумоўна, аграгарадок, які ўзведзены для працаўнікоў гаспадаркі. 35 прыгожых дамкоў утварылі тут свайго кшталту жылы квартал.

— Яшчэ 15 дамкоў узводзяцца непасрэдна побач з Любанню, — удакладняе Іван Семянчук. — Усё гэта за тры апошнія гады. У дамах — усе выгоды, акрамя, можа, газу, які, так ужо здарылася, неяк абышоў Любань... Калі меркаваць па гэтых узведзеных для працаўнікоў гаспадаркі дамах, амаль на трэцюю частку абнавіўся апошнім часам яе склад. Сярэдні ўзрост нашых працаўнікоў — 38 гадоў...

Зразумела, індывідуальныя дамы з неабходнымі гаспадарчымі пабудовамі ўзведзены за кошт гаспадаркі, за крэдытныя грошы. Толькі адных працэнтаў за гэтыя крэдыты ў ёй штомесяц выплачваюць па 20 мільёнаў рублёў. Прынцып валодання гэтым жыллём — наступны: ты ў ім жывеш, пакуль у гаспадарцы працуеш. У поўную ўласнасць яно пераходзіць толькі пры выхадзе на пенсію ці пры яго выкупе. Прычым гэты прынцып дзейны ў дачыненні да ўсіх, без выключэння, у тым ліку і да прадстаўнікоў вясковай інтэлігенцыі.

Каб дапоўніць гэты свайго кшталту сацыяльны партрэт гаспадаркі, няхай і зусім невялікі, адзначым таксама: сярэдняя заработная плата ў ёй за апошнія месяцы склала каля 760 тысяч рублёў.

* * *

Падчас наведвання гаспадаркі «Таль-агра» мы пазнаёміліся з яе асобнымі прадстаўнікамі, чыімі рукамі і фарміруюцца тыя ж дасягненні. Маці і дачка Таццяна і Надзея Лаўрыені працуюць даяркамі на малочнатаварнай ферме. «Гэта адны з нашых лепшых працаўніц, маюць добрыя надоі, — сказаў, знаёмячы з імі, кіраўнік гаспадаркі. А яшчэ дадаў: — Жывуць у адным з тых прыгожых дамкоў, але ўжо трэба выдзяляць ім яшчэ адзін — сям'я выросла...». Статак пасвіўся, і на ферме панавала зацішша, тым не менш, маці і дачка Лаўрыені знайшлі сабе працу і ў гэты ціхі для іх час — яны тынкавалі памяшканне, ім дапамагала яшчэ адна прадстаўніца іх дружнай сям'і.

Перакваліфікавалася на гэты дзень у маляра-тынкоўшчыка і загадчыца фермы Таццяна Бортнік. Падчас размовы яна зазначыла, што цяпер асаблівая ўвага жывёлаводаў гаспадаркі надаецца таму, каб у малако не трапілі антыбіётыкі, на фермах гаспадаркі пастаянны кантроль за малаком ажыццяўляюць лабаранты.

Васіль Пянькоўскі зусім нядаўна скончыў БАТУ, а сваю працоўную кар'еру пачаў з працы на зернесушыльным комплексе. «Зразумела, гэта пакуль што, комплекс не такі ўжо і просты, нятанны, і трэба, каб за ім прыглядалі добрыя спецыялісты, з адукацыяй», — патлумачыў кіраўнік гаспадаркі.

Можа, адны з самых галоўных у раёне герояў збожжаўборачнай гарачай пары — камбайнер Віктар Марцаў і памочнік Іван Лазоўскі, якія намалацілі на сваім «Лексіёне» больш за дзве тысячы тон і ўжо маюць перамогу на прамежкавым этапе — на «дыстанцыі» тысяча тон. Віктар Марцаў, як ён сам расказаў, некалі пераехаў сюды з Магілёўскай вобласці ды так назаўсёды і прырос да любанскай зямлі. Дарэчы, у Віктара Марцава высокія дасягненні ва ўборачнай былі і раней. За адно з такіх дасягненняў ён атрымаў вялізны, вагой кілаграмаў пад 20, хрустальны кубак. Але той кубак (няйначай, з-за яго масіўнасці і памераў) пакінуў у канторы гаспадаркі. Там ён цяпер і стаіць.

Нельга не сказаць тут колькі слоў і пра кіраўніка гаспадаркі Івана Семянчука, які стаў на чале яе крыху больш за тры гады таму. Гэта менавіта пад яго кіраўніцтвам гаспадарка за гэты час так добра рушыла наперад.

* * *

Не так лёгка на любанскай зямлі ўзяць багаты ўраджай. У «Таль-агра» зазначалі: гаспадарка мае 30 працэнтаў меліяраваных зямель; цяжкая, тарфяністая глеба ў ёй часта мяжуе з лёгкай пясчанай. Пры такіх умовах трэба вельмі дакладна разлічыць, дзе што сеяць. Па сутнасці, такія разлікі нямала паўплывалі і на цяперашнюю важкасць ураджаю. А пры гэтым заглядваюць у гаспадарцы яшчэ далей: ужо эксперыментальна, на асабістых падворках, даказана, што на асобных участках можна здымаць і па 80 працэнтаў з гектара. «Вось толькі неяк менш запатрабаваным стала сёлета збожжа, — непакоіцца ў «Таль-агра», — з меншай ахвотай сёлета яго купляюць. Ды і цэны на ўсё растуць (на мінеральныя ўгнаенні ў два разы выраслі), а на збожжа — цана такая ж, як і раней».

Непакой цалкам зразумелы. Вясковы працаўнік шчыруе круглы год, а канчатковы вынік бачыць усяго адзін раз за ўвесь гэты год. Вось і непакоіцца за тое, каб і фінансавы вынік быў гэткім жа важкім, як і вырашчаны яго рукамі і намаганнямі ўраджай.

УНП 690280931.

На малочнатаварнай ферме «Касцюкі»: загадчыца фермы Таццяна БОРТНІК, аператары Таццяна і Надзея ЛАЎРЫЕНІ; адзін з клапатліва ўпрыгожаных куточкаў вытворчай тэрыторыі.

* * *

Новая вуліца пасёлка Таль.

ШУКАЙЦЕ ІНВЕСТАРА!

Многія раённыя гасцініцы мараць не пра зоркі на шыльдах, а пра гарачую ваду. А лазня ў адным з райцэнтраў паставіла антырэкорд: прыбіральня — толькі на вуліцы.

Гасцініцы ды лазні вывучылі спецыялісты КДК Магілёўскай вобласці. Калегія камітэта абмеркавала развіццё сферы паслуг у рэгіёне.

Ці ёсць перспектыва аказання паслуг на сусветным узроўні? Сёння гэта зусім не пустое пытанне, лічаць у КДК: у крызіс паслугі, арыентаваныя на экспарт, могуць даць прыбытак. Праўда, пакуль не ў нас.

Толькі дзясятая частка ад кліентаў **гасцініц Магілёўшчыны** — замежнікі, прычым пераважна з краін СНД. Тры зоркі мае толькі адна гасцініца вобласці: «Турыст» у Бабруйску, пабудаваная да «Дажынак». Астатнія — альбо невялікія прыватныя пабудовы на дзясятак месцаў, альбо савецкая спадчына з мноствам праблем.

Прыбіральні на калідоры і адсутнасць гарачай вады — гэта сёння рэалії раённых гасцініц. Не ўсе яны маюць грамадскае харчаванне, арганізаванае на належным узроўні. Толькі трэць гасцініц маюць аўтастаянкі, а лазні, басейны, спартыўна-забаўляльныя аб'екты, канферэнц-залы і ўмовы для бізнэсменаў — гэта выключная рэдкасць.

У справаздачы КДК адзначана: няма сістэмы ў развіцці гасцініц як галоўнага складніка турызму, а работнікі — ад пакаёвак да дырэктараў — маюць уяўленне пра гасцініцы як выключна пра часовыя дах і ложак для камандзіраванага.

Гэта не адзінкавы давялося адчуць на сабе супрацоўнікам КДК, якія часта ездзяць у камандзіроўкі. Таму калекцыя слайдаў у якасці ілюстрацыі да справаздачы робіць уражанне: латаныя дзверы, паламаная мэбля, скошаныя шафы, няспраўныя лямпы, абарваныя шпалеры, драныя прасціны.

Самай заняпалай названа гасцініца ў Чавусах. Раённыя ўлады прызнаюць: выдаткоўваць сродкі на капітальны рамонт старога будынка — неразумна. У Чавусах плануюць зрабіць рэканструкцыю пад гасцініцу іншага, больш дастойнага будынка: райцэнтр, які месціцца за 40 кіламетраў ад Магілёва, разумее свае перспектывы як месца для адпачынку турыстаў, што прыязджаюць на Магілёўшчыну. Праект гатовы, але нестае сродкаў, якіх патрабуецца аж 2,7 мільярда рублёў.

Няма дастойнай гасцініцы ў Слаўгарадзе. Калі летась адзначалася 300-годдзе бітвы пад Лясной, у раёне пабудавалі шмат, але да гасцініцы справы не дайшлі. Госці, якія прыязджалі на свята, размяшчаліся ў абласным цэнтры. Між тым, менавіта гэты раён мае шанцы на развіццё турызму: не толькі гістарычныя месцы прыцягваюць людзей, але і выбітны помнік культуры — Блакітная крыніца.

Затое ў Магілёве з'явіцца ў найбліжэйшай перспектыве 7 невялікіх прыватных гасцініц, некаторыя з якіх будуць разлічаны на абслугоўванне турыстычных груп: 40 месцаў — як у аўтобусе. Хоць сёння загрузка тых гасцініц, якія ўжо ёсць у абласным цэнтры, складае толькі 62 %. Нават адрамантаваны і па-сучаснаму абсталяваны 7-ы паверх самай буйной гасцініцы «Магілёў» загружаны меней чым напалову.

Можа, кліентаў будзе болей, калі ў Магілёве з'явіцца свой аквапарк? ***Намеснік старшыні Магілёўскага гарвыканкама Уладзімір ЦІТОК*** заявіў, што вядуцца перамовы з літоўскай кампаніяй, і хоць яны зацягнуліся ў сувязі з крызісам, але надзея ёсць.

Пакуль што, акрамя традыцыйных **лазневых паслуг**, у абласным цэнтры можна толькі атрымаць масаж пад вадой. Спецыялісты КДК лічаць, што лепшы Магілёўскі лазнева-аздараўленчы комплекс у параўнанні з расійскімі, турэцкімі і егіпецкімі аналагамі прайграе абсалютна. На пасяджэнні калегіі прысутных знаёмілі з такімі паслугамі, як японская лазня, турэцкі хамам, талаcатэрапія, фітапарасаўна, лаконіум і шмат іншым.

Яны маюць мудрагелістыя назвы, але папулярныя ва ўсім свеце. Менавіта таму развіццё комплексаў — не проста дзеля мыцця, але аздараўлення і расслаблення — з'яўляецца сёння асноўнай тэндэнцыяй развіцця сферы паслуг, сродкам прыцягнення турыстаў. І не дзе-небудзь на далёкім Захадзе, але ўжо ў абласных і раённых цэнтрах памежнай Расіі.

У беларускіх райцэнтрах народ пакуль не марыць пра лазневыя палацы кшталту кітайскіх, а спадзяецца на чысты тазік і духмяны венік. Але і гэта ёсць не заўсёды, паведамілі ў справаздачы КДК. У лазнях Крычава немагчыма набыць венік, мыла і мачалку. У магілёўскіх лазнях няма каналізацыйных трапаў у распранальнях, ад чаго ёсць пастаянны застой вады і антысанітарыя.

А ў Асіповічах у адной з лазняў няма ў будынку прыбіральні, калі ёсць патрэба — калі ласка, у дамок на двары. Спецыялісты КДК не адразу паверылі, што такое ўвогуле можа быць, але тэлефанаванне кліентаў гэтай лазні на «гарачую лінію» зусім не жарт. Прычым гэта аварыя бывае не тыдзень ці месяц, а яе проста ніколі не было!

Добры спосаб паправіць становішча ў лазнях знайшоў ***намеснік старшыні КДК Беларусі Аляксандр АГЕЕЎ***: стаць кліентамі лазняў, на якія скардзяцца людзі кіраўнікам гарадоў і раёнаў.

Але ўсё ж асноўная праблема, пра якую распавядалі прадстаўнікі з месцаў, — гэта недахоп сродкаў на рамонт і іх адсутнасць на капітальнае пераўтварэнне цяперашніх лазняў ці пабудовы новых. Падобна, як і з гасцініцамі.

Скаргі на безграшоўе далі падставу рэзкай крытыцы з боку ***намесніка старшыні Магілёўскага аблвыканкама Віктара НЕКРАШЭВІЧА***:

— Гэта дэманструе ўтрыманства і інертнасць. У асноўным калегі з раёнаў канстатуюць, што справы дрэнныя. Потым лічаць, колькі патрэбна грошай на выпраўленне. І затым едуць у вобласць з мехам для атрымання сродкаў. Трэба ісці іншым шляхам — самім шукаць інвестараў і магчымасці!

— Трэба пераадолець стэрэатып мыслення і ўбачыць перспектыву, — параіла ***старшыня КДК Магілёўскай вобласці Лілія ЧЫГІР***. — Варта звярнуць пільную ўвагу на сектар паслуг: пераасэнсаваць, вывучыць сусветны вопыт, скласці дакладныя планы і рабіць. Таму што менавіта гэты сектар не толькі зробіць жыццё нашых людзей больш камфортным, але дасць магчымасць прыцягнуць турыстаў і зарабляць грошы.

Ілона ІВАНОВА.

ХУТКА, ДАЖДЛІВА І... БЯСПЕЧНА!

«Асцярожна, дзверы зачыняюцца, наступны прыпынак — «Аэрапорт Мінск-1». Звычайна паўпусты напрыканцы маршруту аўтобус № 100 на гэты раз пад'язджаў да канцавога прыпынку запоўнены маладымі хлопцамі і дзяўчатамі... У суботу, 5 верасня, на тэрыторыі аэрапорта «Мінск-1» прайшоў этап Адкрытага Чэмпіянату Беларусі па драгрэйсінгу BURN RACING.BY.

Аэрапорт сустракаў гледачоў імжой. Бліжэй да 11 гадзін, час афіцыйнага пачатку мерапрыемства, яна ператварылася ў сапраўдны ліўень. Чарга з парасонаў большала з кожнай хвілінай, іншыя хаваліся на прыступках аэраваксала. Пасля гадзіны чакання першыя гледачы змаглі трапіць на тэрыторыю мерапрыемства. Праўда, для гэтага даводзілася праходзіць ажно праз тры пасты службаў бяспекі. А вось уваходныя білеты, за якія былі аддадзены не зусім і малыя грошы, так за цэлы дзень ніхто і не правяраў. Па словах арганізатараў, каб было добрае надвор'е, то ўсё было б больш строга.

Што кідалася адразу ў вочы, дык гэта машыны, выстаўленыя на конкурс па цюнінгу. Шкада, што такіх не ўбачыш на вуліцах нашай краіны, жыццё было б цікавейшым! Дарэчы, пераможцам конкурсу стаў госць з Масквы. Ну і, безумоўна, цяжка было не заўважыць дзяўчат, выклікаюча апранутых (ці, больш дакладна, распранутых), якія рэкламавалі спонсараў мерапрыемства. Думаю, эфект ад такой рэкламы, асабліва сярод мужчынскага насельніцтва, будзе значны...

Парадавала, што многія людзі прыходзілі цэлымі сем'ямі. А з якім захапленнем малыя хлопчыкі глядзелі на дарослых дзядзькаў на матацыклах і за рулём аўтамабіля! Магчыма, хтосьці з гэтых дзяцей пад уражаннем убачанага зоймецца аўтаспортам і стане калісьці, напрыклад, першым беларусам у Формуле-1! (а чаму б і не!)

Народ паціху напаўняў імправізаваныя трыбуны, прабіраючыся цераз перашкоды ў выглядзе лужаў, а дождж сціхаць і не думаў. Арганізатары нервова пазіралі на неба і сачылі за гадзіннікам, а выратоўваць сітуацыю ўзяліся мінскія майстры стант-райдынгу (выкананне неверагодных трукаў на матацыкле). Пад праліўным дажджом гэта глядзелася яшчэ больш нерэальна! Здавалася, што бачыш трэйлер галівудскага фільма ці эпізод з камп'ютарнай гульні.

Чаго ў беларусаў не забярэш, дык гэта цярпенне, за некалькі гадзін чакання колькасць гледачоў не толькі не паменшылася, а наадварот — павялічылася! Няўжо паспелі пад'ехаць тыя, да каго дайшлі чуткі, што білеты ніхто не патрабуе?.. І гледачы былі ўзнагароджаны за ўстойлівасць! Хмаркі сышлі, трошкі пасвятлела, нават на некаторы час выглянула і сонейка. На ўзлётную паласу аэрапорта выехаў рарытэтны грузавік 1954 года з самалётнай турбінай на сабе. З дапамогай гэтага механізма з гоначнай трасы здзьмуваліся рэшткі вады. Найбольш не пашанцавала гледачам на VIP-месцах, дзьмула акурат ў іх бок. Палатку даводзілася трымаць усім натоўпам!

Яшчэ некалькі хвілін — і ўсе дачакаліся таго, дзеля чаго сабраліся, — першая пара бліскучых аўтамабіляў выйшла на старт. Шкада толькі, што з-за надвор'я так і не атрымалася ўсталяваць электроніку, і час, які паказвалі ўдзельнікі, фіксаваць не атрымоўвалася. Так што спартсмены парадавалі гледачоў толькі паказальнымі заездамі. Прычым пераможцу з вялікай верагоднасцю можна было выявіць да старту. Той, хто ехаў па больш сухім асфальце, атрымоўваў вялікую перавагу. Так што абяцаных рэкордаў не атрымалася, але было шмат цёплых эмоцый і добрага настрою! А што яшчэ так яднае людзей, як не адзін парасон на дваіх! Разыходзіліся ўсе задаволеныя і большасць без пачуцця змарнаванага часу... Наступная сустрэча 26 верасня ў Лагойску!

Яўген ВАРАКСА, фота аўтара.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Драгрэйсінг — гонка на 402, або 804 метры на прамой трасе, у якой удзельнічае два аўтамабілі альбо матацыклы. Пачынае сваю гісторыю ў Амерыцы 20-х гадоў XX стагоддзя, там на высахлым возеры Махаве, што ў Каліфорніі, былі праведзены першыя неафіцыйныя гонкі. Бурнае развіццё драгрэйсінг атрымаў ужо ў пасляваенныя гады. Рэвалюцыя ў амерыканскім аўтапраме зрабіла аўтамабілі больш даступнымі шматлікай моладзі, прадстаўнікі якой актыўна пачалі канструяваць гоначную тэхніку. У Еўропе першыя крокі драгрэйсінга былі зроблены ў Англіі ў 30-х гадах. На сёння міжнародная асацыяцыя драгрэйсінга аб'ядноўвае мільёны пілотаў, у ЗША кожны год праходзіць чэмпіянат свету, які складаецца з 24 этапаў.

У Беларусі першыя нелегальныя гонкі прайшлі на пачатку гэтага стагоддзя, а з 2006 года ўжо пры падтрымцы Беларускай аўтамабільнай федэрацыі праводзіцца чэмпіянат Беларусі па драгрэйсінгу.

Тэхагляд фальшывы — штраф рэальны

Выпадкі выяўлення падробленых штампаў аб праходжанні дзяржтэхагляду сустракаюцца не так ужо часта, аднак і гаварыць пра тое, што іх і зусім няма — таксама нельга. Не так даўно адна газета размясціла на сваім сайце матэрыял пад загалоўкам «Прошел техосмотр не на станции — уголовная ответственность». У артыкуле гаварылася пра тое, што беспрацоўны жыхар Віцебска прыдумаў «цікавы» бізнэс: за пэўную суму падробліваў сертыфікат аб праходжанні тэхагляду з усімі неабходнымі штампамі. Задаволенымі заставаліся і аўтаўладальнікі, і «бізнэсмен». Вось і была кату масленіца, пакуль аферу не раскрылі супрацоўнікі праваахоўных органаў. Беспрацоўны расказваў следству, што грошы перадаваў службовай асобе УП «Белтэхагляд». Падчас следства высветлілася, што грошы нікому з супрацоўнікаў прадпрыемства не перадаваліся, а заставаліся ў кішэні махляра.

Свой адказ на ўзнятае ў СМІ пытанне дало УП «Белтэхагляд» сумесна з супрацоўнікамі спецпадраздзялення ДПС «Страла», упраўленнем ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

...Раніца. Масюкоўшчына. Аўтаўладальнікі спяшаюцца на рынак у Ждановічы. Інспектар спецпадраздзялення «Страла» спыніў «Форд». Пакуль аўтаўладальнік прад'яўляў дакументы для праверкі, супрацоўнік УП «Белтэхагляд» Аляксандр Казлоў клікаў мышшу па маніторы ноўтбука.

— Я праверыў сапраўднасць штампа ў сертыфікаце, — гаворыць Аляксандр. — Дастаткова ўнесці рэгістрацыйны нумар аўтамабіля ў нашу інфармацыйную базу. Некалькі секундаў — і мы ўжо ведаем, калі і дзе аўтамабіль праходзіў дзяржтэхагляд. Калі звестак пра аўтамабіль зусім няма, а штамп у сертыфікаце стаіць, тады і ўзнікаюць пытанні наконт таго, ці сапраўдны ён.

Як высветлілася, «Форд» не быў на дыягнастычнай станцыі з 2004 года. То не было часу, то аўтамабіль не быў дастаткова падрыхтаваны. Аўтаўладальнік ведаў пра тое, што за не пройдзены своечасова дзяржаўны тэхнічны агляд можна атрымаць штраф у памеры да дзвюх базавых велічыняў. На першы раз інспектар зрабіў аўтаўладальніку папярэджанне.

За час правядзення сумеснага рэйду інспектары спынілі некалькі дзясяткаў аўтамабіляў, аднак ніводнага падробленага штампа не выявілі.

— Калі гаварыць толькі пра легкавыя аўтамабілі, то тыя, якія выкарыстоўваюцца для камерцыйных перавозак пасажыраў, павінны праходзіць дзяржтэхагляд не пазней чым праз шэсць месяцаў пасля правядзення апошняга дзяржтэхагляду, — патлумачыў спецыяліст УП «Белтэхагляд» Валерый Жалезны. — Легкавыя аўтамабілі, з года выпуску якіх прайшло дзесяць і больш гадоў, уключаючы год выпуску — адзін раз у год. Аўтамабілі, з года выпуску якіх прайшло менш як дзесяць гадоў, павінны праходзіць дзяржтэхагляд адзін раз у два гады. Не ўсе праходзяць дзяржтэхагляд з першага разу. Некаторыя прыязджаюць на паўторны тэхагляд. Як бы там ні было, прасцей падрыхтаваць аўтамабіль, прайсці тэхагляд і ездзіць са спакойнай душой, не робячы ніякіх падробленых штампаў!

Двухдзённы рэйд паказаў, што выпадкі падроблівання штампа ў сертыфікаце аб праходжанні дзяржаўнага тэхнічнага агляду — з'ява рэдкая. Умельцаў, якія зарабляюць грошы, арганізоўваючы злачынны бізнэс, знаходзяць і караюць.

Алена ПРАКАПЕНЯ, УП «Белтэхагляд».

На слыху

КАСУЛІ ЗА... 42 МІЛЬЁНЫ

Жыхар Пінска ноччу каля в. Альшанка застрэліў дзве еўрапейскія казулі, хоць дазволу на адстрэл не меў.

А цяпер браканьеру давядзецца выплаціць дзяржаве штраф у памеры 42 000 000 рублёў.

ЗА ЎСЁ ТРЭБА ПЛАЦІЦЬ!

Брэсцкі прадпрымальнік запрасіў да сябе на кватэру па вул. Крывашэіна дзвюх няпоўнагадовых вучаніц СШ, якія знаходзіліся ў яго з 11 гадзін раніцы да ночы.

А затым прадпрымальнік заявіў у міліцыю, што нехта ў яго ўкраў залаты ланцужок на паўмільёна.

Вучаніц затрымалі. Толькі што няпоўнагадовыя рабілі да ночы ў 43-гадовага мужчыны?

КАРОВА ЎСПУДЗІЛАСЯ — ГАСПАДЫНЯ ПАМЕРЛА

У Баранавіцкай бальніцы памерла 75-гадовая жанчына з в. Малыя Лукі.

Гаспадыня вечарам пайшла даіць сваю карову. Рагуля па нейкая прычыне ўспудзілася і цяжка траўмавала жанчыну. У бальніцы параненая праляжала 24 дні.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЗАГІНУЎ У КАЛЕКТАРНЫМ КАЛОДЗЕЖЫ

Работнік аднаго будаўнічага трэста Мінска смяротна траўмаваны пры падзенні ў калектарны калодзеж у Ленінскім раёне сталіцы.

Як паведамілі рэдакцыі ў РАУС Ленінскага раёна горада, здарэнне адбылося на вуліцы Маякоўскага, дзе брыгада рабочых ажыццяўляла рэканструкцыю моста цераз раку Лошыцу. У гэты вечар, пасля працоўнага дня, будаўнікі адпачывалі ў вагончыку, дзе і распівалі спіртное. Адзін з іх пакінуў бытоўку, каб падыхаць свежым паветрам, але ў выніку трапіў у калектарны калодзеж і загінуў. Заезд пракуратура раёна сталіцы ажыццяўляе праверку па факце гібелі будаўніка.

Сяргей ПАЛІНІН.

ЛЮБІЎ КАВУ З КАНЬЯКОМ, А ПРАЦАВАЦЬ НЕ ЛЮБІЎ

23-гадовы брастаўчанін. Таму ў краме «Брэст-сэрвіс» на ўскраіне горада ўкраў 5 бутэлек канькяку і 12 бляшанак кавы. Але неўзабаве быў затрыманы нарадам «Аховы». Адказнасць грамадзяніну пагражае сур'ёзная, тым болей, што ён ужо меў праблемы з законам з-за крадзяжу.

Яна СВЕТАВА.

СВАЙГО Ж ХАПАЕ!

На аўтамагістралі каля в. Чарняны Маларыцкага раёна памежнікі і міліцыянеры затрымалі «Мазду-323», на якой жыхар Мінска перавозіў трыкатажныя вырабы і абутак. На імпартны тавар коштам больш як 72 млн рублёў дакументаў не было.

У гэтым жа раёне, але каля в. Гайнаўка тармазнулі і прадпрымальніцу з Гродна з імпартным абуткам і адзеннем на 61 мільён рублёў. Тавар канфіскавалі.

УЗЯЎ І ПРАДАЎ

Сустрэліся два жыхары Брэста, каб аформіць здзелку — адзін прадаваў «Мерседэс», а другі купляў. Пакупнік шляхам ашуканства завалодаў аўтамашынай коштам 10 тыс. доларaў, а затым па фальшывай даверанасці прадаў яе і грошы паклаў сабе ў кішэню.

Машыну знайшлі, а ашуканца... не.

ЗЛАШЧАСНАЯ ПЕРАДАЧА

Непадалёк ад Брэста знайшлі мёртвага механізатара ААТ «Будтрэст». Пры запуску рухавіка пагрузчык стаяў на перадачы. Рухавік завёўся і пагрузчык наехаў на 45-гадовага механізатара.

УТАПІЎСЯ?

У меліярацыйнай канаве, якая знаходзіцца побач з в. Аснежыцы Пінскага раёна, знайшлі труп пастуха ААТ «Аснежыцкае».

Ніякіх прыкмет гвалту на целе мёртвага не выяўлена. Вядзецца праверка.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ПАДЗЯКА ЗА СЛУЖБУ І БУЛЬБУ

У аддзеле Дэпартамента аховы Кастрычніцкага раёна Магілёва ва ўрачыстых абставінах атрымалі афіцыйныя падзякі чатыры супрацоўнікі. Капітана міліцыі Аляксандра Сідарэнку, маёра Віталя Церашкова, прапаршчыка Юрыя Карабоўскага і сяржанта Дзяніса Нікалаенку адзначылі за вяртанне сельскай гаспадарцы амаль тоны скрадзенай з поля бульбы і затрыманне зладзеяў.

23 жніўня ўначы ў аддзел аховы паступіла інфармацыя ад вартаўніка фірмы «Вейна» пра тое, што нейкія людзі на полі самавольна капаюць бульбу. Група затрымання разам са службовым сабакам спыніла «харчовы абоз» — дзве фурманкі з 25 мяхамі бульбы, а потым затрымалі і шасцярых удзельнікаў несанкцыянаванай копкі, якія разбегліся ўначы.

За аператыўныя дзеянні супрацоўнікі аховы атрымалі падзякі ад начальніка Магілёўскага абласнога ўпраўлення Дэпартамента аховы Аляксандра Ракусава і кіраўніцтва фірмы «Вейна».

Ілона ІВАНОВА.

ПАРУШАЛЬНІКУ — ГРАМАДСКІЯ РАБОТЫ

За незаконную здабычу рыбы ў перыяд забароны на яе лоўлю, здзейсненую паўторна на працягу года, Мінскі гарадскі суд прызначыў браканьеру пакаранне ў выглядзе грамадскіх работ тэрмінам на 240 гадзін.

За падобнае правапарушэнне і нанясенне прыродным рэсурсам урону ў буйным памеры па рашэнні Рагачоўскага суда іншы аматар «рыбалкі» мусіць заплаціць штраф у памеры 3,5 мільёна рублёў, а таксама кампенсаваць урон на суму, большую за 3,1 мільёна рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Газетны серыял: «У пошуках Новай зямлі»

СЕРЫЯ ТРЭЦЯЯ. ДОМ З ПРЫВІДАМІ

Дарога на хутар.

Скарочаны змест папярэдніх серый: **Тры маладыя хлопцы, Косця КІШКІН, Аляксей КУРБАТ і Павел КУДРЭВІЧ, вырашылі заняцца аграэкатурызмам («Звязда» 17.06.09). Журналістка дамовілася з імі, што будзе асвятляць на старонках газеты іх крокі на шляху да мэты. Спярша хлопцы сустрэліся з некалькімі гаспадарамі вясковых міні-гасцініц, якія ўжо даўно і ўдала працуюць. Адны з іх казалі, што пачынаць гэты бізнэс запозна, іншыя — што ў самы час. Ад падпісчыцы «Звязды» з Мядзельскага раёна паступіла прапанова хлопцам задарма скарыстацца паловай фінскага дамка на ўскрайку вёскі, каб без затрат паспрабаваць свае сілы. Шукальнікі Новай зямлі абяцалі падумаць, але спачатку яны паехалі глядзець пустыя дамы на Капыльшчыне («Звязда» 08.08.09). Пачаць пошук у гэтым раёне параіла намеснік начальніка ўпраўлення па спорце і турызме Мінскага аблвыканкама Алена БРОК. У Капыле хлопцаў гасцінна сустрэлі ў райвыканкаме і паказалі некалькі дамоў, сярод якіх былі «безгаспадарны» і «на продаж». Абодва падаліся не вельмі прыдатнымі для таго, каб запрашаць туды турыстаў. Аднак гэта не ўсё. У сённяшняй «серыі» будзе расказана пра іншыя патэнцыйныя аб'екты для аграэкатурызму бліз Капыля.**

Рэшткі шчаслівых часоў

— Я ведаю, што вам трэба, — сказала **старшыня Капыльскага сельскага Савета Вольга КУПРЫЕНКА**. — Ёсць у нас у вёсцы Дусаеўшчына кінуты ФАП, ён знаходзіцца ў аддаленні ад жылых дамоў, на беразе вялікага возера з востравам. Там вельмі прыгожа. Для адпачынку гэта месца падыдзе ідэальна.

Едзем. Вёска Дусаеўшчына да 30-х гадоў называлася Рым'е. Пра гэта пазней расказаў **мясцовы жыхар Іосіф ПАЎЛЮКЕВІЧ**. А вось у інтэрнэце можна знайсці звесткі пра паданне, якое існавала ў Дусаеўшчыне да паловы мінулага стагоддзя. Згодна з ім, рос у гэтых мясцінах Змееў Дуб — дрэва, на якое сеў змей і якое людзі спалілі разам з пачварай. На тым месцы, казалі старыя, утварыўся курган. Ля вёскі і насамрэч ёсць два курганныя могільнікі X—XII стагоддзяў, і адзін з іх знаходзіцца за 2,5 кіламетра на поўнач, ва ўрочышчы, якое называецца Змяінец.

Іосіф Паўлавіч Паўлюкевіч не можа сказаць, чаму вёска была перайменавана, аднак новая назва супала з утварэннем тут знакамітага племзавода па вырошчванні спачатку племянных чорна-стракатых кароў. Пазней, у 70-х, селекцыянерам Дар'яй Зубковай тут была выведзена беларуская чорна-стракатая парода свіней, якая адрозніваецца хуткім ростам, добрай пладавітасцю, здароўем і ўстойлівасцю да стрэсаў.

Гаспадарка падпарадкоўвалася Рэспубліканскаму трэсту племянных заводаў, цяпер — Беларускаму дзяржаўнаму аб'яднанню па племянной жывёлагадоўлі. Калісьці людзям тут жылося вельмі добра. Пра былы росквіт сведчыць, напрыклад, штучнае возера з маляўнічым востравам пасярэдзіне і мостам, прычым, натуральнае возера ў Дусаеўшчыне таксама ёсць. ФАП на супрацьлеглым ад вёскі беразе — яшчэ адзін сумны знак «залатога веку» племзавода.

Фельчарска-акушэрскі пункт быў пабудаваны не так і даўно — напрыканцы 80-х. Двухпавярховы будынак з белай цэглы ўражвае сваімі памерамі і прыгожым месцазнаходжаннем. Калісьці, напэўна, гэта быў адзін з лепшых ФАПаў у краіне, а можа і адзіны такі. Ён меў спартыўную залу на другім паверсе, куды вяла прыгожая вінтавая лесвіца, гасцінічныя нумары з вітражнымі вокнамі ў бок возера, лазнева-пральны камбінат, апраўленыя бутавым каменнем кветнікі і альтанкі...

Сёння ў будынка няма гаспадара, дакументацыі, акон, дзвярэй, плітак, працякае дах. Але Вольга Мікалаеўна кажа праўду, калі сюды ўкласці грошы, рукі і розум, то будынак мог бы стаць цудоўным і вельмі прыбытковым аб'ектам аграэкатурызму. Па-першае, Капыль з яго 10 тысячамі чалавек усяго за 6 кіламетраў, па-другое, сюды зручна прыязджаць вялікай кампаніяй, напрыклад, гуляць вяселле, карпаратыўнае свята, юбілей. Ёсць дзе разгарнуцца і дзе адпачыць, і нікому кампанія перашкаджаць не будзе. Месца адасобленае і маляўнічае. Немалаважна і тое, што сюды праведзены водапровад, электрычнасць, захаваліся набярэжная, сцены, вінтавая лесвіца.

— Нам бы знайсці для былога ФАПа гаспадара, — з болем кажа старшыня сельскага Савета. — Усім было б добра, і людзям, і новаму ўладальніку. Безумоўна, укласці сюды трэба шмат, але і аддача не прымусіць сябе чакаць.

— Нам бы знайсці для гэтага будынка гаспадара, — з болем кажа старшыня сельскага Савета. — Усім было б добра: і людзям, і новаму ўладальніку. Несумненна, укласці сюды трэба шмат, але і аддача не прымусіць сябе чакаць.

Мы з цікавасцю і здзіўленнем пахадзілі па будынку, памалявалі ў сваім ўяўленні летнюю кавярню на беразе, лодкі з парасонамі, веранду на другім паверсе, тэрасу на першым... Але хлопцам, якія прыехалі на Капыльшчыну ў пошуках сваёй Новай зямлі, будынак гэты не падышоў. Бо ўкладаць ім пакуль няма чаго. Яны шукаюць магчымасць пачаць з «нуля» ва ўсіх сэнсах.

— А ці няма ў вас тут хутароў? — пытаецца Паша ў Вольгі Мікалаеўны Купрыенкі.

— Чакайце, ёсць адзін у Навасадах, — узгадвае тая. — Паедзеце?

Хутар

Вядома ж, мы паехалі. Аляксей, Косця і Паша чулі, што Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі аб'явіла аб адраджэнні і развіцці хутарскога вядзення сельскай гаспадаркі.

— Я маю аграномічную адукацыю, — сказаў Аляксей, — мы маглі б на тым хутары не толькі турыстаў прымаць, але і фермерствам займацца.

Хутар пасярод лесу — гэта найбольш блізка да ўяўлення хлопцаў аб уласнай аграсядзібе. Яны менш за ўсё хочуць абслугоўваць шумныя застоллі. Сваімі будучымі кліентамі яны бачаць маладых праграмістаў, якія засядзеліся за камп'ютарамі і адчуваюць патрэбу трохі размяцца, падыхаць свежым паветрам, адчуць блізкасць да прыроды. Але на Капыльшчыне хутароў амаль не засталося.

І усе ж такі адзін мы ўбачылі. Ён знаходзіцца не пасярод лесу, а пасярод поля, нібы востраў у моры. Праўда лес, сасновы, блізка, — цёмна-зялёнай сцяной абкружае бульбяное мора з востравам-хутарам з двух бакоў. А недзе за кіламетр, на супрацьлеглым баку Навасадаў, ёсць і возера.

Мы пакідаем машыну і Вольгу Мікалаеўну на асфальце, бо дарога да хутара пасля моцнага ліўня «не па колах» нават для сельсавецкай «Волгі». Аднак нас чакае сюрпрыз. І не адзін.

За пагоркам дарога была не толькі не па колах, але і не па летнім абутку. Хлопцы разуліся і пайшлі, закасаўшы нагавіцы, па вадзе басанож. Аднак хутка прыйшлося засумнявацца, наколькі гэта было добрым рашэннем. Праз некалькі крокаў дарога ператварылася ў несанкцыянаваную, схаваную звалку. Кульмінацыяй вандроўкі да патэнцыяльнай аграсядзібы стала сустрэча з... галавой дзікага кабана, якая злавесна глядзела на нас прама з бруднай лужыны, абысці якую было немагчыма.

Такім чынам, яшчэ да ўваходу на хутарскі падворак нашы нервы нацягнутыя, а сапсаванае фільмамі жахаў уяўленне ўзбуджана да краю. Між іншым, дарога да хутара не даходзіць, яна пераарана і сёлета была засаджана бульбай.

Ля ўвахода ў брамку ляжыць вялікая куча камянёў, і чамусьці кожны з нас падумаў, што такой кучай можна засыпаць труп. Аднак уголас ніхто пакуль пра гэта не сказаў. Мы асцярожна зайшлі ў двор, звярнулі ўвагу на пракладзеную сцежку, прымятую траву, а калі абышлі ганак, то ўбачылі, што дзверы груба выламаныя...

Трэба было набрацца духу, каб рашыцца зайсці ўнутр. Аднак унутры дом быў не такі ўжо і страшны. Насупраць увахода вісіць у рамцы цытата з Евангелля: «Бог ёсць дух, і тыя, што пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і ісціне. Пав. Іаана. IV, 24.» Печка, грубка, падлога, стол і вокны ў цэласці, захавалася нейкая мэбля, фотапартрэт мужчыны на стале, часопіс з рэлігійным зместам, маляваны дывановік з выявай шышкінскіх мішкаў у лесе.

Звычайны закінуты дом. Але мы не змаглі знайсці тлумачэння дзвюм рэчам. Адкуль і навошта ў жылым пакоі стаіць каробка, напоўненая нявыкарыстанымі адназовымі сістэмамі для пераліванне крыві і інфузійных растворaў. Усе сістэмы былі імпартныя і... распакаваныя. Магчыма, калі б мы тады здагадаліся, што ў іх не хапае іголак, нам стала б больш зразумелым іх знаходжанне тут, на закінутым хутары.

Другую рэч, якая нас не толькі здзівіла, але і ўстрывожыла, мы заўважылі, калі выходзілі з залы. Звонку, з боку пярэдняй, у вушакі зальных двухстворкавых дзвярэй былі забітыя прабоі для вялікай засаўкі накшталт той, якой перакрываюць хлеў, каб жывёліна не магла выйсці. Чаму дзверы ў жылы пакой зачыняліся не знутры, а звонку, і не на ключ, а на папяровочную вялікую засаўку? Каго і навошта там запіралі? Можна дапусціць, што для некага зала служыла турмой, але ж на вокнах хаты няма кратаў і выйсці праз іх не зможа толькі бязрукі... Альбо бязногі.

— Ніякавата тут, — прамовіла фотакарэспандэнт «Звязды». — Яно, вядома ж, прыгожа, адасоблена, але асабіста я адпачываць тут не вырашылася б.

Хлопцы ад каментарыяў пакуль устрымліваліся. Яны, як і хацелі, убачылі хутар, яле яго змрочная закінутасць і таямнічасць іх ашаламіла. Паша яшчэ зазірнуў на гарышча і сказаў толькі: «Тут можна здымаць фільмы жахаў. Сапраўдны Дом з прывідамі». Апошняй кропкай стала ватоўка ў скляпенні, якую спачатку прынялі за павешанага чалавека.

Трэба было набрацца духу, каб рашыцца зайсці ўнутр. Аднак унутры дом аказаўся не такі ўжо і страшны. Насупраць уваходу вісіць у рамцы цытата з Евангелля: «Бог ёсць дух, і тыя, што пакланяюцца Яму, павінны пакланяцца ў духу і ісціне».

Багушы

Пасля Навасадаў Вольга Мікалаеўна перадала нас **старшыні суседняга Вялікараёўскага сельсавета — Зоі БОРДАК**, якая чакала за рулём чорнай «Волгі» на беразе вялікага і прыгожага возера Багушы.

— Гэта ўлюбёнае месца адпачынку капылян, — патлумачыла Зоя Мікалаеўна.

Мы пакінулі машыны на заасфальтаваній аўтастаянцы ўнізе і сталі падымацца да вёскі з аднайменнай назвай пешшу, бо дарогу размыла моцным ліўнем. Але наш шлях і месца, да якога ён прывёў, былі таго вартыя. Цішыня, спакой, дарога хоць і размытая, але сухая, пясчаная, з аднаго боку ад яе рознакаляровымі ласкутамі ляжаць палі, а з другога — возера, за якім сасновы лес.

— Хутка дарога гэта будзе папраўлена, — просіць прабачэння наша павадырка, — у Багушах жыве прадпрымальнік, які паабяцаў дапамагчы. Ён, дарэчы, ужо зарэгістраваўся як гаспадар аграсядзібы, плануе лодачную станцыю пабудаваць, кавярню...

Пакуль у Багушах зарэгістравана толькі тры жыхары. Двое ўжо выказалі жаданне заняцца тут аграturызмам. Пустых дамоў у Багушах няма, бо тыя, што былі, даўно знесеныя, а будаваць новыя доўгі час было забаронена. І вось толькі сёлета сельсавет атрымаў дазвол вылучыць участкі пад будаўніцтва. Ахвотных пабудавацца ў Багушах хапае, і каму аддаць зямлю — вырашае сельсавет. Сярод прэтэндэнтаў нямала і мінчан, але Зоя Мікалаеўна кажа, што перавага будзе аддадзена капылянам, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і патэнцыйным гаспадарам аграсядзібаў.

— Можаце паехаць і пакінуць заяву ў сельсавеце, — прапануе яна нашым шукальнікам Новай зямлі. — Потым купіце за невялікія грошы зруб, прывезяце, складзіце і будзе вам сядзіба. І добра, што суседзі таксама будуць прымаць турыстаў. Нехта спыніцца ў вас, нехта ў іх — каму што будзе даспадобы густу. А талакой

БАЙЦЫ ЗАСТУПІЛІСЯ ЗА БЕЛАРУСКУЮ МОВУ

У Дзень беларускага пісьменства пад Мінскам сабраліся наймацнейшыя тайбаксёры краіны — нефармальная суполка «Байцоўскі клуб». Праводзіліся жорсткія прафесійныя двубоі. А напрыканцы шоу-праграмы адзін з беларускіх чэмпіёнаў свету нечакана перайшоў на нацыянальную мову.

Юрась БУЛАТ (злева) — адзін з нямногіх беларускамоўных трэнераў.

Шоу «Байцоўскага клуба» праводзілася ў кавярні «Ачаг», што ў Бараўлянах пад Мінскам, у нядзелю 6 верасня. У гэты ж дзень краіна адзначала свята беларускага пісьменства.

— Да нас прыехалі ўсе наймацнейшыя мужчыны Беларусі, не паспелі толькі нашы сябры рэпер Сярога і футбаліст Аляксандр Глеб, — распавядае «Звяздзе» ідэйны натхняльнік нефармальнай суполкі «Байцоўскі клуб» Сяргей Іванавіч, адзін з першых беларускіх чэмпіёнаў па тайбоксе. — Упершыню амаль усе сабраліся ў адным месцы — былыя, дзейныя і спадзяюся будучыя беларускія чэмпіёны, проста бізнэсоўцы, працаўнікі офісаў і іншыя мужчыны, якія не страцілі пачуцця годнасці і змагаюцца за свае прынцыпы. Наша мэта — папулярызаваць наш спорт, дабіцца таго, каб на нашых турнірах змагаліся самыя лепшыя байцы, а не падстаўныя чэмпіёны.

Сябры «Байцоўскага клуба» фатаграфаваліся адзін з адным, вячэралі, размаўлялі за жыццё, слухалі гурт «Дразды» і сачылі за прафесійнымі двубоямі. І было на што паглядзець.

У цэнтральным паядынку вечара сустрэліся байцы суперцяжкай вагавай катэгорыі. Некалі знакаміты спартсмен Віталь Охраменка па мянушцы «Вінт» пасля чатырохгадовай паўзы вярнуўся ў рынг. Супрацьстаяў яму малады Яўген Макараў. Мужны двубой прайшоў

на адным дыханні. Макараў жорстка атакаваў з рук, але Охраменка сустракаў суперніка відовішчнымі ўдарамі ног і часта перабіваў. Суддзі яшчэ не вынеслі свайго рашэння, калі вядучы шоу Андрэй Мішчанчук звярнуўся да Юрася Булата, трэнера Яўгена Макарава:

— Як лічыш, хто перамог?

— Дазвольце я перайду на родную мову, — раптам здзівіў усіх Юрась Булат, і частка залы запляскала ў далоні. — У першым раўндзе лепшы быў мой вучань, другі можна аддаваць у розныя бакі, трэці — за Охраменкам. Але нічыю можна даваць.

Перамогу ўсё ж аддалі Віталю Охраменку. Але мы, здзіўленыя ідэальнай беларускай мовай трэнера, падышлі да Юрася Булата. Высветлілася, што гэты трэнер у нядаўнім мінулым — чэмпіён свету, а яшчэ ў свой час ён з чырвоным дыпломам скончыў політэхнічны інстытут.

— Заедзеш ва Украіну — амаль паўсюль гучыць украінская мова, — кажа Юрась Булат з нагоды Дня беларускага пісьменства. — Пра Расію я ўвогуле маўчу. А ў нас нават па тэлебачанні беларускую мову не пачуеш. Сітуацыю неабходна выпраўляць. А хто саромеецца размаўляць па-беларуску, прыходзьце займацца ў мой клуб. Зробім ваш характар больш цвёрдым і рашучым.

Падчас турніру карэспандэнт «Звязды» даведаўся, што лідар самага папулярнага беларускага рок-гурта «Ляпіс Трубяцкой» Сяргей Міхалок, які некалькі гадоў таму пачаў пісаць цудоўныя беларускамоўныя песні, таксама займаецца боксам. Але не змог прыехаць у Бараўляны з-за гастроляў.

У яшчэ адным звышцікавым двубоі вечара сустрэліся дзве беларускія... дзяўчыны. Вольга Прыбыльская з Гомеля і Людміла Чыслова з Магілёва. Абедзве — вялікія аматаркі пабіцца. Вольга — чэмпіёнка Еўропы па тайскім боксе, а Людміла — пераможца Кубка свету. Паненкі так люта змагаліся, што парвалі канаты рынга. У другім раўндзе зала змоўкла настолькі, што было чуваць, як у кагосьці пабілася талерка.

Перамагла Вольга Прыбыльская, праўда, яна была на некалькі кілаграмаў цяжэйшая за суперніцу. Падыходзім да Вольгі і пытаемся, чаму яна выходзіць у рынг.

— Калісьці я сябравала з футбольнымі фанатамі, вам зразумела? Таму і пайшла займацца ў гомельскі клуб «Адзінаборствы», — тлумачыць Вольга Прыбыльская. — Змагаюся не толькі па правілах тайскага бокса, удзельнічаю ў так званых баях без правілаў. Апроч спорту навучаюся на чацвёртым курсе Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта.

Апоўначы, калі шоу-праграма скончылася, з Бараўлянаў пацягнуўся доўгі гуж аўтамабіляў. Так у Дзень беларускага пісьменства многія «байцы» ўпершыню даведаліся, якія аўтарытэтныя людзі павяртаюцца тварам да роднай мовы.

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота Tarantino.

ДАРЭЧЫ

Куды пайсці займацца беларускамоўнаму дзіцяці?

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў «Байцоўскім клубе», некаторыя трэнеры ў пачатку навучальнага года з задавальненнем чакаюць на заняткі беларускамоўных дзяцей.

1) **Клуб «Патрыёт»,** г. Мінск, ваенны гарадок Уручча, вул. Герояў 120-й дывізіі, д. 11, трэці паверх. ***Трэнер — Дзмітрый Барысавіч ПЯСЕЦКІ.***

2) **Клуб «Булат»,** г. Мінск, Другі Прылукскі завулак, д. 3. ***Трэнер — Юрый Валер'евіч БУЛАТ.***

РАСІЙСКІМ МІЛІЦЫЯНЕРАМ СПАДАБАЛІСЯ... ФЛІКЕРЫ

І сабе, і людзям

У памежнай Смаленскай вобласці і іншых пераймаюць вопыт беларускай міліцыі па «флікерызацыі» насельніцтва.

Як паведаміў «Звяздзе» **начальнік УУС па Смаленскай вобласці генерал-маёр міліцыі Юрый СЦЕРЛІКАЎ**, нават губернатар вобласці падтрымаў ідэю забяспечыць у першую чаргу дзяцей і падлеткаў флікерамі.

Паводле слоў **начальніка УУС Віцебскага аблвыканкама палкоўніка міліцыі Аляксандра НАЙДЭНКІ**, толькі летась, дзякуючы флікерам, на дарогах прынамсі не загінулі 25 чалавек.

Кіраўнікі суседніх з Віцебскай вобласцю расійскіх рэгіёнаў пільна вывучаюць і практыку беларусаў па прафілактыцы падлеткавай злачыннасці. І канстатуюць: на жаль, няма пакуль што ў Расіі такога ж «рычага» ўздзеяння на «праблемных» бацькоў, як у Беларусі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ПА СЛЯДАХ БЕЛАРУСКАЙ КНІЖКІ

Ці ёсць у нас добрыя беларускія дзіцячыя кніжкі? Ці чытаюць іх нашыя дзеткі? Як ставяцца да беларускай мовы. Паспрабуем разабрацца.

Напачатку завітаю ў кнігарні. Палічкі з дзіцячымі кніжкамі на беларускай мове выглядаюць «не аўтарытэтна» ў параўнанні з рускай друкаванай прадукцыяй: іх не так многа і тут няма такога буйства фарбаў і такога выбару. Таму яны «губляюцца» ў крамах, патэнцыяльных пакупнікоў побач з імі амаль не бачна. Гляджу на кошты, нашы кніжкі нават таннейшыя за тыя рускія, з якімі пакупнікі стаяць у касы, ці ля якіх круцяцца дзеці. Цяпер у кнігарнях аншлагі, шмат дзяцей — пачаўся навучальны год. Адна дзяўчынка, напэўна, гадоў 9, гартае папулярныя цяпер «Смяшарыкі». «А вунь там ёсць цікавая кніжка на беларускай мове і менш каштуе», — спрабую пераманіць дзяўчынку да беларускіх кніг. «А тут прыгажэйшыя», — чую адказ. У чарзе да касы маці пытаецца ў сваёй дачкі, дзяўчынкі гадоў 11: «Можа, возьмем табе што беларускае, каб карысць была?» Дзяўчо маўчыць і толькі мацней прыціскае да сабе абраную кніжку з героямі з замежных мульцікаў.

«У нас купляюць кніжкі на беларускай мове, праўда, не так многа. Добра ідуць перакладзеныя на беларускую «Віня-Пых» і «Малы і Карлсан-з-пад-даху», кніжкі па школьнай літаратуры. Але часцей дзецям набываюцца тыя кнігі, якія ў дзяцінстве чыталі іх бацькі: Успенскага, Маршака, Чукоўскага, Носава, Волкава, сярод новых — Машу Траўб, дзеці любяць прыгоды, добра ідуць энцыклапедыі, асабліва перад першым верасня. Самі малыя часцей выбіраюць яскравую прадукцыю, а не глядзяць на аўтара. І беларускія кніжкі ў сваім афармленні часам саступаюць», — расказвае **прадавец-кансультант «Акадэмкнігі» Юлія МЕДЗЯНЦАВА**.

Але я не сказала б, што ў нас няма прыгожых кніг. Бачыла на ўласныя вочы. У межах 15—20 тысяч можна набыць цікавую, карысную і прыгожую кнігу, з добрымі малюнкамі ці фотаілюстрацыямі. Нават спакусілася на такую — кніга з серыі «Расліны» «Усім пра ўсё» годна выглядае на шафавай палічцы побач з яскравымі расійскімі дзіцячымі энцыклапедыямі.

Я не бачыла ў продажы беларускіх дзіцячых кніг для самых маленькіх з трывалымі старонкамі. Вельмі мала тоненькіх кніг, а каб яшчэ і з яскравымі малюнкамі — і таго менш. У большасці кніг «фарбаваныя» малюнкі, з размытымі межамі, бляклымі фарбамі, а то і наогул мадэрніцкімі малюнкамі. Уявіце хлапчанё, у якога галава па памеры амаль такая ж, як цела і аніякі выраз твару. Прычым незалежна ад таго, якія падзеі адбываюцца і як мяняецца настрой у героя твора, на малюнках ніякіх эмоцый. Няўжо нашы мастакі думаюць, што такое падабаецца дзецям? У інтэрнэце я нават знайшла трапны водгук на беларускія ілюстрацыі: «Хочацца, каб ліса была падобная на лісу, а не на адлюстраванне ўнутранага свету мастака пасля таго, як па яго галаве чымсьці шыбанулі».

Можна зэканоміць на ілюстрацыях, у беларускіх казках іх не шмат, а некаторыя кнігі наогул без іх. Я бачыла тоўстую кнігу з беларускімі казкамі ўсяго за 8 тысяч, праўда, у ёй не было ніводнага малюнка. Магчыма, яна прывабіць дарослых сваім коштам. Але калі да кніжкі не падбяжыць маленькі чытач, бацькі яе могуць проста і не заўважыць. Але ўмеюць нашы выдаўцы рабіць і выдатныя, яскравыя кнігі, узгадаю серыю «Вясёлая сямейка» — вось толькі беларускія казкі ў ёй на рускай мове. Спецыяльна пацягнула ў краму сваіх дзяцей, але яны не сталі выбіраць са мной кніжкі ля беларускай палічкі, а адразу рванулі да больш яскравай прадукцыі. Хоць мне падаецца, калі б нашых кніжак было больш, і каб яны займалі больш месца на паліцах, некаторыя з іх па сваім афармленні здолелі б трываць канкурэнцыю з рускамоўнай прадукцыяй.

Справы сямейныя

Я іду ў бібліятэку, што побач з домам, праглядаю на палічках спецыяльна выстаўленыя на паказ кнігі для дзяцей. Ужо па знешнім выглядзе бачна, што чытаюць дзеці: рускамоўныя больш патрапаныя, на лістках больш доўгія радкі — запісы аб чытачах. А што мне скажа бібліятэкар?

— Сапраўды, на беларускай мове кніжкі бяруць радзей. Сёння з 61 дзіцяці 7 узялі кнігі на беларускай мове. У асноўным, зразумела, школьнікі бяруць літаратуру па праграме, хоць была дзяўчынка, якая прасіла «што-небудзь пра Беларусь», напэўна, да школы, бо ў верасні заўжды ідуць такія краязнаўчыя заняткі, — распавядае **вядучы бібліятэкар бібліятэкі-філіяла № 18 Цэнтральнай сістэмы гарадскіх публічных бібліятэк Мінска Таццяна РЫХЦІКАВА**.

Я спецыяльна вырашыла завітаць у дарослую бібліятэку, бо хаджу туды з дзецьмі і набіраю адначасова кнігі і сабе, і малым. Ды і Таццяна Уладзіміраўна ўпэўненая, што цяпер бібліятэкі і павінны быць сямейнымі, бо так дзецям будзе прывівацца любоў да чытання. Хоць, аказваецца, даволі часта самі бацькі адбіваюць у дзяцей цікавасць да беларускіх кніг.

— Мы імкнёмся прыцягнуць увагу да нашых кніг, выстаўляем іх на бачнае месца. Часам дзіцяці спадабаецца прыгожая беларуская кніжка, а бацькі паглядзяць, што яна на беларускай мове і прымушаюць дзіця занесці яе назад, «мы возьмем табе рускамоўнае». І я не сказала б, што людзі не чытаюць, у нас наадварот колькасць чытачоў расце і нават лета перастала быць мёртвым сезонам. І, мне падаецца, што і беларускія кніжкі могуць быць цікавымі сучасным чытачам. Ва ўсялякім разе, на сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі дзеці ходзяць з задавальненнем. Цяпер ёсць вельмі шмат яскравых альбомаў пра Мінск, пра Беларусь, пра нашу прыроду. Дзеці бяруць іх у чытальнай зале і з задавальненнем гартаюць. Беларускім кнігам не хапае яскравасці, яны павінны прывабліваць сваім знешнім выглядам. А яшчэ менавіта дзіцячая літаратура павінна быць даступнай па кошце. Малодшыя дзеці чытаюць усё, а старэйшыя — у асноўным праграмныя творы. Калі сёння можна падабраць літаратуру для малодшага школьнага ўзросту, дык для самых маленькіх яе, падаецца, няма. Мала беларускіх кніг, якія былі б цікавыя падлеткам. А гэта павінны быць прыгоды, кнігі з захапляльным сюжэтам, дэтэктывы, раманы для дзяўчат. І хочацца, каб дзіцячая літаратура была не злосная, прывівала добрыя якасці, каб была звязаная з рэальным жыццём, каб дзеці маглі вучыцца па ёй, а не будаваць касмічных планаў.

Ці чытаеце вы дзецям беларускія кніжкі?

Ці загавораць нашыя дзеткі па-беларуску, ці пачнуць чытаць нашыя кніжкі — напэўна, шмат у чым залежыць менавіта ад бацькоў. Таму гэтае пытанне я адрасавала менавіта бацькам самых юных чытачоў.

Алена ГРАМЫКА: Мы не чытаем беларускіх кніжак, іх амаль няма ў продажы. Неяк у кніжнай краме бачыла аддзел з беларускімі кніжкамі, але мімаходзь зірнула ў той бок, кніжкі змрочныя, шэрыя, нават і гартаць не захацелася. А ці ёсць у нас добрыя кніжкі? Ведаеце, што цяпер цікава дзецям? У майго сына любімыя кніжкі — пра дыназаўраў і кракадзілаў. Гэта ў малодшай школе. А яшчэ мы любім дзіцячыя энцыклапедыі. Праўда, сыну ў 7 гадоў асобныя рэчы складана даюцца, даводзіцца шмат што тлумачыць. Часам напісана занадта не па-дзіцячы. Калі б былі пазнавальныя кніжкі, напісаныя даступна, якасна аформленыя, на добрай паперы, а не на шэрай, мы б, напэўна, бралі і беларускія.

Вольга САВІЦКАЯ: Майму пляменніку пакуль толькі два гады і чытво ў нас асабліваe, гэта павінны быць просценькія кніжкі і з процьмай малюнкаў. Не ведаю, ці ёсць такія на беларускай мове, ва ўсялякім разе, мне на кніжным кірмашы яны не трапляліся. Цяпер столькі яркіх прыгожых кніжак, што, магчыма, беларускія проста незаўважныя. Хоць, лічу, што дзецям трэба чытаць і па-беларуску. І добра, калі з'явіцца такія апавяданні, добрыя, павучальныя, якія будуць вучыць дзяцей, як паступаць добра. Дзе героямі будуць самі дзеці.

Марыя СНАПКОВА: Пачыналі мы чытаць, як і ўсе з «Куркі рабкі» да «Чырвонага капялюшыка». Але калі ўсе гэтыя класічныя дзіцячыя казкі перачыталі, я заўважыла, што малой патрэбна нейкае новае чытво. Няблага пайшлі дыснееўскія казкі і казкі па савецкіх мультфільмах, але гэтыя кніжкі даволі дарагія і я пачала шукаць нешта яшчэ. Неяк у кнігарні звярнула ўвагу на беларускія кніжкі, пагартала і зразумела, што знайшла «залатую жылу». Аказваецца, цяпер столькі ўсяго цікавага для дзяцей ёсць на беларускай мове! І вершыкі, і казкі, і апавяданні. Дарэчы, паспрабуй яшчэ падбяры апавяданні пяцігадоваму дзіцяці. Мне спадабалася «Лясная кніга» — гэта творы розных беларускіх аўтараў пра нашу прыроду. Казкі такія пазнавальныя, у іх столькі карыснай цікавай інфармацыі. Прычым пра нашых жывёл, а не нейкіх там абстрактных слонікаў ці малпачак. Паспрабавалі чытаць па-беларуску, малой спадабалася, ехалі на дачу — кніжку ўзялі з сабой. Я бачыла і неблагія кнігі з вершамі, з добрымі малюнкамі. Абавязкова набудзем сабе яшчэ што-небудзь. І няпраўда, што беларускія кніжкі занадта дарагія. «Лясная кніга» каштавала менш, чым такая ж па памеры кніжка з дыснееўскімі казкамі.

Алена ПАТАПОВІЧ: Я сама не ведала беларускай мовы, не вывучала яе ў школе, таму, што з сям'і ваеннага. Але з сынам мы чытаем беларускія кніжкі. Ён разумее мову і нават сам просіць чытаць па-беларуску. Прычым ужо з трох гадоў. Наша бабуля працавала ў школе, там спісалі старыя кнігі і яна прыцягнула іх дамоў. Там былі і кнігі на беларускай, выдатныя вершы і казкі. Напачатку мы прачыталі казку пра курку-рабку, малому спадабалася, і пачалі чытаць і іншае. І ён усё разумеў, калі трапляліся невядомыя словы, пытаўся. Пасля ён пераказваў гэтыя казкі па-руску. Побач з нашым домам знаходзіцца беларускамоўная гімназія, напачатку хвалявaліся, калі аддавалі яго туды: ён расце ў рускамоўным асяроддзі, а ў гімназіі ўсе прадметы выкладаюцца па-беларуску. Але сын адчувае сябе там камфортна і, падаецца, яму няма розніцы, на якой мове вучыцца. І беларускія кніжкі абавязкова будзем чытаць.

А вось вынікі апытання, якое мы правялі на сайце «Звязды». На пытанне «Якія беларускія кніжкі чытаюць вашы дзеці?» большасць інтэрактыўных чытачоў адказала: ніякія, аддаюць перавагу расійскім кнігам — 8 чалавек з 20, у межах школьнай праграмы — 3, казкі — 3, беларускіх класікаў — 2, сучасных беларускіх пісьменнікаў — 2, фантастыку — 1, краязнаўчую літаратуру — 1.

Адкрыццё

Набіраю ў бібліятэцы кніг, якія, мне падаецца, больш падыходзяць пад узрост маіх дзяцей і нясу дамоў. Раскладаю на стале і клічу Колю (5 гадоў) і Віку (3). Яны з задавальненнем разглядаюць «навінкі» — у абраных мной кніжках шмат прыгожых малюнкаў. Пасля бяру адну з кніг (Алена Масла «Вандроўка з божымі кароўкамі») і мы пачынаем чытаць. Як цудоўна! Малыя слухаюць разявіўшы рот. Калі б наш тата не пагнаў малых спаць, мы б адразу паглынулі добрую яе частку.

Калі чытаю па-беларуску, асобныя словы па ходу перакладаю на рускую мову — гэта для малодшай дачкі. Старэйшы, бачу, і так разумее. Як цудоўна, цікава, прыгожа напісана! Прачытаўшы кавалак тэксту, задаю «пытанні па змесце» сыну: з аднаго боку, гэта праверка, ці зразумеў тэкст старэйшы слухач, з другога, дапамога для малодшай, бо Коля караценька пераказвае змест па-руску.

Так, мае дзеці не гавораць на беларускай мове, сярод нашай радні, нашых сяброў, у нашым садку яна не гучыць. Калі нарадзіўся Коля, я вырашыла не практыкаваць двухмоўе, бо ўбачыла ў двары хлопчыка з беларускамоўнай сям'і. Яму было 4 гады. Хлопчык бянтэжыўся і блытаўся, не ведаючы, як яму гутарыць з іншымі дзеткамі. А яго маці сказала, што ён наогул пачаў размаўляць толькі ў тры гады.

Якім для мяне было прыемным адкрыццём, калі летась малы вярнуўся з дзіцячага садка і пачаў тлумачыць нам, для чаго патрэбныя жбанкі і глякі і за сталом пажадаў не «приятного аппетита», а «смачна есці». Раз на тыдзень у яго садку праходзяць беларускія заняткі, дзе яны вучаць родныя словы, вершы. І малым гэта падабаецца!

Адкрыццё другое. Муж набыў на кірмашы дыск з беларускімі легендамі ў выдатным мастацкім выкананні артыстам Манаевым. Дыск быў набыты для дарослых, а слухалі ўсёй сям'ёй. Больш за тое, дыск стаў любімым у нашага сынка, якому тады было ўсяго 4 гады! Ён прасіў яго ўключаць яшчэ і яшчэ, пераказваў легенды пра заснаванне Мінска і Магілёва, пра Дняпро і магілу волата. Добра ў яго пайшлі і дыскі з беларускімі казкамі, і без усялякіх тлумачэнняў. І гэта ў зусім малога дзіцяці, які расце ў рускамоўным асяроддзі.

Так, мае малыя не гавораць па-беларуску, але з задавальненнем слухаюць. І сёння мне падаецца дзіўным, калі кажуць, што дзеці не разумеюць мову. А мо сапраўды, трэба пачынаць ім чытаць па-беларуску з самага малога ўзросту. Калі яны найбольш уважлівыя, самыя ўражлівыя і дапытлівыя чытачы. Калі яны ўсё ўспрымаюць на пачуццях. Мо яны адчуваюць мову, таму і разумеюць.

Наступным маім адкрыццём стала беларуская дзіцячая літаратура. Тут я знайшла ўсё тое, што мне, як маці, хацелася даць сваім дзецям. Я шукала кніжкі, якія б вучылі дзяцей быць добрымі, шчырымі, каб распавядалі пра расліны і жывёл, пазнавальную літаратуру. Мы спрабавалі казкі Пушкіна, (але дзецям з дзіцячага садка многія са слоў, што трапляюцца ў яго казках, трэба тлумачыць), братоў Грым (але не пайшлі мудрагелістыя сюжэты, злосныя героі і вялікая колькасць незнаёмых паняццяў), казкі Андэрсана — гэта таксама кніжкі для больш старэйшага ўзросту. Нам цікавыя былі апавяданні Біянкі, дзіцячыя энцыклапедыі, але многае з таго, што мы там знаходзілі, ішло туга ў старэйшага, а малодшая, якая пры гэтым сядзела побач, наогул нічога не разумела. І тут мы знайшлі беларускія кніжкі, якраз з тым зместам, што трэба. Простыя, напісаныя так, што дзецям не трэба нічога тлумачыць. Добрыя, якія вучаць дзяцей любіць прыроду, сваю краіну, людзей, жыццё. Шчырыя. Цікавыя. На рускай мове шмат пазнавальнай літаратуры, энцыклапедый, але ці так многа казак, якія б распавядалі пра звычаі звяроў, расліны. Вы бачылі нашу «Чырвоную кнігу для дзяцей», альбо «Блакітную кнігу у творах беларускіх пісьменнікаў», альбо «Лясную кнігу»? Абавязкова звярніце на іх увагу.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
(Працяг тэмы ў наступным нумары «Звязды».)

Спявачка ДАКОТА:

«ЕЗДЖУ НА ЦЯГНІКАХ У ПЛАЦКАРТНЫХ ВАГОНАХ»

Маргарыта Герасімовіч, якая стала знакамітай пасля шоу «Фабрыка зорак-7», выбралася з творчага рабства ад сваіх былых прадзюсараў — братоў Меладзэ. Беларуска ўжо запісвае сольны «выбуховы» альбом. Дакота патлумачыла «Звяздзе», чаму за яе ваявалі кіты расійскага шоубізнэсу, а таксама расказала, колькі зарабляюць вядомыя артысты на карпаратывах і чаму яна купляе плацкартныя білеты падчас вандровак у Беларусь.

Здавалася, што пасля шоу «Фабрыка зорак-7» Дакота ўзяла творчую паўзу — ні новых песень, ні кліпаў. Няўжо праз паўтара года пасля шумнага тэлевізійнага праекта беларуская зорка згасла?

Аказалася, што прадзюсары Дакоты, браты Меладзэ, папросту не дазвалялі нашай дзяўчыне запісваць новыя песні.

— Братам Меладзэ былі больш цікавыя папсовыя праекты — гурт «БиС», «Инь-Ян», Марк Цішман. Творчым і незалежным музыкам яны развівацца не давалі, — скардзіцца Дакота. — Тым не менш пасля тура «Фабрыкі зорак» я напісала шмат цікавых кампазіцый. Працавала я, можна сказаць, толькі для сябе, ва ўласнай каморачцы, са сваімі музыкамі. Але без дазволу Меладзэ не магла выстаўляць творчасць на шырокую аўдыторыю. Хоць было шмат прапановаў. У тым ліку і ад Макса Фадзеева, ад Віктара Дробыша і іншых вядомых прадзюсараў. Але сысці і разарваць сямігадовы кантракт я не мела права.

Тым не менш і сярод расійскіх прадзюсараў знайшоўся такі, хто змог націснуць на братоў Меладзэ і забраць ад іх нашу Дакоту.

— Стары кантракт быў скасаваны. Цяпер у мяне новы прадзюсар — Марат Хайрутдзінаў. Ён займаецца такімі праектамі, як «Токио», «Агата Кристи», «Гарик Сукачев». Дапамагае многім творчым людзям, легендам року, — распавядае Дакота. — У нас поўнае узаемаразуменне, спалучэнне творчай энергетыкі. Новы праект так і будзе называцца — «Дакота». Мы хворыя ім, кожны дзень працуем у студыі. У канцы восені вы пабачыце вынік — з'явіцца новы альбом і новы кліп.

— Што за альбом?

— Будзе чатыры песні, якія вы маглі пачуць на «Фабрыцы зорак-7», — гэта «Спички», «Я все знала», «Одна» и «Лучшему другу». Астатнія песні — цалкам новыя. У такім стылі музыкі з постсавецкай прасторы яшчэ не працавалі. Вельмі спадзяюся, што гэта будзе запатрабавана слухачом.

«Хочаш замовіць расійскую артыстку? Рыхтуй 5000 долараў»

— Скажы, і чым ты зарабляла на жыццё ўсе гэтыя паўтара года?

— Калі ёсць галава на плячах, то ў Маскве грошы зарабіць магчыма. Я працавала як кампазітар: пісала і прадавала музыку да фільмаў. Хутка па тэлеканале СТС пачнуць паказваць 100-серыйны серыял «Мама-Масква». У ім знялося нямала публічных асобаў — Ціна Кандэлакі, Ала Даўлатава, Філіп Кіркораў, Андрэй Малахаў і іншыя. А сайнд-трэк да серыяла зрабілі я і Дамінік Джокер. Некаторыя песні я прадаю іншым артыстам. Напрыклад, маю песню выконвае беларуская спявачка Ітэйра.

— Ці шмат у цябе было канцэртаў?

— Хоць кліпаў і запісаў у мяне не было, канцэртаў і карпаратываў хапала. Давялося аб'ехаць паўсвету — выступалі і на вяселлях, і на днях горада, і на іншых мерапрыемствах. Шмат на што за гэты час нагледзелася.

— Няўжо нават за мяжу на вяселлі запрашалі?

— Аднойчы прыехалі ў Казахстан, брала шлюб маладая пара з вельмі багатых сем'яў. Разам з намі выступаў знакаміты нямецкі гурт Bad Boys Blue. Памятаю момант, як сядзім мы ў саўне, заходзяць чатыры цёмнаскурыя хлопцы з гэтага гурта, цалкам голыя, і пытаюцца: «Мы вас не патурбуем?» Я пабегла ў свой нумар. Назаўтра зноў сустракаемся з гэтымі хлопцамі, а яны — быццам нічога не здарылася. Проста некаторыя творчыя людзі ўвогуле без комплексаў. Пасябравалі, пачалі перапісвацца, хлопцы потым нават з Германіі падарункі перадавалі.

— І часта ты спявала на адных мерапрыемствах з заходнімі зоркамі?

— Здаралася, асабліва мне запомнілася выступленне ў Канадзе. Там жа выступала адна з маіх улюбёных спявачак — Эрыка Баду. Гэта непараўнальны вопыт.

— А колькі можна зарабіць у Расіі за адзін карпаратыў? Тысячы паўтары долараў можна атрымаць?

— Розныя артысты па рознаму маюць. Але мне здаецца, што за адзін карпаратыў можна мець ад 5000 долараў. Але такое не здараецца кожны дзень, ды і жыццё ў Маскве абыходзіцца вельмі дорага.

«Езджу на працу на метро»

— Калі запросіш у госці да сябе на Рублёўку?

— Куды там, жыву я ў сваіх маскоўскіх сваякоў — цёткі і дзядзькі. Мне выдзелілі пакой. Езджу я на метро, хоць спадзяюся, што хутка змагу атрымаць вадзіцельскае пасведчанне і набыць аўтамабіль. Вяртаюся дадому вельмі позна, і лавіць спадарожныя машыны вельмі страшна. Жыццё ў Маскве бурлівае, шмат крыміналу, злачыннасці. Гэта мяне страшыць.

— Калі страшыць, то вяртайся ў Мінск.

— Дадому я і так стараюся наведвацца часта. Усе мае лепшыя сябры тут, бацькі тут, хлопец тут.

— А цягніком Масква—Мінск ездзіш у вагоне СВ, як Кабзон?

— У звычайным плацкарце. Калі вы матаецеся ў Маскву, то верагодна, што можам ехаць на суседніх паліцах. А ў купэ не езджу, страшна. Аднойчы патрапіліся нейкія жахлівыя мужчыны. Яны пілі ўсю дарогу, у карты гулялі, мацюкаліся, паводзілі сябе неадэкватна. У выніку мяне перасадзілі ў купэ да праваднікa. З таго часу купляю квіткі ў плацкартны вагон.

«Расіяне просяць — праспявай яшчэ што-небудзь па-беларуску»

Трэба сказаць, што Дакота ці не адзіная вядомая ў постсавецкіх краінах артыстка, якая займаецца развіццём беларускай мовы. На леташнім адборы да «Еўрабачання» яна праспявала беларускамоўную песню «Цябе адчуваю». Але суддзі не падтрымалі родную мову і на конкурс адправілі англамоўнага Пятра Елфімава. Што з гэтага выйшла, мы ўсе добра ведаем.

Пасля гэтага Дакота не спынілася і па-ранейшаму працягвае частковую беларусізацыю сваёй творчасці.

— Мне пішуць на форумах і сайтах — праспявай яшчэ што-небудзь па-беларуску. Мы нічога не разумеем, але так прыгожа, так прыгожа гучыць! — прызнаецца Дакота. — Людзям падабаецца. І беларусам трэба паказаць, што ў нас ёсць свае нацыянальныя адметнасці, свая прыгожая мова.

— Чаму ты гэта разумееш, а мясцовыя беларускія «зорачкі» не?

— Нашы артысты хочуць быць падобнымі да расійскіх ці заходніх. Яны «прычасаныя», «прылізаныя», падобныя адно да аднаго. Баяцца індывідуальнасці. А я ведаю, што беларуская мова прыемная вуху тых жа расійскіх слухачоў. Беларускамоўныя песні будуць абавязкова ўваходзіць у склад маіх альбомаў.

— Чуў, што нават свой пакуль самы вядомы хіт «Спички» ты запісала па-беларуску.

— Так, на апошнім канцэрце я нават рускамоўны тэкст забылася. Пераклад зрабіў паэт Глеб Лабадзенка. Вельмі добры пераклад. Перад выступленнем на тым самым канцэрце мне давялося звяртацца да свайго дырэктара, каб яна падказала тэкст другога куплета...

Яўген ВАЛОШЫН.
Фота з асабістага архіва Дакоты.

«ДОБРАЯ ЗЯМЛЯ, КАЛІ РУК НЕ ШКАДАВАЦЬ»

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫ ВЫТВОРЧЫ КААПЕРАТЫЎ «РАЧЭНЬ»

Пад дахам новага жывёлагадоўчага комплексу. Частку работ на будаўніцтве выконвае брыгада СВК «Рачэнь» (на добраўпарадкаванні аб'ектыў зафіксаваў Людмілу ЛОСІК, Юлію ФІЛЕНЮ, Таццяну КУЗЬМІЦКУЮ).

Падчас наведвання Любанскага раёна мы пабывалі таксама ў СВК «Рачэнь». Калі мы праязджалі па адной з дарог гаспадаркі, непадалёк ад якой высіліся карпусы 4-га рудаўпраўлення Салігорскага калійнага камбіната, старшыня СВК Аркадзь Рагалевіч сказаў: «Вось тут, наверсе, мы рыхтуем поле для пасеву азімых, а пад намі, на двух гарызонтах, на глыбіні 440 і 730 метраў, калійшчыкі здабываюць сваю соль...».

— Не правалімся ў самае пекла? — занепакоіліся мы.

— Не хвалюйцеся, калі і правалімся, то не болей, чым на чатыры метры.

Для нас, аднак, і такая, больш аптымістычная, перспектыва мала падыходзіла, пра што мы таксама сказалі Аркадзю Міхайлавічу, і ён нас канчаткова супакоіў:

— Ды жартую. А вось так званыя прасадкі зямлі — гэта ўжо вельмі сур'ёзна, у прыватнасці для нашай гаспадаркі. Бачыце, колькі каналаў нарэзана на полі праз кожныя 100 метраў, і па 5 метраў глыбінёй. Усё гэта ў рамках так званых абаронных мерапрыемстваў у сувязі з тымі ж прасадкамі зямлі, для скідвання ў каналы вады, — з тым, каб гэтая зямля не забалочвалася. У мінулым годзе да нас далучылі адсталую гаспадарку «Закальное» (дарэчы, з вельмі вялікімі, на сотні мільёнаў рублёў, даўгамі), дык вось — палі гэтай гаспадаркі і ляжаць у непасрэднай блізкасці ад камбіната, амаль побач, якраз яны і спаласаваны гэтымі глыбокімі каналамі. Каля 2000 гектараў такіх палёў. Не вельмі што ўзрадаваліся мы гэтым землям, але што рабіць — зямля не павінна пуставаць, ды і неяк даводзіць да ладу яе трэба. Хоць, напрыклад, падзол, які пры пракладванні каналаў вывернулі з 5-метровай глыбіні і, па сутнасці, рассеялі па ўсім полі, не вельмі што спрыяе ўраджайнасці...

Словам, такое вось суседства ў СВК «Рачэнь». Не скажаш, што вельмі прыемнае для гаспадаркі. Хоць, вядома ж, у гаспадарцы выдатна разумеюць важнасць працы калійшчыкаў. Тут больш супраць не вельмі ўдалай абароны ад наступстваў гэтай працы, супраць тых жа глыбокіх і вельмі частых каналаў (дарэчы, падчас наведвання «Рачэні» яны былі абсалютна сухімі). Дапусцім, як тут разгарнуцца з нармальнымі севазваротамі, калі, напрыклад, былое 60-гектарнае поле парэзалі на 6-, 7-гектарныя кавалачкі; разгарнуцца з сучаснай высокапрадукцыйнай тэхнікай, усе сучасныя вартасці якой пры бясконцых аб'ездах і пераездах з кавалачка на кавалачак практычна зводзяцца да нуля. А колькі дадатковага паліва пры ўсім гэтым трэба спаліць...

— А хоць нейкім чынам кампенсуецца ўсё гэта? Напрыклад, тымі ж калійнымі ўгнаеннямі...

— Ды хто кампенсуе? А ўгнаенні — калі ласка. За грошы.

Аднак як часта цяперашні прагрэс уступае ў супярэчнасць з нашымі звычайнымі чалавечымі ўяўленнямі і нормамі, і як важна знайсці тут неабходны кампраміс, захаваць ва ўсім гэтым неабходны баланс. І, можа, самае галоўнае: важна, каб за зямлю заўсёды было каму заступіцца. Як заступіўся непасрэдна Аркадзь Рагалевіч.

Аказваецца, ёсць і намнога больш мяккі варыянт вырашэння абазначанай праблемы, і ёсць зусім іншая тэхналогія тых жа абаронных мерапрыемстваў, якую Аркадзь Рагалевіч прапанаваў і адстаяў перад праектантамі і выканаўцамі «канальнай сістэмы» непасрэдна ў сваёй гаспадарцы (нагадаем: да яе нядаўна далучылі іншую гаспадарку, менавіта зямля гэтай гаспадаркі і зрэзана тымі ж каналамі). Падчас экскурсіі па гаспадарцы Аркадзь Рагалевіч паказаў нам маляўнічае штучнае возера, у якім пры гэтым, паводле яго ж слоў, і рознай прэснаводнай рыбы — безліч (20 000 малькоў карпа запусцілі), якое для многіх жыхароў раёна і краіны (нават мінчане сюды даязджаюць) стала любімым месцам адпачынку. «Гэта — наша жамчужына, жамчужына СВК «Рачэнь», — гаварыў Аркадзь Рагалевіч. А стварылі гэту жамчужыну ў гаспадарцы самі ж, і ў рамках тых жа самых абаронных мерапрыемстваў супраць забалочвання. І не спатрэбілася пры гэтым ніякіх каналаў. «Цяпер вось там, — паказваў удалечыню Аркадзь Міхайлавіч, — яшчэ адно такое возера капаем. З такой жа мэтай». А яшчэ ён дадаў:

— Па-сапраўднаму любіць зямлю трэба. Як тую жанчыну, і нават мацней. Тады і яна да цябе будзе са спагадай. Я на гэтай зямліцы нарадзіўся, вырас, прайшоў на ёй усю сельскагаспадарчую навуку, 25 гадоў «араў». Словам, я зросся з ёй назусім. І ўсёй душой хварэю за яе. А ўвогуле, дрэннай ці добрай зямлі не бывае — яна такая, як мы да яе ставімся...

Вельмі хораша сказана.

* * *

Сапраўды, добра, вельмі добра ставяцца да сваёй зямліцы ў СВК «Рачэнь». Скажам тут напачатку пра вынікі той жа ўборачнай. Больш за ўсіх у раёне намалацілі тут збажыны сёлета (не зважаючы на тую ж дастаткова папсаваную каналамі так званую контурнасць зямель); першымі ў раёне закончылі ўборку. Вось канкрэтныя вынікі, якіх дасягнулі ў СВК «Рачэнь»: агульны вал збожжа ў гаспадарцы — 11 100 тон, больш за 4 тысячы тон з якіх прададзена розным камбінатам, ураджайнасць збожжавых склала 45,3 цэнтнера з гектара (летась — 41,6). Намалацілі гэты вал, нягледзячы на тое, што і ў «Рачэні» нямала пацярпелі ад ужо добра вядомай сёлетняй палегласці збожжа. Дарэчы, тут жа зазначым: бальнасць зямлі ў гаспадарцы складае 36 адзінак. Гэта далёка не бліскучая бальнасць. Скажам, далёка не тая, як на Нясвіжчыне. Асобна варта адзначыць такі момант: на землях «Рачэні» атрымалі добрую пшаніцу так званых цвёрдых гатункаў. Што гэта за пшаніца? Менавіта з яе атрымліваюць муку, якая ідзе на выпечку белых батонаў і булак. У нашай краіне яшчэ не так даўно быў яўны дэфіцыт такой пшаніцы — даводзілася завозіць яе з Украіны, паўднёвых рэгіёнаў Расіі. А цяпер вось маем свае, айчынныя гатункі. Сёлета да Любанскага раёна давялі заданне атрымаць 1400 тон пшаніцы цвёрдых гатункаў — 670 тон гэтай пшаніцы паступіла з СВК «Рачэнь».

Увогуле, СВК «Рачэнь» мае мяса-малочны кірунак. Цяпер агульны статак буйной рагатай жывёлы ў СВК налічвае 3730 галоў, з іх 1190 асобінаў складаюць малочны статак. Аднак гэта менавіта на сёння, бо ўжо вельмі хутка (і пра гэта крыху ніжэй) той жа малочны статак павінен павялічыцца яшчэ на 600 галоў.

Працаўнікі «Рачэні» атрымліваюць ад сваіх кароў неблагое малако (у мінулым годзе надаілі ад кожнай з іх больш за 5 тысяч кілаграмаў), сёлета мяркуюць прыбавіць да гэтага сярэдняга ўдою не менш за 600 кілаграмаў. У СВК «Рачэнь» вырошчваюць таксама свіней — іх тут налічваецца больш за 2500.

Намечаная прыбаўка малака ў 600 кілаграмаў — гэта неблагая перспектыва, але, можна меркаваць, мінімальная для працаўнікоў «Рачэні». Яны яўна маюць на прыцэле і больш важкія вынікі... Непадалёк ад іх цэнтральнай сядзібы разгорнута маштабная новабудоўля, дакладней — яна ўжо падыходзіць да свайго лагічнага завяршэння: тут узводзіцца вялізны малочнатаварны комплекс з утрыманнем на ім 600 галоў. Вядома, гэта будзе зусім іншая, найсучаснейшая тэхналогія з зусім іншымі, прагрэсіўнымі прынцыпамі ўтрымання жывёлы, даення і г.д. Дастаткова сказаць, што ўсе каровы тут будуць мець свой спецыяльны «чып», які дакладна будзе ўлічваць, што карова ела, піла, колькі дала малака, як яна сябе ўвогуле адчувае. Усе звесткі будуць апрацоўвацца камп'ютарам і захоўвацца ў ім — з тым, каб спецыялісты заўсёды маглі мець пад рукамі неабходную інфармацыю. Зразумела, новая малочнатаварная ферма ўзводзіцца з разлікам на ўтрыманне ў ёй высокапрадукцыйных, элітных кароў. Гэты жывёлагадоўчы комплекс (такога, сучаснага кірунку) будзе адзіны ў раёне. Ён узводзіцца ў адпаведнасці з прэзідэнцкай праграмай развіцця жывёлагадоўлі, якая прадугледжвае будаўніцтва ў краіне 118 такіх комплексаў.

* * *

Зразумела, пад новы, значна больш маштабны статак неабходна нарыхтаваць і значна большую колькасць кармоў. Сёлета ў СВК «Рачэнь» пасеялі каля адной тысячы гектараў кукурузы (тут жа варта ўдакладніць: усёй зямлі ў «Рачэні» — 6050 гектараў, з іх ворнай — 4460). Безумоўна, гэта было ў пэўнай меры рызыкоўна — а раптам не выйдзе ростам кукуруза... Яна, аднак, не падвяла, месцамі вымахала да 4 метраў у вышыню.

— Вось гэта і будзе наш асноўны корм, — гаварыў кіраўнік гаспадаркі. — Чаго хаваць, гэта вельмі працаёмкая культура — яе трэба і адразу ж апрацаваць гербіцыдамі, каб усходы не былі падаўлены пустазеллем, і належную колькасць арганікі ўнесці, мінеральных угнаенняў (і азотных, і фосфарных, і калійных), але ж яна можа і добра парадаваць сэрца сельскага працаўніка, як радуе цяпер нас.

— А насенне адкуль? Відаць, з-за мяжы, французскае, нямецкае?

— Ды наша ж, з Мазырскай станцыі. Ніколькі не горшае, чым замежнае, якое мы куплялі раней у Францыі, Малдове. Ужо два гады, як адмовіліся ад імпартнага, і сеем толькі сваё.

У старшыні СВК «Рачэнь» Аркадзя РАГАЛЕВІЧА і старшыні Рачэньскага сельвыканкама Святланы ШВЕД шмат агульных пытанняў.

Трактарыст Ігар МІКУЛА, які апрацоўваў палеткі непадалёк ад салігорскіх «гор».

Уборка кукурузы, з якой у гаспадарцы і павінны атрымаць асноўную масу сіласу, якраз толькі пачыналася, але ў СВК ужо да гэтага паспелі закласці 11 тысяч тон сенажу, каля тысячы тон сена. Словам, калі зыходзіць з добра праверанай вяскоўцам высновы, што малако ў каровы знаходзіцца на языку, — вельмі добрага малака, намнога больш вялікага, чым цяпер, варта чакаць працаўнікам «Рачэні» ад свайго малочнага статку.

* * *

Яўна не пазбаўлены пачуцця прыгожага кіраўнік гаспадаркі. З якім задавальненнем паказваў ён вуліцы галоўнай вёскі гаспадаркі — Рачэні, пры гэтым падчас наведвання аб'ектаў кожны раз яўна спецыяльна выбіраў новы маршрут, каб мы пабачылі ўсе вуліцы... А яны тут былі ўсе... аднолькавыя — у шматлікіх кветніках, у розных драўляных скульптурках і іншых упрыгажэннях. «Вось бачыце, як нашы людзі любяць прыгожа жыць, — казаў Аркадзь Міхайлавіч, — а, між іншым, уся прыгажосць ад душы...».

І ўсё ж, здаецца, трохі хітрыў Аркадзь Міхайлавіч, бо сам жа, як мог (пра гэта сказалі нам у Рачэні, так бы мовіць, па сакрэце) прывіваў у людзей гэту цягу да прыгожага, любоў да роднага любанскага края, імкненне зрабіць сваю любую любанскую зямлю як мага прыгажэйшай. І сам актыўна ўдзельнічаў ва ўсім гэтым. «Вось тут у нас у вёсцы сажалка. У гэтым годзе абсадзілі яе ўсю, 100 дрэваў пасадзілі, думаю, на наступны год вельмі прыгожае месца тут будзе...», — казаў і паказваў ён па дарозе.

А разам з тым вырашыў ён звазіць нас да мясцовай знакамітасці (а як стала зразумела ніжэй, далёка не мясцовай) — кіраўніка фальклорнага гурта «Карані» Уладзіміра Ціханоўскага. Жыве Уладзімір Ціханоўскі тут жа, у Рачэні, а добрае слова пра яго крочыць па ўсёй рэспубліцы. Яго добра ведаюць нават у Беларускім універсітэце культуры, і не проста ведаюць, а рэгулярна запрашаюць на заняткі па сістэме майстар-клас. Ён — непасрэдны кіраўнік фальклорнага гурта, прычым чыста сямейнага (у ім, акрамя яго самога, таксама жонка, дзве дачкі і ўнук з унучкай, прычым унучцы — усяго трэці годзік). Як зразумела ўжо, гэты сямейны ансамбль спявае фальклорныя песні, ад захаплення якімі, паводле слоў самога Уладзіміра Ціханоўскага, ён літаральна сябе не помніць і ведае іх да 200, прычым абсалютна невядомых для шырокага слухача. Уладзімір Ціханоўскі таксама добра валодае адмысловымі народнымі промысламі, самы адметны з якіх, безумоўна, саломапляценне. Якія ў яго калекцыі былі прыгожыя саламяныя капелюшы і кепкі, гаварыў ён. Але, на жаль, цяпер ужо «толькі былі», бо вельмі ўжо ўмелі падысці да майстра яго шматлікія госці. А ў выніку той жа прыгожы капялюш аказваўся ў руках чарговага ўдзячнага госця. Назаўсёды. Ужо вельмі хутка ў Любані адбудуцца абласныя дажынкі, і рэчаньскі майстар варожыць цяпер над сваімі чарговымі саламянымі вырабамі. Як жа без іх на дажынках, якія пройдуць на яго роднай любанскай зямлі? Як, дарэчы, не абысціся на дажынках і без песняў яго фальклорнага ансамбля. «Вы лепей пра Міхайлавіча пішыце, — казаў, развітваючыся Уладзімір Ціханоўскі, — ведалі б, як ён падтрымлівае нас...».

* * *

Кантора СВК «Рачэнь» размясцілася ў адным будынку разам з мясцовым сельскім Саветам. Зразумела, гэта суседства добра дапамагае разам вырашаць пэўныя сацыяльныя пытанні. Безумоўна, найбольш адметнае з іх — развіццё асабістых гаспадарак сельскіх працаўнікоў. У сельскім Савеце складзена спецыяльная праграма па іх развіцці; як зазначала старшыня сельскага Савета Святлана Швед, дапамога па адпаведных пытаннях з боку кіраўнікоў гаспадарак, якія размешчаны на тэрыторыі Савета (а гэта, акрамя СВК «Рачэнь», таксама СВК «Обчын» і СВК «Атраднае») — проста неацэнная. А непасрэдна на практыцы гэта выліваецца ў дапамогу па апрацоўцы прысядзібных участкаў, нарыхтоўцы кармоў для свойскай жывёлы і г.д. А адсюль невыпадкова жыхары, якія жывуць на тэрыторыі Савета, з задавальненнем займаюцца сваімі соткамі (гэтых сотак у іх часам болей за гектар), трымаюць свойскую жывёлу (некаторыя нават па 3—4 каровы). Моцна сядзіць у працаўнікоў «Рачэні», у многіх іншых любанцаў добрая гаспадарчая жылка, што, дарэчы, нікольні не шкодзіць іх актыўнасці і ў грамадскай працы. Хутчэй, наадварот — садзейнічае.

* * *

На час нашага наведвання СВК «Рачэнь» тут займаліся звычайнымі для канца жніўня сялянскімі справамі: аралі (прычым, як падзяліліся ў «Рачэні», узворванне праводзілася толькі сучаснымі абаротнымі плугамі, што надавала полю найбольш ідэальны выгляд), рыхтаваліся да севу азімых (іх у «Рачэні» намечана пасеяць 1200 гектараў), рабілі агляд сваёй тэхнікі, якой належала ўбіраць кукурузу. Рабілі ўсё, як звычайна, грунтоўна, з належнай стараннасцю і акуратнасцю. Як ужо зрабілі гэта на поўнасцю прыведзеных у парадак да стойлавага асенне-зімовага перыяду фермах...

На адным са знакаў, якія паведамляюць пра ўезд на землі СВК «Рачэнь», змешчаны такія словы: «Добрая зямля, калі рук не шкадаваць». Выдатныя словы. І яны для працаўнікоў «Рачэні» служаць свайго кшталту наказам у іх добрых справах.

УНП 600020773.

Матэрыялы спецыяльнага выпуску з Любанскага раёна падрыхтаваў Іван БАРАНОЎСКІ. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Уладзімір ЦІХАНОЎСКІ паказвае на гэтых фотаздымках сваю сядзібу і аўтарскія вырабы з жытнёвай саломкі.

Такія прыгожыя будынкі растуць на новай вуліцы гаспадаркі. Да мясцовых славутасцяў у СВК «Рачэнь» адносяць і гэта штучнае возера, багатае на рыбу.

Глядзіце!

Водгалас Канаў у Мінску

Пяты сезон праекта «Канаманія» ў сталічным Доме кіно распачаўся іранічнай драмай рэжысёра Педра Альмадовара «Разамкнёныя абдымкі».

Сумесны праект унітарнага прадпрыемства «Кінавідэапракат» і радыёстанцыі «Мелодыі века», нагадаў куратар «Канаманіі» кінакрытык Ігар Сукманаў, традыцыйна знаёміць мінскую публіку з лепшымі фільмамі афіцыйных праграм Канскага фестывалю. Прычым гэта не заўжды карціны, угнанараваныя галоўнымі прызамі, але абавязкова — «брэндавыя» рэжысёры, выдатныя акцёрскія работы і стужкі, якія выклікалі найбольшы рэзананс у кіношным свеце.

У другі раз «Канаманія» распачынаецца карцінай Альмадовара. Папярэдняя работа рэжысёра, фільм «Вяртанне», паводле слоў супрацоўнікаў Дома кіно, стала адным з самых паспяховых фільмаў праекта, уваходзячы ў пяцёрку найбольш папулярных. Прэм'ерны паказ «Разамкнёных абдымкаў», мяркуючы па колькасці гасцей, мае ўсе шанцы паўтарыць гэты поспех.

Галоўны герой фільма — вядомы рэжысёр і сцэнарыст, які ў аўтамабільнай катастрофе страціў зрок і згубіў каханую жанчыну. Да трагедыі прывёў заблытаны ўшчэнт любоўны чатырохкутнік... Праз 14 гадоў сцэнарыст вяртаецца да гэтых падзей. Як адзначаюць крытыкі, гэта работа — адзін з галоўных хітоў 62-га Канскага фестывалю — «своеасаблівае прызнанне ў любові да кінематографа, да ўсіх яго жанраў і да людзей, якія стаяць па той бок экрана». Акрамя таго, гэта чацвёртая работа іспанскага кінакласіка, дзе знялася Пенелопа Крус, прычым у розных ролях і вобразах.

У пятым сезоне «Канаманіі», як мяркуецца, гледачы ўбачаць таксама фільмы—уладальнікі Гран-пры і Залатой пальмавай галіны 62-га фестывалю: «Прарок» Жака Адзійяра і «Белая стужка» Міхаэля Ханеке. У планах — паказ іспанскай стужкі «Гукавая карта Токіа», якая прыцягне ўвагу прыхільнікаў творчасці Харукі і Ру Мураками, і псіхалагічны трылер «Не азірайся» з Сафі Марсо і Монікай Бялучы.

А вось нашумелы фільм «Антыхрыст» Ларса фон Трыера, хутчэй за ўсё, у беларускія кінатэатры не трапіць увогуле. Ва ўсякім выпадку, да таго моманту, пакуль не будзе ўведзена яшчэ адно ўзроставае абмежаванне на прагляд кіно — да 21 года. Адпаведная прапанова накіравана ў Міністэрства культуры. «Цяпер мы не ўпэўненыя, што зможам атрымаць пракатнае пасведчанне на гэты фільм», — заўважыў першы намеснік генеральнага дырэктара сталічнага «Кінавідэапраката» Сяргей Дрожжынаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Слухайце!

Алесь Камоцкі: новы альбом

Пакуль шмат хто з нашых артыстаў спрачаецца наконт таго, ці існуе ў нас шоу-бізнэс, ёсць тыя, хто не вельмі думае пра сутнасць гэтага паняцця, але спакойна, паступова робіць сваю музычную справу — піша песні, выдае альбомы. І збірае залы. Ці то песні, якія напісаныя на яго словы іншымі аўтарамі, ці то калі ён сам спявае сваю музыку. У Алеся Камоцкага сапраўды ёсць свая публіка, якая з задавальненнем хадзіла на яго бардаўскія канцэрты, дзе гучалі песні пад гітару. Аднак кампазітар і выканаўца Камоцкі мяняўся — змянялася і гучанне яго музыкі, у ёй з'явіліся новыя інтанацыі. Да гітары дадаліся іншыя інструменты — баян, раяль, кларнет, саксафон, кантрабас. Потым усё складалася ў альбомы — таксама розныя. Новы, яшчэ «цёпленькі», мае назву «Дзевяць». Менавіта ён будзе прэзентаваны 9 верасня ў канцэртнай зале «Мінск».

— Насамрэч гэты альбом пачаўся з... мульціка, — кажа Алесь Камоцкі. — Гэта мульцік Наталлі Чатковай. Калі яна прапанавала разам зрабіць анімацыйны кліп, то я здзівіўся, але ідэя мне падалася вельмі цікавай. Для яго патрэбна была новая песня. І яна напісалася. Гэта лірычная песня «Шукай мяне», але аранжыроўка яе зроблена ў стылі боса-нова. Кліп атрымаўся цікавы. А мне захацелася паспрабаваць напісаць яшчэ колькі песень у падобным стылі. Атрымалася — я нават здзівіўся, бо гэта нешта незвычайнае для мяне. Самому спадабалася: сонечная боса-нова, як высветлілася, вельмі пасуе беларускім словам. Песні атрымаліся аптымістычныя па гучанні. Але не буду казаць, што ўсе песні напісаныя толькі на мае словы. Усяго на дыску іх дзевяць, адсюль і арыгінальная назва для альбома. Іншая рэч, што ёсць сюрпрыз, ці як кажуць, бонус — на дыску змешчаны кліп, з якога ўсё пачалося.

Аднак перш чым паглядзець кліп, варта схадзіць на канцэртную прэзентацыю, дзе ўласна дыск і будзе прапанаваны. Але сутнасць нават не ў тым, каб як мага хутчэй набыць гэты дыск, які ў музычных крамах павінен з'явіцца. Канцэрты Камоцкага — гэта заўсёды больш, чым песні, якія выконваюцца са сцэны.

Гэта больш чым выдатныя, заўсёды цёплыя, шчырыя і пранізлівыя словы, які трапляюць у сэрца: таму што ў такія моманты ты разумееш, наколькі прыгожа і пявуча гучыць беларуская мова. Гэта больш чым музыка, у стварэнні якой бяруць удзел выдатныя беларускія музыканты. Канцэрты Камоцкага — гэта найперш магчымасць стасункаў з тымі, хто хоча слухаць беларускія песні (а такіх людзей нямала). Гэта свайго роду спосаб рэлаксацыі ў пэўнай прасторы, дзе гукамі, словамі, думкамі ствараецца асаблівая атмасфера, і ты выходзіш з адчуваннем, што пабываў у нейкім ідэальным свеце, і вельмі хочаш потым сам імкнуцца стаць ідэальным, ці хоць бы проста чалавекам, у якім розум арганічна спалучаецца з рамантыкай і ўзнёсласцю, думкі і пачуцці вылучаюць выключна пазітыў. Канцэрт Камоцкага — гэта глыток паветра для тых, хто ў песні шукае не толькі забавы.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Рабіце!

Колькі каштуе падкласці джынсы?

Нагавіцы занадта доўгія? Не праблема! Былі б грошы...

Пры набыцці новых джынсаў мы ў першую чаргу звяртаем увагу на іх фасон і колер, глядзім, ці пасуюць яны нам. Лішняя даўжыня — гэта апошняя справа, яна нас не пужае. Усё адно любыя штаны заўсёды можна падкласці. Галоўнае, каб не былі занадта кароткія. Колькі каштуе паслуга падкладвання нагавіц і дзе ёю можна скарыстацца, высветліла карэспандэнтка «Звязды».

Варыянт 1 — Дамы быту

У большасці Дамоў быту прапануюць паслугу рамонту адзення. Патэлефанаваўшы ў некалькі з іх, я высветліла, што за падкладванне тут бяруць ад 7,5 да 15 тысяч рублёў. Тканіна, з якой зробленыя вашы нагавіцы, у гэтым выпадку значэння не мае. А вось за тэрміновасць давядзецца даплаціць каля 30 %.

Варыянт 2 — Прыватныя атэлье і майстэрні

Кошты гэтай паслугі тут крыху вышэйшыя — ад 11,2 да 20 тысяч рублёў. Даплату за тэрміновасць патрабуюць не ва ўсіх прыватных атэлье. Такім чынам, галоўны плюс — хуткасць. Затое ў вас могуць папрасіць дадатковыя грошы за складанасць працы. Напрыклад, калі тканіна прагумаваная альбо патрабуецца дэкаратыўная строчка.

Варыянт 3 — Швачкі дома

Жанчынам, якія самі шыюць нагавіцы, няцяжка змяніць іх даўжыню. За сваю працу яны просяць ад 5 да 10 тысяч рублёў. Акрамя гэтага, у іх заўсёды можна выпрасіць невялікую зніжку. А калі вы знаёмыя з ёй ужо трыццаць гадоў і ўвесь ваш гардэроб пашыла менавіта яна, дык можна і за шакаладку дамовіцца. Некаторыя швачкі робяць кошты рознымі для мужчынскіх і жаночых нагавіц. Адрозненні ў іх неістотныя і складаюць каля 2-3 тысяч.



Варыянт 4 — Зрабіць гэта самастойна

Перавага гэтага метаду — адсутнасць капіталаўкладанняў. Недахоп — давядзецца спадзявацца на ўласныя сілы. Вядома ж, калі вы спрактыкаваная швачка — гэты метад для вас. А калі вы ўпершыню трымаеце ў руках іголку і нажніцы, дык лепш сем разоў падумаць перад тым, як адзін раз адрэзаць.

Вікторыя БІРАН.

Генадзь ЦЫХУН:

«МОВА МЯНЯЕЦЦА, БО ЖЫВАЯ!»

Пісьменнікі цяпер ужываюць новыя — утвораныя самастойна або запазычаныя — словы замест даўно вядомых, напрыклад, «ківач» замест «маятніка», «гаўбец» замест «балкона».

Пісьменнікі цяпер ужываюць таксама старабеларускія словы ў сваіх тэкстах, напрыклад, «мынца» замест «манетны двор», «ляндаваць» замест «заснаваць».

Людзі пачалі ўжываць у маўленні і ў сваіх публікацыях невядомыя раней паланізмы супраць старых добрых русізмаў.

Людзі самі ствараюць невядомыя раней словы, замест таго, каб карыстацца выключна «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» (ТСБМ) у 5 тамах, 6 кнігах (1977—1984).

І ўсё гэта жахліва!

Такія вось прэтэнзіі можна часам пачуць з вуснаў якога-небудзь абуранага чытача беларускай літаратуры і прэсы. Якія працэсы адбываюцца ў апошнія гады ў нашай мове, ці заканамерныя яны, чым выкліканыя, наколькі арыгінальныя на фоне развіцця іншых славянскіх моў і да чаго могуць нас прывесці? Пра ўсё гэта, а таксама пра нядаўнія падзеі ў нашых усходніх суседзяў, якія скарэктавалі свае моўныя нормы, мы размаўляем з **доктарам філалагічных навук, прафесарам, галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы і літаратуры НАН Беларусі, намеснікам старшыні Міжнароднага камітэта славістаў, ганаровым членам Сафійскага ўніверсітэта імя Клімента Охрыдскага, акадэмікам Македонскай акадэміі навук Генадзем Апанасавічам ЦЫХУНОМ**.

— Генадзь Апанасавіч, чаму нашы літаратары сталі, з пункту погляду некаторых чытачоў, парушальнікамі лексічных нормаў літаратурнай мовы, чаму іх перастала задавальняць лексіка, зафіксаваная ў ТСБМ?

— Трэба разумець адрозненне літаратурнай мовы як мовы стандартнай ад мовы мастацкай літаратуры. Гэта адрозненне агульнапрынятае, і студэнтам чытаюць лекцыі на тэму «Літаратурная мова і мова мастацкай літаратуры». У мове аўтара могуць ужывацца не толькі агульнапрынятыя словы і не толькі тыя, якія ёсць у тлумачальным слоўніку — тлумачальны слоўнік беларускай мовы не ахоплівае ўсё лексічнае багацце мовы. Безумоўна, трэба імкнуцца да найбольш поўнага адлюстравання лексікі ў слоўніку, але калі ствараўся ТСБМ, аўтары арыентаваліся на слоўнік С.І. Ожагава і іншыя рускія нарматыўныя слоўнікі, таму шмат што засталося па-за межамі ТСБМ. Акрамя таго, тады ў аўтараў было крыху ўтрыраванае разуменне нормы: многія словы, якія ў жывой народнай мове ўжываюцца, пазначаныя як «абласное», «прастамоўнае», хоць у беларускай мове такое паняцце, як прастамоўнае, не павінна ўжывацца, яно з рускай традыцыі. Каб мы маглі казаць пра прастамоўе, яно павінна супрацьпастаўляцца «высокаму шчылю», а ў беларускай мове такога выразнага супрацьпастаўлення няма, у адрозненне ад рускай, якая грунтуецца на царкоўнаславянскай традыцыі. У рускай мове розніца паміж «штылямі» — ад самага пачатку фарміравання літаратурнай мовы, таму што руская літаратурная мова «выросла» на аснове царкоўнаславянскай, і там была патрэба сачыць за тым, каб у маўленні не змешвалася царкоўнаславянская стыхія і стыхія народная. А беларуская літаратурная мова ўзнікла на падставе народных гаворак, таму такога паняцця, як «прастамоўе» ў такім сэнсе не існуе.

— Тых, хто ўводзіць у карыстанне новыя словы, часам абвінавачваюць у тым, што гэта выклікана неапраўданай барацьбой супраць русізмаў. Ці так гэта і ці сапраўды гэта неапраўданыя з пункту погляду развіцця мовы працэсы? Ці адбываецца нешта падобнае ў іншых славянскіх мовах?

— Сапраўды, у пэўны перыяд была і зараз яшчэ прысутнічае спроба адштурхнуцца ад рускай мовы, што цалкам натуральна для любой мовы ў перыяд, калі назіраюцца асіміляцыйныя тэндэнцыі. Тады людзі свядома пазбягаюць якога-небудзь старажытнага слова толькі таму, што яно ёсць у той мове, якая пагражае. Скажам, у балгараў быў вельмі моцны пурыстычны рух супраць турцызмаў, супраць русізмаў — «неапраўдана ўжываных рускіх слоў», асабліва калі ў балгарскай мове для выражэння адпаведных паняццяў ёсць свае словы; цяпер там назіраецца пурыстычная тэндэнцыя ў дачыненні да заходнееўрапейскіх слоў. У беларускай мове такі працэс адбываецца таму, што ў свой час была адваротная тэндэнцыя да збліжэння беларускай і рускай моў, гэта была свядомая палітычная тэндэнцыя яшчэ сталінскіх часоў, калі праз збліжэнне ствараліся такія сітуацыі, што беларускія словы адрозніваліся ад рускіх толькі нейкімі фанетычнымі ці іншымі фармальнымі прыкметамі, а змест быў аднолькавым. А калі адзін змест мае дзве формы выражэння, неабходнасць у адной з гэтых формаў адпадае. Такім чынам адбываецца прыпадабненне адной мовы да другой, у выніку чаго неабходнасць у адной з іх адпадае, слабейшая моўная матэрыя становіцца збыткоўнай, не мае права на жыццё: навошта адно і тое ж выражаць двума спосабамі? Сутнасць у тым, што адно і тое ж паняцце ў розных мовах можа быць выражана па-рознаму: у адной мове для яго ёсць слова, якое цалкам выражае яго змест, у другой мове змест гэтага паняцця ўтрымліваецца па частках у двух розных словах.

Пурызм у кожнай мове існуе, асабліва ў перыяд, калі ёй пагражаюць асіміляцыйныя тэндэнцыі. Кожная мова праз гэта прайшла. Не заўсёды тое, што адбываецца ў гэты час, абумоўлена ўнутранымі патрэбамі і законамі мовы, але мова не існуе ў вакууме, яна пастаянна ўзаемадзейнічае з іншымі мовамі, і калі такое ўзаемадзеянне набывае характар пагрозы для яе існавання, яна ратуецца — носьбіты мовы пачынаюць адштурхоўвацца ад той мовы, якая пагражае, гэта цалкам натуральны працэс. Англійскі вучоны Роберт Оці на матэрыяле славацкай мовы вельмі выразна паказаў, што прынцып адштурхоўвання цалкам натуральны для кожнай маладзейшай літаратурнай мовы ў дачыненні да старэйшай або да той, якая перад тым была распаўсюджаная на гэтай тэрыторыі. Славацкая мова адштурхоўвалася ад чэшскай, зусім маладая літаратурная македонская — ад балгарскай, так што і для беларускай мовы гэта цалкам натуральны працэс. Лінгвісты адзначаюць, што для маладой літаратурнай мовы замацавацца на тэрыторыі, якая перад гэтым доўгі час знаходзілася ў арэале ўжывання іншай мовы, — вельмі складаная задача, і этап адштурхоўвання, трымання дыстанцыі паміж мовамі абсалютна неабходны, каб гэтыя мовы не змешвалі, каб у маладой літаратурнай мовы была магчымасць самаідэнтыфікавацца ў якасці самастойнай сістэмы. І гэтая адлегласць павінна існаваць увесь час, інакш пры збліжэнні адпадае неабходнасць у існаванні дзвюх аднолькавых моў, г.зн. адной сістэмы, якая выражаецца рознымі знакамі.

— Такім чынам, умовай стварэння і існавання літаратурнай мовы з'яўляецца наяўнасць асобнай сістэмы, абавязкова адрознай ад моўных сістэм нават вельмі блізкароднасных моў?

— Літаратурная мова не ствараецца на голым месцы, проста так народ не можа раптам узяць і стварыць яе. Яна ствараецца нацыянальнай элітай, першапачаткова выхаванай на іншай традыцыі. І калі эліта адчуе і ўсвядоміць неабходнасць стварэння сваёй нацыянальнай літаратурнай мовы, яна разумее, што гэта мова павінна быць адрознай, яна не можа быць абсалютна блізкай да нейкай іншай, асабліва да тых моў, з якімі яна будзе канкурыраваць, інакш у новай мове няма сэнсу. За кожнай мовай стаіць свая спецыфічная карціна свету. Рэальнасць мы апісваем словамі, кожнае слова адпавядае пэўнай часцінцы свету, і мы, умоўна кажучы, расчляняем рэальнасць на асобныя словы, прычым кожны народ робіць гэта па-свойму. Вядома, што ў якутаў дваццаць ці трыццаць назваў снегу — які падае, які ляжыць і г.д. Гэта іх бачанне свету. А для якога-небудзь іншага народа ўвогуле няма сэнсу адрозніваць снег, шэрань, іней — для іх усё гэта снег. Або папулярны прыклад з беларускім «свята» і рускім «праздник» для пазначэння адной і той жа з'явы: калі для беларусаў на першым месцы святасць дня, а для рускіх — «праздность», пустата. Усё гэта ілюстрацыі да таго, што кожны народ парознаму бачыць свет. Таму запазычанні — гэта непазбежна, гэта заўсёды ёсць, але яны пэўным чынам парушаюць тое, што філолагі называюць наіўнай карцінай свету (наіўнай, таму што гэта адлюстраванне ў мове народных «наіўных» уяўленняў пра тое, што адбываецца, напрыклад, мы кажам, што сонца заходзіць, хаця насамрэч яно нікуды не заходзіць, а Зямля робіць абарот вакол Сонца, так што слова «захад» навуковай рэальнасці не адпавядае). Кожная мова адлюстроўвае сваю карціну свету.

Таму за аснову літаратурнай мовы бяруцца гаворкі, найбольш аддаленыя ад той мовы, якая пагражае ці якая функцыянавала да гэтага. У нас гэта гаворкі Віленшчыны і Маладзечаншчыны — тэрыторыі, аддаленых і ад Расіі, і ад Польшчы. Украінская на той час моцна не пагражала, як і літоўская, таму яны не ўлічваліся. Гэтак жа і з македонскай: хаця аўтар праекта македонскай літаратурнай мовы Крсце Місіркаў паходзіў з-пад Салуні, у аснову літаратурнай мовы былі пакладзены не гэтыя гаворкі, а заходнемакедонскі дыялект — гаворкі тэрыторый, якія прымыкаюць з аднаго боку да Албаніі, з другога — да Грэцыі, але далёкія ад Сербіі і Балгарыі, з мовамі якіх павінна будзе канкурыраваць новая літаратурная мова. У славакаў тое ж самае. Іх першы варыянт літаратурнай мовы быў заснаваны на заходнеславацкіх гаворках, блізкіх да мараўскіх і чэшскіх. У выніку гэты варыянт быў адрынуты, а за аснову літаратурнай мовы былі ўзятыя прапанаваныя Людавітам Штурам сярэднеславацкія гаворкі. Так што гэта агульная тэндэнцыя, Беларусь не выключэнне.

— У сувязі з гэтым узнікае заканамернае пытанне: ці можа нам пагражаць польская мова?

— Безумоўна, усё залежыць ад сітуацыі, пагроза можа быць з любога боку. У свой час галоўнай пагрозай была паланізацыя. У наш час пагроза з боку рускай у дзясятку разоў большая, чым з боку польскай, таму ўжыванне польскіх слоў — гэта спроба аднавіць адлегласць паміж беларускай і рускай. Лепш за ўсё было б, як пісаў Якуб Колас, пашукаць па кішэнях памяці сваё, часта так і здараецца, узнікаюць словы, якія не супадаюць ні з польскімі, ні з рускімі — дзеля таго, каб гэтую адлегласць захаваць. А ўжыванне паланізмаў ідзе або ад няведання польскай (калі чалавек не разумее, што гэта польскае слова, на першы план для яго выходзіць тое, што яно адрознае ад рускага), або гэта свядомае ўжыванне з разуменнем таго, што ўжыць польскае для нас на гэтым этапе не так страшна, як рускае. Але само па сабе такое кіданне ў бакі расхістае лодку, у якой мы сядзім, таму для стабілізацыі мовы трэба, каб было сваё.

— Адкуль яго браць?

— Усё паступова ствараецца, такі запас у беларускай мове дастаткова вялікі і стабільны.

З іншага боку, нельга катэгарычна выступаць супраць запазычанняў, якія ёсць ва ўсіх мовах. Некаторыя прыходзяць у мову разам з новымі для народа рэаліямі. Напрыклад, прыйшоў да нас ровар з Польшчы, а разам з ім і італьянская назва гэтага прадмета, прынятая ў палякаў, а слова веласіпед прыйшло разам з прадметам з французскай у рускую, а мы ў рускіх назву запазычылі. Для новых паняццяў зусім нармальна, калі яны прыходзяць разам са словамі, такія словы нармальна прыжываюцца. Іншая рэч — так званыя запазычанні-пранікненні, гэта вынік кантактаў моў, калі адбываецца інтэнсіўнае ўзаемадзеянне моў і людзі ведаюць і чужое слова, і сваё — атрымліваецца перапляценне. Але тады адразу пачынае дзейнічаць так званае сістэмнае пераразмеркаванне: калі гэтыя два словы абазначаюць адно і тое ж паняцце, то людзі аднаму слову прыдаюць адно дадатковае адценне, другому — другое дадатковае адценне. Ужываецца і запазычанае, і сваё альбо запазычанае і з усходу, і з захаду, але паміж імі ёсць розніца, нейкае дадатковае адценне ў значэнні, узнікаюць сінонімы. Абсалютных сінонімаў у мове фактычна няма, бо ў іх няма сэнсу, напрыклад, «мовазнаўства» і «лінгвістыка» азначаюць адно і тое ж, але і тут мы назіраем пэўную дыферэнцыяцыю: калі хтосьці ўжыў «мовазнаўства», тут жа ўзнікае пытанне, чаму ён ужыў менавіта «мовазнаўства», а не «лінгвістыка» — значыць, у яго ёсць нейкія прыватныя меркаванні. Тое ж самае і для пісьменніка: калі ёсць сінонімы, ён за кожным словам бачыць пэўнае дадатковае адценне і згодна са сваім мастацкім чуццём ён выбірае тое, якое, на яго погляд, найбольш падыходзіць для гэтага выпадку. І разважанні пра тое, нашто адно, калі ёсць другое, не маюць ніякага сэнсу. Чым багацейшая сінаніміка ў мове, тым для пісьменніка лепш, таму што стыль пісьменніка залежыць ад таго, што ён выбірае: пры апісанні чагосьці адзін выбірае адно, другі — другое. Стыль — гэта асоба, у чалавека ментальнасць такая, ён імкнецца адлюстраваць сваё разуменне якраз праз выбар таго, што, на яго думку, найлепш перадае яго ўяўленне пра нейкую рэальнасць, нейкую падзею і г.д. Напрыклад, чаму нехта ўжыў гулец, калі ёсць ігрок? Значыць, пісьменнік мяркуе, што паміж гэтымі словамі ёсць пэўная дыферэнцыяцыя, скажам, ён можа думаць, што слова ігрок мае больш шырокае значэнне (картачны ігрок і г.д.), а гулец — больш вузкае, дакладнае значэнне, або пісьменнік адштурхоўваецца ад слова «ігрок» таму, што гэта русізм, а яму хочацца, каб гэта было натуральна для мовы, і г.д.

Гутарыла
Марына АБРАГІМОВІЧ.
(Працяг будзе.)

На скрыжаванні думак

«НАС БЫЛО ЎТРАЯ МЕНШ, АЛЕ МЫ ПЕРАМАГЛІ!»

СЁННЯ СПАЎНЯЕЦЦА 495 ГАДОЎ З ДНЯ СЛАЎНАЙ ПЕРАМОГІ БЕЛАРУСКІХ ВАЯРОЎ — БІТВЫ ПАД ОРШАЙ

— Як можна перамагчы ў тры разы большае войска?!

— Гэта можна патлумачыць некалькімі фактарамі, — тлумачыць прафесар Грыцкевіч. — Перш за ўсё я паставіў бы патрыятызм беларускіх войнаў, беларускіх рыцыраў, беларускіх баяраў, якія складалі пераважную большасць войска нашага ваяводы Канстанціна Астрожскага. Бо большасць войска складалі беларусы — з 30 тысяч ваяроў толькі 4000 складалі палякі. Астанія — «падцягваліся ў Бярэсці», некаторыя далучыліся ў Барысаве, дзе знаходзіўся сам вялікі князь Жыгімонт, дзе была ягоная стаўка.

Канстанцін Астрожскі — ваявода, які прынёс нам гэтую славутую перамогу.

АФІЦЫЙНА

Аршанская бітва 1514 года — адна з найбуйнейшых бітваў вайны Маскоўскай дзяржавы супраць ВКЛ 1512—22 гадоў. Адбылася 8 верасня 1514 года пад Оршай (Віцебская вобласць) паміж войскамі ВКЛ і Маскоўскай дзяржавы.

Энцыклапедыя гісторыі Беларусі, 1-ы том

— А ў чым выяўляўся патрыятызм, які дапамог перамагчы?

— Лепш за ўсё пра гэта напісаў гісторык Мацей Стрыйкоўскі. Ён прыводзіць словы выступленняў Канстанціна Астрожскага перад бітвай і ў час бітвы. Там Астрожскі заклікае рыцараў: «Успомніце вашых бацькоў, дзядоў! Змагайцеся за славу сваёй зброі…» А потым, калі быў ужо такі момант напружаны, ён нават звярнуўся да войска: «Сынкі, змагайцеся — я сам з шабляй іду наперад!..» Так нязвыкла! А ён жа быў стары, яму было 54 гады — а «сынкам» было па 20—25, можа, 30... Такая вось ідэйная падрыхтоўка. Акрамя таго, перад Аршанскай бітвай, як было прынята ў той час, ва ўсім войску Канстанціна Астрожскага былі праваслаўныя малебны. Невялікая частка ваяроў была каталікамі — і ксяндзы таксама маліліся... Далей, у перамозе трэба падкрэсліць вопыт беларускіх ваяроў, якія

Баявы шлем з забралам часоў Аршанскай бітвы.

да таго часу змагаліся і з татарамі, і з маскоўцамі, і з крыжакамі...

— Анатоль Пятровіч, ім жа было па 20 гадоў — які там можа быць вопыт?..

— Дык яны ж ад 15—16 гадоў пачыналі ваяваць!..

ГЭТА ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

Гадоў праз 10—15 адзін з удзельнікаў бітвы намаляваў першую батальную карціну ва Усходняй Еўропе, якая так і называецца — «Бітва пад Оршай». Зараз гэтая карціна знаходзіцца ў Нацыянальным музеі Варшавы. Адметнасць яе ў тым, што Канстанцін Астрожскі паказаны на ёй... некалькі разоў! Як удзельнічае ў бітве, як перапраўляецца цераз раку, як кіруе конніцай... На гэтай жа карціне можна пабачыць і герб Радзівілаў, і тагачасны беларускі сцяг — сведчанне прыналежнасці жаўнераў.

«Астрожскі ведаў маскоўскае войска, бо сам некалі там служыў»

— Якія бітвы папярэджвалі Аршанскай? Дзе нашыя войны маглі патрэніравацца?

— Былі дробныя сутычкі войскаў Астрожскага з маскоўцамі на рацэ Бобр, ля Смаленска... Але такіх вялікіх, як Аршанская, не было.

— Адкуль у Канстанціна Астрожскага ўзялося столькі майстэрства і вайсковай хітрасці?

— Па-першае, гэта безумоўны вайсковы талент. Жыгімонт не наважыўся б сам з такімі маленькімі сіламі весці войска ў бой, таму што ведаў маскоўскае войска — бо некаторы час, калі быў ваеннапалонным, нават служыў у гэтым войску. Іван III узяў яго ў палон, а Васіль III прызначыў яго камандуючым аховаю паўднёвай мяжы Расійскай дзяржавы ад татараў. Астрожскі служыў-служыў, а потым уцёк. І яго нават не схапілі, таму што заехаў у царкву памаліцца. Пакуль ён маліўся, пагоня праляцела міма. А яму падказалі, што тут была маскоўская пагоня — ён паехаў іншым шляхам і прыехаў дадому.

— Анатоль Пятровіч, мы маем унікальную сітуацыю: і сёння месца Аршанскай бітвы выглядае гэтак жа, як 495 гадоў таму. Ці можна на натуры аднавіць схему бітвы?

— Дняпро ў тым месцы выгінаецца і ўтварае такі паўвостраў, дзе з трох бакоў — вада. Астрожскі спецыяльна паставіў войска ў гэтую адтуліну. Яны ведалі — за імі Дняпро, вельмі круты бераг, адступаць і ўцякаць няма куды. Хоць уцякалі з поля бою тады вельмі рэдка — калі пагоня не заб'е, то пасля маёнтак адбяруць... У лясочку на ўскрайку Астрожскі паставіў сваю артылерыю, схаваўшы іх у кустоўі. Пяхота таксама была схаваная ў лесе. Тое, што праціўнік не пабачыў артылерыю, было прыкрыццём, каб заманіць маскоўскую конніцу і разграміць яе. Што і было зроблена. Калі маскоўскае войска рушыла на нашае, Астрожскі імітаваў адступленне, прычым амаль панічнае. Тыя ўзрадаваліся ды, парушыўшы сваё пастраенне, кінуліся даганяць «уцекачоў». У гэты момант «уцекачы» расступіліся, прапусціўшы праціўніка

Рыцарскі панцыр часоў Аршанскай бітвы.

Сёння, 8 верасня адзначаецца 495 гадоў з дня Аршанскай бітвы — найбольш слаўнай перамогі ў гісторыі беларускіх ваяроў. 30 тысяч ваяроў Вялікага Княства Літоўскага бліскуча перамаглі амаль ўтрая большае войска Маскоўскага княства — 80 тысяч жаўнераў!.. Гэтую бітву старанна замоўчвалі ў савецкі час — як жа так, адна «савецкая краіна» некалі ваявала з іншай!? Аднак у дасавецкі час расійскія гісторыкі (Салаўёў, Ключэўскі) не хавалі праўды пра Аршанскую бітву. Нават славуты Карамзін пісаў, што «ніколі нашыя войскі не цярпелі такога паражэння». У Расійскай ваеннай энцыклапедыі 1914 года Бітве пад Оршай прысвечаны вялікі артыкул. Між іншым, па гэтай энцыклапедыі вучыліся расійскія вайскоўцы ў акадэміі. І Аршанскую бітву ім прыводзілі як прыклад бліскучага ваяводніцкага майстэрства. Пасля распаду Савецкага Саюза беларускія гісторыкі сталі аднаўляць карціны нашага слаўнага мінулага, сталі вядомыя і дэталі Аршанскай бітвы. Упершыню ў 1992 годзе падрабязны артыкул пра Аршанскую бітву апублікаваў у часопісе «Спадчына» доктар гістарычных навук, прафесар Універсітэта культуры і мастацтваў Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ. Размову з Анатолем Пятровічам пачынаю са шчырага здзіўлення:

Такія гарматы дапамаглі нам перамагчы ў Бітве.

Ваявода Юры Радзівіл, адзін з удзельнікаў Бітвы.

— Анатоль Пятровіч, мы маем унікальную сітуацыю: і сёння месца Аршанскай бітвы выглядае гэтак жа, як 495 гадоў таму. Ці можна на натуры аднавіць схему бітвы?

— Дняпро ў тым месцы выгінаецца і ўтварае такі паўвостраў, дзе з трох бакоў — вада. Астрожскі спецыяльна паставіў войска ў гэтую адтуліну. Яны ведалі — за імі Дняпро, вельмі круты бераг, адступаць і ўцякаць няма куды. Хоць уцякалі з поля бою тады вельмі рэдка — калі пагоня не заб'е, то пасля маёнтак адбяруць... У лясочку на ўскрайку Астрожскі паставіў сваю артылерыю, схаваўшы іх у кустоўі. Пяхота таксама была схаваная ў лесе. Тое, што праціўнік не пабачыў артылерыю, было прыкрыццём, каб заманіць маскоўскую конніцу і разграміць яе. Што і было зроблена. Калі маскоўскае войска рушыла на нашае, Астрожскі імітаваў адступленне, прычым амаль панічнае. Тыя ўзрадаваліся ды, парушыўшы сваё пастраенне, кінуліся даганяць «уцекачоў». У гэты момант «уцекачы» расступіліся, прапусціўшы праціўніка замкнулі нашая артылерыя — і ў пярэдніх маскоўскіх коннікаў, і ў задніх. Заднія думаюць, што пярэдніх ужо няма, а пярэднія бачаць, што і задніх ужо б'юць!.. Гэта быў спецыяльны эфект, каб заблытаць праціўніка — і гэта выратавала беларускае войска. Яшчэ адзін фактар, які нам дапамог — гэта суперніцтва між маскоўскімі ваяводамі. Чаляднін і князь Булгакаў-Голіца — кожны з іх меў пароўну войска, і кожны хацеў разграміць праціўніка сам, каб выслужыцца перад Вялікім князем. Таму, калі наступалі на адно крыло, другое вяло бой нехаця, можна сказаць. А калі ўжо адбылася наша перамога, тады ўжо ўцякалі разам абодва крылы маскоўскага войска. Дарэчы, маскоўскае войска на гэтую бітву нават не ўзяло з сабой артылерыю — настолькі былі ўпэўненыя ў перамозе!..

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара, ілюстрацыі з кнігі «Краіна Беларусь».

ЮРЫ БОХАН: «Калі б не Аршанская бітва, не было б беларусаў»

Меркаванне вядучага навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі

У Інстытуце гісторыі НАН Беларусі вывучэнне бітвы пад Оршай таксама займае далёка не апошняе месца. Чаму падзея 8 верасня 1514 года выклікае такі шырокі рэзананс? Чаму Бітва замоўчвалася ў савецкі час? Пра гэта апавядае Юры БОХАН, доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

— Спадар Юры, чаму ў нядаўнім мінулым, Савецкім Саюзе, можна сказаць, забываліся на гэтую бітву?

— Бітва пад Оршай — гэта бітва, дзе варагавалі паміж сабой прадстаўнікі братніх рэспублік (калі казаць пра СССР), і даваць ацэнку гэтай бітве было вельмі складана. Бо калі выстаўляць і вывучаць гэтую бітву, дык абавязкова трэба было даваць пэўныя ацэначныя катэгорыі: хто напаў, хто перамог, чаму перамог, — і таму, напэўна, лічылі, што на гэтую бітву лепш увогуле не звяртаць увагі.

— Сёння мы ўжо маем пакаленне беларусаў, для якіх Расія — братняя, Саюзная дзяржава. Як патлумачыць ім, што пяць стагоддзяў таму мы ваявалі між сабой?

— Вядома, што Расійская Федэрацыя — адзін з нашых найбуйнейшых стратэгічных партнёраў. І ў сувязі з гэтым, напэўна, у адносінах з Расіяй мы будзем грунтаваць увагу на больш прыязных узаемаадносінах... Заўсёды палітыкі павінны ведаць, што акцэнтаванне пэўных момантаў будзе цягнуць за сабой не зусім пажаданыя рэчы. З іншага боку, вядома ж, такія моманты, як бітва пад Оршай, не павінны быць забытымі. Для нас жа гэтая падзея ўвогуле лёсавызначальная, бо, калі б не яна, калі б беларусы тады не перамаглі, дык ВКЛ увогуле знікла б з аблічча Еўропы. Калі гэтай краіны не стала, то спыніліся б працэсы фарміравання беларускай народнасці, а, значыць, не было б беларусаў. І тут мы павінны разумець: мы за існаванне беларускай нацыі альбо не?! І падаецца, усе такія моманты варта разглядаць з гэтага ж пункту гледжання!

— Я ведаю, што вы спецыялізуецеся на зброі. Ці былі якія, так бы мовіць, навінкі вайсковага ўзбраення ў нашай арміі?

— Ну, казаць пра тое, што ў той час выкарыстоўваліся нейкія навінкі, невядомыя дагэтуль, бадай, немагчыма. Але характэрна, што Вялікае Княства Літоўскае адчувала больш моцны заходнееўрапейскі ўплыў: там была і цяжкая кавалерыя, выкарыстоўвалася і конская браніроўка, гусарскія палкі. У маскоўскага войска, скажам так, усяго гэтага не было, бо яно мела больш традыцыйнага тыпу армію, што было больш характэрна для Усходу. Хоць, трэба сказаць, у Масквы была вельмі моцная артылерыя (дзякуючы чаму ёй і ўдалося ўзяць Смаленск). Але цікава, што тут таксама ёсць заслуга беларусаў: Міхал Глінскі, былы гетман Вялікага Княства Літоўскага, знакаміты пераможца пад Клецкам, прыклаў намаганні ў найманні чэшскіх артылерыстаў у расійскую армію...

Мікола ТАМАШЭВІЧ.

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Як мабілізоўвалі войска 500 гадоў таму?

*— У мірны час войска не было як такога, апроч гарнізонаў у крэпасцях ды памежнікаў, — кажа Анатоль Грыцкевіч. — Аснову войска складалі баяры Вялікага князя, якія па-за вайной сядзелі ў сваіх маёнтках. Плюс баяры, якія служылі сваім панам. Як толькі пачыналася вайна, абвяшчалася земская паспалітая служба. Быў павятовы харунжый, які даваў нейкі час сабрацца, сабраць людзей. І кожны баярын павінен быў па колькасці зямлі прыводзіць з сабой воінаў. Гэтых воінаў ён сам узбройваў, вучыў, забяспечваў канём. У вопісах войска ВКЛ я пабачыў «канстатацыю»: «замест каня прыехаў на клячы»! **(Смяецца.)** І ўсе баяры са сваіх маёнткаў павінны былі ісці на вайну. У мірны час іх рэгулярна перапісвалі, каб ведаць, хто дзе ёсць. І хадзіць на вайну было абавязкова. Таму ваявала не ўсё мужчынскае насельніцтва, а толькі тыя, хто ўмеў. Бо гэта цяпер даволі лёгка навучыць чалавека страляць. А тады хлопчыкаў вучылі ўжо з 10 гадоў — махаць мячом, браць восем пазіцый, насіць латы...*

Рэха публікацыі

КАБ НЕ АПЫНУЦЦА НА ЗАДВОРКАХ ГІСТОРЫІ

На артыкул «Пад крыламі Перамогі» («Звязда», 25.08.09 г.) адгукнуліся чытачы, а гэта значыць, што людзі неабыякавыя да нашай гісторыі. Так, Грунвальдская бітва адбылася вельмі даўно, але ці павінны мы з гэтай прычыны забываць яе?

— Гісторыю не выбіраюць і не абмяжоўваюць яе нейкім перыядам. І чаму мы павінны забыць, што пад Грунвальдам палягла палова войска Вялікага Княства. Робім выгляд, быццам бы гэтай слаўнай Перамогі ў нашай гісторыі не было, — сказаў **былы настаўнік з в. Сталовічы Баранавіцкага раёна Аркадзь Комар**.

У савецкі час да гісторыі быў класавы падыход. Тады нейкі яе перыяд прапускалі ці трактавалі на свой лад, і далёка не ўсё было праўдай. Для Беларусі не прымальны, я лічу, і чыста рэлігійны падыход...

Беларусь нельга звесці да нейкай адной канфесіі. Наша краіна, у гэтым плане, разнастайная і талерантная — няхай і надалей будзе такой. Усё, што працуе на Беларусь, на ўмацаванне яе дзяржаўнасці, мы павінны падтрымліваць. Расцягванне ж нашай незалежнасці па палітычных, рэлігійных і нацыянальных закутках непрымальнае ў прынцыпе. Пад Грунвальдам аб'ядналіся палякі, ліцвіны (беларусы), рускія, татары... і там не пыталіся, хто пад якім крыжам ці без яго.

Міхаіл Ліцкевіч з Ліды звярнуў увагу на наступны момант.

— Я доўгі час працаваў канструктарам і думаю, што асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на ўмацаванне крылаў. На такой вышыні моцныя парывы ветру могуць сарваць лёгкую канструкцыю. Мы бачым, як у час буры валяцца рэкламныя шчыты... А сама ідэя помніка прыцягвае ўвагу, здаецца, падобнага ў нас няма. І калі помнік, прысвечаны Перамозе пад Грунвальдам, ставіць, то трэба гэта зрабіць у Лідзе — каля замка.

Безумоўна, тэхнічныя праблемы ёсць, тым больш што крылы павінны быць імклівымі ды лёгкімі, але ж у нас ёсць і спецыялісты. А вось наконт таго, дзе ставіць, то тут прапаноў хапае.

Чытач з Косава Івацэвіцкага раёна быў першым, хто патэлефанаваў і прапанаваў усталяваць гэты помнік каля Слоніма, калі ехаць на Зэльву. На яго думку, для гэтага там цудоўнае месца, ды і Слонімская харугва прымала ўдзел у Грунвальдскай бітве.

— Калі ўжо ставіць такі манумент, то толькі ў Брэсце і для гэтага ёсць важкая падстава. Менавіта тут Ягайла і Вітаўт падпісалі пагадненне аб сумесным выступленні супраць *Тэўтонскага ордэна,* — выказаўся **брастаўчанін Віталь Коўш**, — *добра, што 600-годдзе Грунвальдскай бітвы ўспомніла «Звязда». Калі мы не хочам увайсці ў гісторыю з параднага, то застанемся на яе задворку.*

А вядомы нашым чытачам **дырэктар фонду «Любчанскі замак» Іван Пячынскі** («Звязда», 29.08.09 г.) прапанаваў, каб у наступным годзе ва ўсіх гарадах Беларусі былі ўсталяваны памятныя знакі, чые харугвы былі пад Грунвальдам.

— Хіба мы не маем памяці?! І калі мы не адзначым перамогу пад Грунвальдам, то, напэўна, так яно і ёсць. Не будзем забываць, што Навагрудак быў сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, і дзе стаяць манументу, як не там! — заявіў І. Пячынскі.

На мясцовым узроўні ўлада не будзе праяўляць ініцыятывы, бо не ведае, як на гэта паглядзяць у больш высокіх інстанцыях. Праўда, цікавасць ёсць. Адзін намеснік кіраўніка раёна паказаў на ўзвышша перад райцэнтрам: « Вось тут хораша глядзеўся б помнік, але дзе ўзяць грошы?!»

Не ў сродках праблема. Найперш неабходна, каб улада падтрымала ідэю, было вызначана месца для помніка і тады ўбачым, ці ёсць яшчэ ў нас «порах у парахаўніцах».

Вось у суседняй краіне адзначаюць 1000-годдзе Літвы. Ёсць чаму павучыцца і што пераняць. Перазахаванне астанкаў Радзівілаў вылілася ў нацыянальнае мерапрыемства.

Можа і мы заявім пра сябе, успомнім сваю гісторыю, продкаў... Перамога пад Грунвальдам, яе 600-годдзе даюць нам такую магчымасць.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Пасля пісьма

СМЯЕЦЦА ТОЙ, ХТО СМЯЕЦЦА АПОШНІМ

Нашы ўнукі жывуць у горадзе, але і ў нас у вёсцы бываюць часта, бо мне 70 гадоў, дзеду — 75, гаспадарка, трэба дапамагаць, — пісала ў рэдакцыю Аляксандра Астапаўна Кішкевіч са Жлобінскага раёна. І зусім не для таго, каб пахваліцца, падзяліцца радасцю... Наадварот.

Прыехалі хлопцы і ў чэрвені, — паведамляла жанчына, — вечарам пайшлі ў клуб і іх пабілі. Дасталася нават дзеду, які на хуліганаў стаў крычаць. Яго ўдарылі па твары, піхнулі ў грудзі, а ён перад гэтым перанёс інфаркт, і яму стала дрэнна... Аднаму з унукаў зламалі нос і разбілі брыво, парвалі адзенне...

Паведамляла Аляксандра Астапаўна і пра тое, што было далей: прыязджала, маўляў, міліцыя, пісаліся заявы, здымаліся пабоі, але гэта... абсалютна нічога не дало — з крыўдзіцеляў нават штрафу не ўзялі. Яны ходзяць і толькі пасмяюцца, бо калі сышло з рук адзін раз, значыць, можна распускаць іх і далей?

Ліст абуранай жанчыны рэдакцыя накіравала ў аддзел унутраных спраў Жлобінскага райвыканкама. Як паведаміў адтуль начальнік спецыяльнага аддзела папярэдняга расследавання спадар Дусаў, у дачыненні да грамадзян Плецяжова і Шаметава «па факце хуліганскіх дзеянняў... заведзена крымінальная справа па прыкметах саставу ч. 2 арт. 339 КК РБ (злоснае хуліганства)».

Будзем спадзявацца, што яе, заведзеную, давядуць да лагічнага завяршэння, што справядлівасць пераможа, і смяяцца будуць тыя, хто мае на гэта поўнае

«НАША МОВА ВЕЧНАЯ...»

Доктар філалагічных навук, лаўрэат Нацыянальнай прэміі «За духоўнае адраджэнне» Іван ЧАРОТА (у цэнтры) сярод замежных гасцей свята.


Новаасвечаны Свята-Праабражэнскі праваслаўны храм — сапраўднае ўпрыгажэнне старажытнага горада.

Доўгачаканы момант урачыстага адкрыцця помніка славутаму земляку Францішку БАГУШЭВІЧУ.

Дзелавыя партнёры «Звязды» — начальнік смаргонскага раённага вузла паштовай сувязі Таццяна МАЗАЛЕЎСКАЯ і яе намеснік Аліцыя ГЕДРОЙЦ.


Ганаровы госць свята — вядомы навуковец і пісьменнік, ураджэнец смаргонскай зямлі Арсень ЛІС.

Плошча перад райвыканкамам — галоўная пляцоўка свята.

Так што, калі нечым людзей зацікавіць (хай нават паветраным шарыкам), яны могуць загаварыць па-беларуску. Але ненадоўга. Адвыклі. (Дзвюм прыгожым дзяўчынкам гадоў 12—13 спрабавалі давесці, што трэба ведаць родную мову. І пачулі ў адказ: «А навошта яна?»).

Крыўдна, што не патлумачылі гэта ні бацькі-бабулі-дзядулі, ні настаўнікі. Не пашасціла ім...

На стэндзе «Звязды» сёлета зноў гучалі вершы. На гэты раз — сапраўдных паэтаў: усе ахвотныя маглі купіць кніжку, складзеную са звяздоўскай «Простае мовы», але ж яна (з аўтографам аўтара) прадавалася аж за... 100 тысяч рублёў! Праўда, прадугледжана была цэлая сістэма зніжак: па 10 тысяч рублёў за кожную праспяваную беларускую песню, кожны выкананы танец, прачытаны на памяць верш...

Трэба было бачыць твары патэнцыйных пакупнікоў!

— Я падумаю, — казалі адны і знікалі на паўгадзіны, гадзіну.

— А разам з дзецьмі можна? — пыталіся іншыя. І з'яўляліся — хто са «шпаргалкай», хто з вучнямі-калегамі. У выніку ля звяздоўскага стэнда пачынаўся маленькі канцэрт. Найбольш удалым ён атрымаўся ў землякоў слыннага Ніла Гілевіча — у каманды (з вучняў і настаўнікаў) Гайнаўскай школы, што на Лагойшчыне. Багушэвіч, Купала, сам Ніл Сымонавіч, Броўка, «Колькі ў небе зор», танец пад язык... Лёгка, дружна, хораша! Свае людзі, на сваёй зямлі — на сваім свяце. Тут не толькі зняць капялюш, тут аддаць яго мала!

Дарэчы, ён, капялюш, сапраўдны, саламяны, у нас быў. Быў макет хаткі, у якой выдавалася газета падчас Вялікай Айчыннай на востраве Зыслаў, была вайсковая плашч-палатка, хай драўляны, але ж аўтамат, пілотка, у якіх усе ахвотныя маглі сфатаграфавацца на памяць, была магчымасць зрабіць сабе татуіроўку «Звязда» (на тыдзень) і наплесці косак, чым не маглі не скарыстацца маленькія смаргонскія модніцы. А яшчэ мы, як заўсёды, везлі фірмавую страву — «карацелькі» (вушкі альбо рожкі) ад Валянціны Доўнар, вялізазны бохан чорнага смачнага хлеба, шмат сала (нехта з падпісчыкаў слушна заўважыў, што сала шмат не бывае), мёд, гарачую гарбатку...

Мы ўдзячныя ўсім, хто на іх завітаў (ці проста павітаўся), усім, хто выпісваў, выпісвае і будзе выпісваць нашу газету — будзе чытаць... А калі і размаўляць...

Непадалёк ад насамрэч адметнага помніка Багушэвічу стаяў невялічкі столік. На ім — збанок з кветкамі, старыя кнігі, побач — радкі класікаў пра мову карэннай нацыянальнасці — родную, матчыну... У тым ліку — і аптымістычныя: «Наша мова вечная, бо яна, як наш характар». Подпіс — Уладзімір Караткевіч. І «поле»... Для роздуму. Пра характар.

...Як заўсёды падчас падобных мерапрыемстваў, часу, лічы, не было, але ж мы паспелі прабегчы па «горадзе майстроў» — убачыць досыць цікавыя вырабы і адзначыць, што яно і там ужо шмат кітайскага...

Уразілі строі асобных удзельнікаў мастацкай самадзейнасці — наш лён, наша традыцыйная вышыўка — прыгажосць. А бачыш яе так рэдка. Уразіла рускамоўнасць.

На Аўцюкоўскі фестываль ці не ўсе ўдзельнікі праходзяць праз мытню, дзе правяраецца наяўнасць гумару. Мо і перад гэтым святам варта неяк даводзіць людзям, асабліва дзецям, куды яны ідуць, як называецца гэты дзень. І папрасіць паважаць яго. Раптам атрымаецца?

Валянціна ДОЎНАР,
Таццяна ПРУС,
Уладзімір ЗДАНОВІЧ,
Анатоль КЛЯШЧУК (фота),
Яўген ПЯСЕЦКІ (фота).

P.S. *Асобны дзякуй нашым падпісчыкам за смачныя пачастункі. І прабачэнні... Бо далёка не пра ўсіх змаглі расказаць на старонках газеты.*

ПАСЛЯ ВАЙНЫ РАЗГЛЯДАЎСЯ ВАРЫЯНТ ПЕРАНОСУ МІНСКА НА НОВАЕ МЕСЦА

Называліся і канкрэтныя адрасы: берагі Нёмана ці Бярэзіны. Гэты малавядомы факт абнародаваў у першай частцы ўспамінаў Васіль Шарапаў, які працаваў з 1944 года, у тым ліку з 1954-га па 1969-ы старшынёй Мінгарвыканкама.

У сваіх мемуарах Васіль Іванавіч піша і пра многія цікавыя падрабязнасці з жыцця сталіцы да і пасля Другой сусветнай вайны. Напрыклад, пра тое, што на электрастанцыю, будынак якой захаваўся на праспекце Незалежнасці каля цырка, у 1930-я гады торф з Камароўскіх балотаў прывозілі па вузкакалейнай чыгунцы, пракладзенай унутры трамвайных пуцей. Па галоўнай вуліцы сталіцы тады проста хадзілі паравозы.

Віктар КУШНАРОЎ,
«Мінск—Навіны».

Нарэшце адбыўся цуд — расцвіла папараць-кветка!

Фота Анатоля БУТЭВІЧА.

Андрэй ХАДАНОВІЧ

Не спалохацца й перакласці
нечы плач сваімі слязамі.
Перакласці чужое шчасце
вам на плечы — цягніце самі!

З галавы сваёй перакласці
на здаровую галаву,
кожны надпіс: «Заб'е — не ўлазьце!»
на: «Заходзьце, я тут жыву».

Не пасквапіцца й перакласці
ўсякі час і любы кірунак.
Усё, што дрэнна ляжала, — скрасці
і прынесці вам падарунак.

* * *

У верасні хапаюся за неба,
хапаюся за безліч іншых спраў,
збіраю на далоні крошкі хлеба —
ды застаецца, колькі б ні забраў.

Збіраю крошкі жоўтае лістоты,
што крышыцца на скошаны газон,
і дасылаю вам лістом з суботы
на пятніцу, бы нейкі Рабінзон,

сігналы карабельнай катастрофы,
з якое ратаваць, дальбог, не трэба...
У верасні хапаюся за строфы,
збіраю крошкі восеньскага неба.

* * *

Выбівацца з сілаў і графіку,
пасылаючы музе праклёны...
А за шыбай — жывая графіка:
ночны бэз
бачыць сны
пра клёны.

Прыгожай вераснёўскай парой «Звязда» віншуе сваю каляжанку ***Вікторыю ЦЕЛЯШУК*** *з маладою круглаю датай! Няхай яе жыццёвы шлях будзе шчодра засцелены пяшчотнымі пялёсткамі восеньскіх астраў, а зоркі з неба ляцяць густа, але павольна: каб паспець загадаць жаданні. І няхай усё абавязкова здзейсніцца! Цеплыні і пяшчоты ад любімых людзей, усмешак і ўдачы!*

«Звяздоўцы».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Тры гады на паштовым аддзяленні Давыд-Гарадка Столінскага раёна працуе Святлана МАМАЙКА. Прыемна, што ў нялёгкай сумцы гэтага спецыяліста сувязі заўсёды ёсць і газета «Звязда». Шасцігадовая дачка Вікторыя дапамагае Святлане Міхайлаўне ў яе паштовых вандроўках.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ СА «ЗВЯЗДОЙ»!

ІДЗЕ ПАДПІСКА НА IV КВАРТАЛ 2009 ГОДА

Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)

Індэкс		на 1 месяц	на 3 месяцы
63850	(індывідуальны)	10600	31800
63145	(індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны)	9990	29970
63858	(ведамасны)	17050	51150
63239	(ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя)	15550	46650

Кірмаш
штотыднёвы рэкламны выпуск № 18 (618)
адрэс рэкламы
287 17 79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Дом у Рудзенску (Асіповіцкі напрамак) з усімі выгодамі, маецца гараж, лазня, майстэрня, 11 сотак зямлі (40 км ад МКАД).
Тэл.: 8 029 313 36 93, +375 29 318 95 73.

❒ Зруб новы 5х5, у камплекце ўся кроквенная сістэма, цана па дамоўленасці.
Тэл. МТС 550 39 28.

❒ Кватэра 2-пакаёвая з усімі выгодамі ў г. Кобрыне.
Тэл. 8 029 824 98 24.

❒ Кватэра 1-пакаёвая з усімі выгодамі (21,6 кв. м) у Маладзечне, 20 тыс. у.а.
Тэл.: 8 01773 50 738, 8 029 755 48 96.

❒ Дом у в. Занарач, участак 25 сотак, побач возера.
Тэл. 8 01771 443 56.

❒ Бульбакапалка КТН-2 лідская навясная 2-радковая.
Тэл.: 8 01792 557 25, 8 029 610 268.

❒ Эл. пліта, новая, танна.
Тэл. у Клецку 556 78.

❒ Воз на гумавым ходзе, вупраж.
Тэл. 8 01771 443 56.

❒ Трактар ЮМЗ прапашны, ЮМЗ на з/ч экскаватар. Цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 01792 596 17, 673 91 38.

❒ «Сітраен-ксантыя» 1997 г.в., 1,8, 4,3 тыс. у.а., торг.
Тэл. 8 029 389 21 89.

❒ Гідраізаляцыйны наплавачны матэрыял (ніжні слой), 19 трубак па 75 тыс. руб.
Тэл. 8 017 227 28 12.

❒ Бульбакапалка польская Z-609, усё новае, выдатны стан, цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 029 939 34 81, 8 02157 327 31.

❒ Пчаліны павільён без вулляў, новы.
Тэл. маб. 973 96 89.

❒ Газ. пліта «Гефест» з эл. грылем, новая, 750 тыс. руб.
Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 11 55 699.

❒ Гараж са склепам у г. Мінску па вул. Някрасава, 10,5 тыс. у.а.
Тэл. 8 029 647 02 19.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:
220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ №_____ Выдадзены _____

Подпіс _____ Дата _____

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.30	19.43	13.13
Віцебск —	6.18	19.34	13.16
Магілёў —	6.20	19.33	13.13
Гомель —	6.19	19.28	13.09
Брэст —	6.46	19.58	13.12
Гродна —	6.48	19.57	13.09

Месяц
Поўня 4 верасня.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны
Пр. *Андрэя, Мікалая, Цімафея.*
К. *Браніславы.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА	+22..+24°C	КІЕЎ	+24..+26°C	РЫГА	+23..+25°C
ВІЛЬНЮС	+23..+25°C	МАСКВА	+21..+23°C	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+22°C

Дзве даты

8 верасня

Сёння ва ўсім свеце адзначаецца Міжнародны дзень салідарнасці журналістаў. Праводзіцца па ініцыятыве дэлегатаў IV кангрэса Міжнароднай арганізацыі журналістаў, які прайшоў у маі 1958 года ў Бухарэсце, у памяць пра чэшскага журналіста Юліуса Фучыка, пакаранага гітлераўцамі 8 верасня 1943 года.

Сёння адзначаецца таксама Міжнародны дзень граматнасці.

1864 год — 245 гадоў таму каралём Польшчы і вялікім князем ВКЛ абраны Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (апошні кароль Рэчы Паспалітай, кіраваў да 25 лістапада 1795 года).

1914 год — 95 гадоў таму штабс-капітан Пётр Несцераў упершыню ў гісторыі авіяцыі прымяніў паветраны таран у баі, цаной уласнага жыцця знішчыў самалёт праціўніка.

Цытата дня:

«Дзе справа сама за сябе гаворыць — навошта словы?».

Цыцэрон (106—43 да н.э.), старажытнарымскі палітычны дзеяч, прамоўца, пісьменнік.

Купальскі і жніўны вянкі

Вянок з лугавых кветак і траў стаў абавязковым атрыбутам галоўнага летняга святкавання — Купалля. Хлопцы і дзяўчаты выкарыстоўвалі вянкі, каб даведацца пра сваю будучыню.

● Таксама, як і на Тройцу, іх кідалі ў раку — патоне, прыстане да берага або паплыве далёка, у чужую старану; клалі на ноч пад падушку з надзеяй убачыць прарocкі сон; закідвалі на высокае дрэва — калі вянок зачэпіцца за яго галіны з першага разу, то вяселле будзе ў гэтым годзе.

● Людзі старэйшага пакалення захоўвалі купальскія вянкі на працягу ўсяго года як надзейны абярэг ад чараўніцтва: купальскія вянкі развешвалі па сценах хаты, у хляве, надзявалі на рогі карове і г.д.

● Для таго, каб купальскі вянок валодаў большай магічнай сілай, яго неабходна было сплесці на світанні, у поўнай маўклівасці, з няцотнай колькасці траў, дадаючы туды травы з моцным пахам і пякучыя расліны (напрыклад, палын, крапіву-жычку).

● У час заканчэння жніва плялі вянок з апошніх зжатых ці сабраных з поля каласоў пшаніцы, жыта, ячменю, аўса. У некаторых рэгіёнах Беларусі на працягу ўсяго жніва збіралі падвоеныя каласы — «спарышы» — сімвал дабрабыту і прыбытку, якія потым дадавалі ў гэты вянок. Вянок упрыгожвалі папяровымі стужкамі, гронкамі рабіны, каліны.

● Звычайна «жніўны» вянок плялі дзяўчаты, а потым урачыста апраналі яго на галаву лепшай жняі. У Беларусі такая дзяўчына, самая прыгожая і спрытная, звалася Багіня ці Талака. У некаторых рэгіёнах такім вянком каранавалі лепшага хлопца, які браў удзел у жніве. Жніўны вянок захоўвалі на працягу года ў «чырвоным» куце або вешалі на дзвярах.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся!

Народная прыкмета.
Калі ластаўкі лётаюць нізка, прывяжыце да іх плуг, хай аруць.

☺

Абход у псіхіятрычнай лячэбніцы.
У палаце з ціхім сумным пацыентам:
— Гэты небарака звар'яцеў, калі яго нявеста выйшла замуж за іншага.
Пазней, за іншымі дзвярыма, абабітымі жалезам:
— А гэта той, іншы...

☺

Калі Віталіку споўнілася 33, ён зразумеў, што ў яго жыцці час нешта памяняць. Памяняўшы 50 долараў, на нейкі час ён супакоіўся.

☺

Жонка — мужу:
— Я, мабыць, два торцікі вазьму.
— А тады я другую бутэльку гарэлкі!

☺

Лёгкі ўдар пугай эфектыўней за тры кілаграмы пернікаў.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І.БАРАНОЎСКІ, С.ГРЫБ, У.ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н.КАРПЕНКА, Л.ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С.РАСОЛЬКА, Л.РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год. Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 4883. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12